Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІСТАПАДА 2015 г. СУБОТА № 231 (28089) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Тапанімічная геаметрыя

СТАР. 6



Сакрэты вядучага «Што? Дзе? Калі?»

СТАР. 9



Жывейшы за ўсіх жывых

СТАР. 15

# КАЗАЧНЫЯ ВАНДРОЎКІ ПАД НОВЫ ГОД



Ціхай хадою да нас пачынае набліжацца любімае свята дзяцей і дарослых — Новы год. На вуліцах гарадоў ужо запальваюцца рознакаляровыя агеньчыкі, на вітрынах крам з'яўляюцца бліскучыя ледзяшы. Каб яшчэ больш наблізіць доўгачаканы час, варта зазірнуць у Нацыянальны гістарычны музей, дзе распачаў сваю працу «Музей ёлачных цацак».

СТАР. 3

Фота Надзеі БУЖАН.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Рыгор РАПОТА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы:**

*«Беларусь ужо абазначыла сябе ў якасці пляцоўкі для перамоў па пытаннях дыялогу Расіі, Украіны і Заходняй Еўропы. Гэта несумненны ўклад. Ён сведчыць аб тым, што Беларусь можа быць зручнай пляцоўкай для любога роду дыялогаў, накіраваных на стабілізацыю і ўмацаванне міру, у тым ліку для перамоў па сітуацыі, якая склалася на Блізкім Усходзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18153,00 | ▼ |
| Еўра | 19282,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 274,09 | ▼ |
| Укр. грыўня | 759,54 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

15231

■ Наша перамога

## Доўгачаканае «золата»

**Вадзім Стральцоў стаў чэмпіёнам свету па цяжкай атлетыцы**

**Наш суайчыннік паказаў лепшы вынік сярод спартсменаў у катэгорыі да 94 кг у дваябор'і. Вадзім пачаў выступленне ў рыўку з дзяжурных 175 кг, а ў другім практыкаванні зафіксаваў над галавой штангу вагой 230 кг, што дазволіла яму з сумай 405 кг стаць чэмпіёнам свету ўпершыню ў сваёй кар'еры. Другое і трэцяе месцы занялі спартсмены з Казахстана, за крок ад п'едэстала спыніўся яшчэ адзін беларус — Аляксандр Венскель (398 кг).**

СТАР. 3




Фота БЕЛТА.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ВЫ РОБІЦЕ ДОБРУЮ СПРАВУ»

**Уладзімір ДРАЖЫН, былы намеснік прэм'ер-міністра, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь (2001-2014 гады):**



— Са «Звяздой» я знаёмы яшчэ са школьных часоў, чытаў яе і ў студэнцкія гады, чытаю і зараз. Кожны дзень перад пачаткам заняткаў была традыцыя заходзіць па свежую прэсу, і ваша газета была заўсёды ў лідарах у студэнтаў. Вядома, «Звязда» сёння не такая, як была ў 60-я, але гэта і лагічна: свет мяняецца. Як раней, так і цяпер газета адрозніваецца тым, што жыццё краіны ў ёй падаецца збалансавана, таму «Звязда» карыстаецца папулярнасцю і ў гараджан, і ў сельскіх жыхароў. Матэрыялы заўсёды пішуцца так, каб сэнс даходзіў да кожнага чалавека, да яго сэрца. Акрамя таго, для мяне сёння, як для радавога аматара спорту, так і як для кіраўніка Асацыяцыі гольфа, вялікая радасць, што «Звязда» з'яўляецца праваднікам новых у нашай краіне відаў спорту ў народ.

Яшчэ адной адметнай рысай газеты, вядома, з'яўляецца мова. Калі ёсць дзяржава? Тады, калі ёсць народ, тэрыторыя і мова. Дык вось «Звязда» — галоўны сімвал нашай краіны: публікуючы матэрыялы на роднай мове, вы даказваеце ўсім, што беларусы маюць сваю аўтэнтычнасць у Еўропе і ў свеце.

Маё пажаданне «Звяздзе» сёння — захоўваць твар Беларусі. Вялікі дзякуй газеце, выдаўцам, сённяшняму пакаленню журналістаў за тое, што вы робіце добрую справу для нашых людзей і кажаце пра тое, што важна і датычыцца жыцця Беларусі.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# ЗА ЗНАЧНЫ АСАБІСТЫ ЎКЛАД

### Высокіх дзяржаўных узнагарод удастоены ваеннаслужачыя, будаўнікі і выкладчыкі Беларусі

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўдастоіў высокіх дзяржаўных узнагарод работнікаў розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, значны асабісты ўклад ва ўмацаванне аўтарытэту дзяржавы на міжнароднай арэне, развіццё будаўнічай галіны, лёгкай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, дасягненні ў навуковай і педагагічнай дзейнасці, сферы аховы здароўя, культуры і спорту. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Ордэнам «За службу Радзіме» II ступені ўзнагароджаны начальнік Ваеннай акадэміі Беларусі генерал-маёр Сяргей Бобрыкаў.

Сярод удастоеных ордэна «За службу Радзіме» III ступені камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл генерал-маёр Алег Двігалеў і намеснік камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл генерал-маёр Андрэй Некрашэвіч.

Старшы інструктар-метадыст сацыяльнай установы «Інвацэнтр» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў» Барыс Бачкоўскі і дырэктар будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Будаўнічае ўпраўленне №21 адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскпрамбуд» Павел Кіршын — сярод удастоеных ордэна Пашаны.

Ордэна Францыска Скарыны ўдастоены прафесар кафедры анестэзіялогіі і рэаніматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Іван Канус.

Шэраг ваеннаслужачых, супрацоўнікаў міліцыі, пагранічнай службы ўзнагароджаны медалямі «За адзнаку ў воінскай службе», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы».

Сярод адзначаных медалём «За працоўныя заслугі» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Ірландыі (па сумяшчальніцтве) Сяргей Алейнік.

Медалём Францыска Скарыны сярод іншых узнагароджаны загадчыка кафедры рускай і замежнай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Таццяна Аўтуховіч, дырэктар Інстытута меліярацыі Мікалай Вахонін.

Сярод удастоеных ганаровых званняў акцёр драматычнага тэатра і кіно Яўген Крыжаноўскі, яму прысвоена званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь», і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалай Пінігін, якому прысвоена званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Беларусі работнікам розных сфер дзейнасці.

# РАСКРЫЦЬ І ПАДТРЫМАЦЬ МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ

### Беларускі кніжны гандаль у сучасных умовах не страчвае ў тавараабароце

**Аб гэтым сказала міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ у час цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Сёння мы гаворым, што новыя тэхналогіі прыўнеслі дадатковыя магчымасці развіцця літаратуры і дадатковыя задачы для выдаўцоў быць у інтэрнэт-прасторы і разам з тым клапаціцца аб падтрымцы кнігі і чытання. Гэтым мы павінны заняцца разам», — сказала Лілія Ананіч.

На думку міністра, інтэрнэт выступае сродкам прапаганды літаратуры, яе папулярызацыі. Ён з'яўляецца магчымасцю для маладых людзей, якія жывуць у сучасным напружаным рытме, чытаць кнігу і гарманічна развіваць сваю асобу.

«Кніга прадаўжае служыць мостам дружбы і супрацоўніцтва. Безумоўна, самае галоўнае ў кнізе — гэта тыя думкі, ідэі і пасылы, якія даюць свайму часу літаратары. Конкурс маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы» — знакавая падзея ў інфармацыйнай прасторы, таму што гэты праект садзейнічае больш цеснаму літаратурнаму і духоўна-маральнаму яднанню беларускага і расійскага брацкіх народаў, а таксама іх культуры», — адзначыла Лілія Ананіч.

Яна падкрэсліла, што ў 2015 годзе тэма моладзі з'яўляецца адной з ключавых, паколькі гэты год аб'яўлены Годам моладзі.

«У нацыянальным кнігавыданні ёсць шэраг цікавых праектаў, прысвечаных творчасці маладых. Вельмі важна, каб мы знаходзілі новыя і новыя формы супрацоўніцтва, раскрывалі новую літаратуру і давалі магчымасць нясмелым парасткам пераварацца ў магутныя прыгожыя літаратурныя дрэвы, якія, сваімі каранямі паглыбляючыся ў нашы традыцыі і гісторыю, будуць жывіць будучыню як нацыянальнай, так і сусветнай літаратуры», — дадала Лілія Ананіч.

Галоўныя мэты конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы» — гэта прадастаўленне маладым аўтарам Беларусі і Расіі магчымасці першай публікацыі і папулярызацыя іх твораў сярод чытачоў, а таксама адкрыццё новых імён у літаратуры.

Конкурс для маладых літаратурных талентаў праводзіцца другі раз. Для ўдзелу ў ім свае работы прадставілі 18 маладых аўтараў з Беларусі і 84 — з Расіі. Экспертны савет вызначыў па 7 лепшых аўтараў ад кожнай краіны. Іх творы ўвайшлі ў літаратурны альманах, які будзе даступны чытачам абедзвюх краін.

Лаўрэатамі ад Беларусі сталі Андрэй Дзічэнка, Таццяна Захарчанка, Вячаслаў Котаў, Алена Папко, Вікторыя Сінюк, Аляксей Старухін і Кацярына Фядотава; ад Расіі — Юлія Багданава, Ірына Іваннікава, Яўген Капусцін, Ілья Луданаў, Марыя Пярвушына, Лізавета Ражкова і Георгій Фамін.

■ Знешняя палітыка

## ЗАХОЎВАЙЦЕ ПІЛЬНАСЦЬ!

**У сувязі з апошнімі падзеямі расійскім турыстам не прадаюцца туры ў Турцыю. Што да нашых грамадзян, то для іх дзейнічаюць рэкамендацыі, якія давала Міністэрства знешніх спраў у канцы ліпеня гэтага года.**

Па словах **Дзмітрыя МІРОНЧЫКА, начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС**, гэтыя рэкамендацыі «тычыліся ў першую чаргу тэматыкі наведвання раёнаў Турцыі, прылеглых да сірыйскай і іракскай мяжы».

— Таксама былі зроблены рэкамендацыі праяўляць асаблівую пільнасць у турыстычных зонах, — дадаў Дзмітрый Міронччык. — На дадзены момант гэтыя рэкамендацыі працягваюць дзейнічаць. У выпадку ўзнікнення новых, дадатковых фактараў мы абавязкова іх, па-першае, адсочым, а па-другое, праінфармуем пра іх.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Партнёры

## Ацаніць перспектывы

### Канферэнцыя на тэму развіцця ЕАЭС пройдзе ў Санкт-Пецярбургу

**Другая міжнародная канферэнцыя «Еўразійскі выклік» пройдзе 3-4 снежня ў Паўночнай сталіцы Расіі. Яе арганізатары — урад Санкт-Пецярбурга пры ўдзеле Паўночна-Заходняга інстытута кіравання Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі.**

Мерапрыемства абяцае стаць пляцоўкай для разгляду працэсаў еўразійскай інтэграцыі на высокім экспертным узроўні. Чакаецца, што ў канферэнцыі прымуць удзел: прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй Кабякоў, губернатар Санкт-Пецярбурга Георгій Палтаўчанка, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Рыгор Рапота, намеснік міністра прамысловасці і гандлю Расіі Віктар Еўтухоў, а таксама кіраўнікі рэгіянальных адміністрацый, прадстаўнікі дзелавой супольнасці, грамадскіх арганізацый і вышэйшых навучальных устаноў дзяржаў-удзельніц працэсу еўразійскай інтэграцыі.

Падчас працы канферэнцыі ўдзельнікі абмяркуюць перспектывы развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза, пытанні інфармацыйнай бяспекі ва ўмовах Еўразійскай інтэграцыі, падзеліцца вопытам фарміравання мерапрыемстваў па падтрымцы рэгіянальнай эканомікі, разгледзяць спосабы ўмацавання эканамічнай інтэграцыі суб'ектаў з рознымі ўзроўнямі эканамічнага развіцця, а таксама ацэняць перспектывы ўзаемадзеяння ў галіне працоўнай міграцыі і ў сферы маладзёжнай палітыкі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### ЗАДАЙЦЕ ПЫТАННЕ

**28 лістапада, у суботу, пройдзе «прамая лінія» з начальнікам Дэпартамента аховы МУС РБ генерал-маёрам міліцыі Сяргеем Мікалаевічам ХАМЕНКАМ.**

**Пытанні, якія тычацца паслуг дэпартамента, іх цэн, патрабаванняў да кандыдатаў на службу, перспектыў развіцця службы аховы, можна задаць з 9:00 да 12:00 па тэлефоне (8017) 218-55-30.**

■ Даслоўна

Пан Гі Мун:

# «У змены клімату няма пашпарта: выкіды ў адным месцы пагаршаюць становішча ў любым іншым»

**З 30 лістапада па 11 снежня 2015 года ў Парыжы пройдзе 21-я канферэнцыя, якая праводзіцца ў рамках Канвенцыі ААН па кліматычных зменах, прысвечаная праблемам навакольнага асяроддзя. Мерапрыемства стане адной з найбуйнейшых міжнародных падзей. Сама меней 147 кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў плануюць прыняць удзел у рабоце міжнароднага саміту. Чакаецца, што на канферэнцыі будзе прынята ўсеагульнае пагадненне, якое вызначыць шляхі пераходу да нізкавугляроднай эканомікі, здольнай супрацьстаяць кліматычным зменам. Чаго чакае ад канферэнцыі Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун? Аб гэтым, што называецца, з першых вуснаў.**



### ШТО Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

«Як кіраўнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый я паставіў змяненне клімату ў лік прыярытэтных пытанняў таму, што ніводная краіна не можа справіцца з гэтай праблемай самастойна. У змены клімату няма пашпарта: выкіды ў адным месцы пагаршаюць становішча ў любым іншым. Змяненне клімату пагражае жыццю людзей і багатае на наступствы для крыніц сродкаў да існавання ў любым пункце свету. Гэта пагроза экалагічнай стабільнасці і бяспецы цэлых краін», — лічыць Генеральны сакратар ААН.

На яго думку, працэс перамоў ідзе павольна і спалучаны з цяжкасцямі. «У адказ на заклік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 166 краін, на якія сукупна прыпадае больш за 90 працэнтаў выкідаў, прадставілі нацыянальныя планы дзеянняў у сувязі са зменай клімату з мэтавымі паказчыкамі. Калі яны будуць паспяхова выкананы, гэта дазволіць змяніць крывую выкідаў да канца стагоддзя і давесці прагназаванае глабальнае павышэнне тэмпературы прыкладна да 3°C», — заўважае Пан Гі Мун.

Па яго словах, гэта вялікае дасягненне, але недастатковае. Сёння задача ў тым, каб павышэнне агульнасусветнай тэмпературы не перасягнула 2°C. На думку Генеральнага сакратара ААН, Парыжская канферэнцыя па змяненні клімату — не канчатковая мэта. «Гэта адпраўны пункт, а не вынік нашых дзеянняў. Ён павінен задаць установку на скарачэнне аб'ёму выкідаў і павышэнне супраціўляльнасці да наступстваў змены клімату», — лічыць ён. Цяпер урадам трэба будзе заключыць у Парыжы змястоўнае і абавязковае для ўсіх пагадненне, у якім былі б вызначаны дакладныя правілы паводзін, нацэленыя на дасягненне глабальнай мэты.

**Нагадаем, што Беларусь таксама возьме ўдзел у кліматычнай канферэнцыі. Нашу дэлегацыю ўзначаліць міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Каўхута. Наша краіна плануе прадставіць свае магчымыя нацыянальна-вызначаныя ўклады ў гэтыя намаганні і прыняць на сябе абавязацельства забяспечыць да 2030 года скарачэнне выкідаў парніковых газаў не менш як на 28% ад узроўню выкідаў 1990 года.**

### ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

У сваім артыкуле Пан Гі Мун выказаў думку, што залогам поспеху Парыжскай канферэнцыі з'яўляюцца чатыры ключавыя элементы: паслядоўнасць, гнуткасць, салідарнасць і давер. Варта сфармуляваць доўгатэрміновую стратэгію з устаноўкай на захаванне ўзроўню павышэння тэмпературы ніжэй за два градусы і даць выразны сігнал рынкам пра тое, што пераарыентацыя сусветнай эканомікі на зніжэнне залежнасці ад вугляводарод непазбежная і карысная і ўжо ажыццяўляецца.

Пагадненне, якое будзе заключана, павінна ўлічваць змены ў сусветнай эканоміцы і забяспечваць баланс паміж вядучай роляй развітых краін і ростам уплыву краін, якія развіваюцца. Акрамя таго, неабходна, каб пагадненне сцвярджала прынцып салідарнасці, у тым ліку ў форме фінансавання і перадачы тэхналогій краінам, якія развіваюцца. «Развітыя краіны павінны выканаць свае абавязацельствы прадастаўляць штогод 100 мільярдаў долараў да 2020 года на мэты адаптацыі і змякчэння наступстваў», — падкрэсліў Пан Гі Мун.

Важна і тое, каб былі прадугледжаны дзейсныя меры рэагавання на ўсё больш разбуральныя кліматычныя з'явы. У пагадненні павінны быць замацаваны палажэнні аб ацэнцы і ўдасканаленні ўрадамі кожныя пяць гадоў нацыянальных планаў дзеянняў па барацьбе са зменамі клімату з улікам дасягненняў навукі.

«Арганізацыя Аб'яднаных Нацый цалкам гатовая аказваць краінам дапамогу ў ажыццяўленні падобнага пагаднення, — заўважыў Пан Гі Мун. — Калі ў Парыжы будзе прынята паўнавартаснае пагадненне па клімаце, гэта стане залогам паляпшэння жыцця цяперашніх і будучых пакаленняў людзей. Яно дазволіць нам пакончыць з беднасцю, ачысціць паветра і абараніць Сусветны акіян, палепшыць стан здароўя людзей, стварыць новыя працоўныя месцы і стымуляваць укараненне экалагічных тэхналогій. Яно паскорыць працэс дасягнення ўсіх мэтаў у галіне ўстойлівага развіцця».

**Наталля КАРОТКАЯ.** *nk@zviazda.by*

■ На слыху

# Ці стануць пад'езды прасторай,свабоднай ад рэкламы?

**За 6 месяцаў гэтага года беларускі рэкламны рынак прадэманстраваў па паказчыках даходнасці адмоўны рост. Прадпрыемствы выдаткавалі на рэкламу за паўгоддзе крыху больш за 1 трлн рублёў, што склала ў супастаўных цэнах толькі 86%. Гэта адбылося ўпершыню з 2009 года. «Характэрна, што «праселі» не толькі вонкавая рэклама і рэклама на тэлебачанні, але і рынак інтэрнэт-рэкламы, які ў апошнія гады развіваўся найбольш імкліва. Пра гэта паведаміла журналістам намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.**

Рэкламныя бюджэты вытворцаў айчынных прадуктаў харчавання скараціліся ў супастаўных цэнах на 9%, вытворцаў адзення — на 16%, рознічнага гандлю — на 17%, а вытворцаў скургалантарэйных вырабаў і абутку — удвая. Рэклама айчынных вытворцаў на тэлебачанні скарацілася на 65%.

— У такой сітуацыі прыняцце захадаў, якія абмяжоўваюць размяшчэнне рэкламы і пазбаўляюць магчымасці зарабіць, можа здацца не зусім своечасовым. Тым не менш Міністэрства гандлю будзе ўзмацняць кантроль за дакладнасцю рэкламы, — падкрэсліла Ірына Наркевіч. — У першую чаргу гэта тычыцца інфармацыі аб кошце і ўласцівасцях тавараў і паслуг.

У прыватнасці, яна згадала факты, калі падчас маштабных распродажаў гандаль, у тым ліку інтэрнэт-крамы, указваюць завышаны працэнт зніжкі. Пры гэтым намеснік міністра звярнула ўвагу на тое, што міністэрства мае намер дзейнічаць акуратна і падыходзіць да вырашэння пытанняў аб адказнасці ўзважана: «Стаўка будзе зроблена на павышэнне прававой адукаванасці зацікаўленых асоб. Цяпер самае галоўнае для бізнесу — стабільнасць, каб устаноўленыя «правілы гульні» былі празрыстыя і ўсім зразумелыя».

Ірына Наркевіч нагадала, што ў краіне даўно дзейнічае забарона на рэкламу рэцэптурных лекавых сродкаў. Але пасля таго, як быў уведзены жорсткі кантроль за рэцэптурным водпускам лекаў у аптэках, гэтыя прэпараты пачалі прапаноўваць набываць праз інтэрнэт.

«Таму Мінгандлю разам з Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам па падатках і зборах сталі адсочваць такія выпадкі і прыцягваць парушальнікаў да адказнасці. Але мы зразумелі, што адказнасць за гэтую рэкламу недастатковая, і ініцыявалі ўнясенне папраўкі аб павелічэнні штрафаў у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях», — распавяла Ірына Наркевіч.

Таксама Міністэрства гандлю выступае за абмежаванне рэкламы ў паштовых скрынях. Па словах Ірыны Наркевіч, у іх ведамства паступае досыць шмат скаргаў на назойлівую рэкламу і прапановы забараніць распаўсюджванне рэкламных улётак у жылых дамах. Людзі таксама выказваюць незадаволенасць з нагоды таго, што друкаваная прадукцыя часта проста раскідана ў пад'ездзе і такое смецце ніхто не прыбірае.

— Разам з тым гэтае пытанне неадназначнае, бо частка людзей згодная атрымліваць рэкламу. Напрыклад, іх цікавяць зніжкі ў найбліжэйшай краме. Чаму мы павінны пазбаўляць іх такой магчымасці? Пры ўвядзенні нейкай абмежавальнай нормы трэба ўлічваць усе меркаванні, — адзначыла намеснік міністра. — Зараз міністэрства сумесна з іншымі дзяржаўнымі органамі прапрацоўвае розныя варыянты.

А пакуль што незадаволеныя могуць звяртацца ў суд, каб разабрацца з кампаніяй, якая назойліва рэкламуе свае паслугі. Але ж ці гэта выйсце?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# КАЗАЧНЫЯ ВАНДРОЎКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па навагодняй казцы цяпер можна прагуляцца: экспазіцыя новай выставы выбудавана ў выглядзе чароўнага лабірынту. У ім паказана, як выраблялі ёлачныя цацкі, пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя і да нашых дзён. Тут здзяйсняюцца падарожжы не толькі ў часе, але і ў прасторы: прадстаўлены культуры розных народаў — цацкі з Еўропы, Азіі, Аўстраліі, Амерыкі і Афрыкі. Дарэчы, аналагаў некаторых з іх няма ні ў адным еўрапейскім музеі!

Яшчэ адна захапляльная вандроўка — у той свет, дзе выраблялі такія навагоднія цуды: на выставе можна паназіраць за працэсам вытворчасці шкляной ёлачнай цацкі.

Не застанецца па-за ўвагай і мастацтва вялікіх класікаў. Карціны Марка Шагала, Івана Шышкіна, Сальвадора Далі, Пабла Пікаса, Віктара Васняцова, Івана Айвазоўскага, Леанарда да Вінчы можна будзе ўбачыць... намаляванымі на шкляных шарах. Вартуюць цацкі шматлікія дзяды-маразы, якіх тут сабрана цэлая калекцыя! Побач з імі разгарнуўся мініяцюрны каляндны гарадок.

Сярод рарытэтных экспанатаў выставы — дакладная копія цацкі, падоранай Папу Рымскаму Яну Паўлу II, занесенай у Кнігу рэкордаў Гінеса; велізарны шкляны шар з Венскага балю і многае іншае.



Фота Надзеі БУЖАН.

Каб даўжэй захаваліся ўспаміны пра гэта незвычайнае падарожжа, варта скарыстацца «Поштай Дзеда Мароза», якая размешчана тут жа. З яе дапамогай можна адправіць віншавальную паштоўку сваім сябрам і блізкім.

Летась у «Музей ёлачных цацак» завітала надзвычайная колькасць гасцей — больш як 30 000 чалавек. Чакаецца, што і сёлета цікавасць не зменшыцца. Выстава будзе працаваць да 17 студзеня 2016 года, аднак распачаць сваю вандроўку ў казачны навагодні свет раім вам ужо як мага хутчэй.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

■ Здарэнні

## ЗАТРЫМАЛІ СА ЗБРОЯЙ І Ў БРОНЕКАМІЗЭЛЬЦЫ

**У Мінску на чыгуначным вакзале супрацоўнікі міліцыі затрымалі беларуса, які ўдзельнічаў ва ўзброеным канфлікце на ўсходзе Украіны.**

Як паведамілі ў Следчым камітэце, у затрыманага ўраджэнца Наваполацка выявілі зброю, выбуховыя рэчывы, два беларускія пашпарты, сапраўднасць якіх выявіць экспертыза, даведку «Правага сектара», паводле якой ён удзельнічаў у антытэрарыстычнай аперацыі на тэрыторыі Украіны.



Фота БЕЛТА.

Што цікава, падчас затрымання ён быў апрануты ў бронекамізэльку. У дачыненні мужчыны распачата крымінальная справа. Следства мае намер хадайнічаць перад пракурорам аб узяцці мужчыны пад варту.

**Якаў ЖУРБІН.**

## НАРОДЗІНЫ ПАД «ПРЫКРЫЦЦЁМ» АМАП

**У сталічнай вобласці байцы АМАПа дапамаглі аператыўна даставіць у радзільню цяжарную жанчыну. Днямі шчаслівую маці разам з сынам выпісалі.**

Калі ў жыхаркі пасёлка Праўдзінскі Пухавіцкага раёна, якая была на дзявятым месяцы цяжарнасці, пачаліся схваткі, сужэнец разам з маці жанчыны вырашылі самастойна тэрмінова весці яе на аўтамабілі ў радзільны дом Мінскай вобласці. Каля дзесяці гадзін раніцы на 14-м кіламетры трасы Мінск — Магілёў машыну, якая рухалася на высокай хуткасці, спынілі інспектары ДАІ. Высветліўшы, што ў салоне знаходзіцца парадзіха, яны адпусцілі кіроўцу. Аднак, як толькі сям'я сабралася прадоўжыць рух, падвёў аўтамабіль. На гэтым жа ўчастку дарогі разам з дзяржаўтаінспектарамі неслі службу і супрацоўнікі АМАПа. Не губляючы часу, яны вырашылі аператыўна даставіць жанчыну ў радзільню на службовым аўтамабілі. У сям'і там нарадзіўся хлопчык ростам 49 сантыметраў і вагой 2,8 кілаграмы. Немаўля назвалі Мішам.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ДОЎГАЧАКАНАЕ «ЗОЛАТА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адзначым, што «золата» Вадзіма Стральцова — першы медаль беларускіх штангістаў на цяперашнім чэмпіянаце свету, які з'яўляецца ліцэнзійным да Алімпійскіх гульняў 2016 года. Таксама нагадаем, што беларускія мужчыны не заваёўвалі «золата» на чэмпіянатах свету па цяжкай атлетыцы з 2007 года, калі пераможцамі станавіліся Андрэй Рыбакоў (да 85 кг) і Андрэй Арамнаў (да 105 кг).

У жаночых спаборніцтвах за медалі на сёлетнім чэмпіянаце ўжо змагаліся прадстаўніцы Беларусі ў вагавай катэгорыі да 69 кг. Але да п'едэстала яны не дабраліся. Бронзавая медалістка Алімпіяды-2012 Марына Шкерманкова ў суме дваябор'я паказала вынік 241 кг (108 + 33) і заняла толькі 9-е месца. Яна саступіла 15 кг свайму лонданскаму паказчыку.

Дзіна Сазанавец, якая на Гульнях-2012 у Лондане з сумай 256 кг была чацвёртай, адолела ў дваябор'і 244 кг і заняла на ЧС-2015 толькі 7-е месца.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы Вадзіма Стральцова з перамогай на чэмпіянаце свету ў Х'юстане, паведаміла прэс-служба беларускага лідара. «Малайчына! Самааддача, воля да перамогі, упэўненасць у сваіх сілах дазволілі табе заваяваць золата ў сапернiцтве з наймацнейшымі цяжкаатлетамі планеты», — падкрэсліў у сваім віншаванні кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім спартсменам і трэнерам нацыянальнай каманды ўдала завяршыць чэмпіянат свету з максімальнай колькасцю алімпійскіх квот.**

■ На старт!

# З НАДЗЕЯЙ — НАПЕРАД

## Заўтра пачынаецца новы біятлонны сезон

**Снежныя зборы і кантрольныя трэніроўкі ў нашых страляючых лыжнікаў — ужо мінулае. Па іх выніках і з прыцэлам на чэмпіянат свету 2016 года сфарміраваны мужчынская і жаночая зборныя, ужо ў нядзелю спартсмены ўступяць у барацьбу за ўзнагароды Кубка свету.**

Першы этап пройдзе ў шведскім Эстэрсундзе, ён пачнецца адзіночнымі змяшанымі і змяшанымі эстафетамі 29 лістапада, далей пройдуць індывідуальныя гонкі (2,3 снежня), спрынт (5 снежня) і гонкі праследавання (6 снежня).

Мужчынскую зборную ў Швецыі прадставяць Уладзімір Чапелін, Юрый Лядаў, Дзмітрый Дзюжаў і Раман Ялетнаў.

Першыя двое на чэмпіянаце свету мінулага года былі 4-мі ў складзе змяшанай эстафеты. Найлепшае месца **Юрыя Лядова** ў асабістых гонках Кубка свету — 11-е, на яго біятланіст падняўся па выніках спрынтарскай гонкі. Найвышэйшы вынік **Уладзіміра Чапеліна** ў мінулым годзе — 15-е месца ў праследаванні. **Дзмітрый Дзюжаў** у сезоне 2014/2015 дэбютаваў у Кубку свету, не дасягнуўшы высокіх вынікаў у першы для сябе сезон. А Раман Ялетнаў — чэмпіён Еўропы 2014 года — правёў толькі тры гонкі ў розыгрышы Кубка свету.



**Сёлета наша зборная выступіць у новай форме, якую на фота дэманструе Юрый ЛЯДАЎ.**

Ад жаночай зборнай чакаць па традыцыі будуць добрага выніку, бо за час, пакуль лідар зборнай Дар'я Домрачава ўзяла гадавую паўзу, трэба пастарацца не апусціць дасягнутыя пазіцыі.

Паколькі ў мінулым сезоне беларускія дзяўчаты фінішавалі на чацвёртым месцы ў Кубку нацый, наша краіна атрымала магчымасць павялічыць заявачную квоту ў новым біятлонным годзе з пяці да шасці чалавек. Перад трэнерамі з'явілася новая задача — у адсутнасць лідара прыдумаць, як і, галоўнае, кім укамплектаваць каманду.

Па выніках збораў і кантрольнай трэніроўкі, якая прайшла ў форме скарочанай індывідуальнай гонкі на 8,5 км з 4-а агнявымі рубяжамі настаўнікі назвалі шасцёрку, якая выступіць на першым этапе Кубка свету, у яе ўвайшлі: Надзея Скардзіна (яна, дарэчы, і выйграла кантрольную трэніроўку), Ірына Крыўко, Надзея Пісарава, Настасся Дубарэзава, Ганна Сола і Дар'я Юркевіч. Марыя Панфілава і Крысціна Ільчанка, якія сёлета перабраліся з Расіі ў Беларусь, пакуль будуць выступаць за нашу зборную на Кубку IBU.

Можна меркаваць, што роля лідара ў жаночай камандзе ў гэтым сезоне пяройдзе да **Надзеі Скардзіны**, бо менавіта яна ў цяперашнім складзе з'яўляецца самай тытулаванай спартсменкай (прызёр Алімпійскіх гульняў і гонак Кубка свету).

**Ірына Крыўко** нядрэнна праявіла сябе ў мінулым сезоне, стаўшы прызёрам у складзе эстафеты і фінішаваўшы ў дзясятцы найлепшых у індывідуальнай гонцы.

**Надзея Пісарава** ў мінулым спаборніцкім годзе паказала лепшы вынік у асабістых стартах — 7-е месца ў суперспрынце — і двойчы трапіла ў дваццатку наймацнейшых у свеце.

**Настасся Дубарэзава** — ужо вопытны баец беларускай каманды, выступае досыць стабільна, але не так паспяхова. Некалькі сезонаў запар яна заканчвае спаборніцтва Кубка свету ў раёне 50-га месца ў агульным заліку.

**Ганна Сола** — самая маладая з цяперашняга складу біятланістак, сёлета дэбютуе на Кубку свету. Ганна стала пераможцай юніёрскага планетарнага першынства. Да гэтага ўдзельнічала ў Кубку IBU.

**Дар'я Юркевіч** ужо дастаткова вопытная спартсменка, аднак выступаць на Кубку свету ёй даводзілася не часта, у актыве біятланісткі менш за 10 гонак прэстыжных спаборніцтваў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Спецыяльны рэпартаж

# Суразмоўнік на гадзіну

## У Сенненскім раёне пенсіянеры могуць заказаць сабе новую паслугу

**Такая паслуга з'явілася тут у кастрычніку. Ідэя прыйшла з гарадскога пасёлка Багушэўск ад супрацоўнікаў аддзялення дзённага знаходжання для пажылых грамадзян. «У будні ўнукі ў школе, дарослыя дзеці на працы — пенсіянеры дома адны сядзяць. Пачынаюць лісты пісаць ва ўсе ўстановы, бо няма чым заняцца. Трэба ім кампанію скласці, каб не адчувалі сябе пакінутымі», — тлумачаць работнікі аддзялення.**

**Як пажылым не даюць засумаваць на пенсіі? На адзін дзень карэспандэнты «Звязды» далучыліся да «суразмоўнікаў» і пагасцілі ў мясцовых старых.**

### Два спецыялісты на ўвесь раён

Будынак, дзе месціцца аддзяленне дзённага знаходжання для пажылых, некалі быў маёмасцю ЖКГ. Цяпер тут распачалі рамонт: зрабілі невялікую кухню, павесілі паліцы, якія ўжо запоўнены ручнымі вырабамі багушэўскіх бабуль.

— Але ж не ўсе могуць прыйсці да нас, — кажа **загадчыца аддзялення Галіна АВЕРЧАНКА.** — Адным здароўе не дазваляе, іншыя жывуць у аддаленых населеных пунктах. Вось мы і вырашылі самі да іх выязджаць. Думалі ахапіць толькі Багушэўск, але ў выніку працуем на ўвесь раён.

У аддзялення ёсць нават свой службовы транспарт — сінія «жыгулі». Машына — з ліку спісанай тэхнікі, дасталася ад абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў.

Пра старых, якім не хапае стасункаў, даведваюцца па-рознаму. Дзесьці самі грамадзяне ці іх суседзі патэлефануюць, дзесьці сацыяльныя работнікі падкажуць. Спецыялісты таксама звязваюцца з раённымі бальніцамі, сельсаветамі, вясковымі старэйшынамі, каб тыя падказалі, каму патрэбны «свабодныя вушы». Паслуга бясплатная.

— На ўсіх, вядома, нас не хопіць. У аддзяленні ўсяго два чалавекі: загадчыца і я, — далучаецца да размовы **Любоў ТРУБЕКА**. — Таму падключаем валанцёраў з ліку пажылых. Цікавімся, хто чым жыве, і зводзім людзей з падобнымі інтарэсамі. Хоць паслуга і называецца «суразмоўнік на гадзіну», але гэта не значыць, што наш візіт мусіць доўжыцца менавіта столькі. У кагосьці і на некалькі гадзін можам затрымацца, а іншым і 15 хвілін дастаткова: чалавек стамляецца гаварыць.

### «Усё ёсць... Здароўя няма»

Едзем да першай кліенткі. 88-гадовая Дар'я Ягораўна Казімірава жыве разам з дачкой. Дачка ўжо сама пенсіянерка, але пакуль працуе. Вось і сёння жанчына пакінула на стале абед для маці, укруціўшы ў світар, каб не астыў, і пабегла па справах. А Дар'я Ягораўна засталася дома: старая нядаўна перанесла інсульт, таму на вуліцу амаль не выходзіць.

Пенсіянерка, заўважыўшы нас, усхвалявалася, ажно сэрца прыхапіла: столькі гасцей у хаце! І, як сапраўдная гаспадыня, пачала нас частаваць.

— Вазьміце на стале грушы, цэлая куча там, — паказвае Ягораўна ў бок кухні. — Гэта ж не куплёнае, сваё.

Пенсіянерка пераехала ў Багушэўск з іншай вёскі. Сумуе па сваёй хаце, хоць і няма сіл яе даглядаць. «І цяпер хачу туды з'ездзіць, — дзеліцца старая. — А дачка кажа: «Мама, там усяго два чалавекі». А тут у мяне ўвогуле знаёмых няма».

Жанчына выхавала траіх дзяцей: дзвюх дачок і сына. Усім дала адукацыю: для пенсіянеркі, якая сама адвучыцца не змагла, гэта было вельмі важна.

— Цяпер аднаго народзяць і войкаюць: няма чым карміць. Як няма чым? Рукі ёсць, ногі ёсць. Ідзі зарабі! — абураецца Дар'я Ягораўна.

**Хоць паслуга і называецца «суразмоўнік на гадзіну», але гэта не значыць, што наш візіт мусіць доўжыцца менавіта столькі. У кагосьці і на некалькі гадзін можам затрымацца, а іншым і 15 хвілін дастаткова.**

Сама старая ў свой час, як яна кажа, была «дурная на працу». Колькі гадоў у калгасе прарабіла за «палачкі». Грошай не было, таму заробак збожжам выдавалі або бульбай. «А потым я ў іншы перавялася. Там сапраўдныя капейкі атрымлівала, ужо паліто змагла купіць», — узгадвае бабуля.

Ад радасці, што знайшла новых суразмоўнікаў, пенсіянерка выдала нам ледзь не ўсю сваю біяграфію. На цяперашняе жыццё Дар'я Ягораўна не скардзіцца. «Нам бы толькі пажыць, — уздыхае яна. — Усё ёсць... Здароўя няма».

### Крыжаванкі пад лупай

— А што вы не спяваеце? — сустракае нас ў парозе наступнай хаты Антаніна Глебаўна Галісянкова. — Давайце, пачынайце, а я буду падцягваць.

Даведаўшыся, што мы без музыкі, бабуля нават крыху засмуцілася. Супрацоўнікі аддзялення паабяцалі, што наступным разам абавязкова прыхопяць з сабой баян (тым больш музычны візіт паслуга таксама прадугледжвае).

Антаніна Глебаўна жыве замкнёна. З хаты выходзіць, толькі калі трэба ў краму. А пра жыццё суседзяў яна і седзячы на канапе даведацца можа.

— Мой агляд — тры акны! — смяецца пенсіянерка.

— А да сябровак не ходзіце?

— Сяброўкі ўжо ўсе на магілках. Цяпер во *(паказвае на тэлевізар)* — адна скрыня.

На століку ля тэлевізара — стос часопісаў з крыжаванкамі. І лупа. Старая кажа, што зяць не тыя часопісы прывёз, з дробным шрыфтам, вось і даводзіцца пад павелічальным шклом словы расчытваць. Работнікам аддзялення Антаніна Глебаўна прапанавала пагартаць фотаальбомы: раптам каго знаёмага на здымках убачаць?

— Вось унук мой з дзяўчынай. Прыгожая пара была б. Я яе ўжо за радню лічыла, а яны разбегліся... — перабірае фотаздымкі. — А гэта я і мае аднагодкі ў шосты клас ідзём. Глядзіце, якія пераросткі былі (падлеткі на здымку сапраўды хутчэй падобны да студэнтаў. — **Аўт.**)!



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**На далонях Дар'я Ягораўна трымае частку сваёй біяграфіі.**

Некалі пенсіянерка працавала ў тутэйшым лясгасе. Узгадвае, што ў тыя гады гаспадаркай можна было ганарыцца. Лясгас быў на першым месцы ў рэспубліцы. У адміністрацыйным будынку душы стаялі, аўтаматы з газіраванай вадой. І безадходная вытворчасць была наладжана. Непатрэбныя галінкі драбнілі ў муку і дабаўлялі ў камбікорм... А цяпер, перажывае старая, ніводнага спецыяліста не засталося. Крыўдуе, што лясгас не клапоціцца пра сваіх былых работнікаў. Калі хадзіла дровы прасіць — не далі. Толькі за свае грошы, сказалі, купляйце.

— Дзякуй, што прыехалі. Але ж навін ніякіх не прывезлі, — ужо развітваючыся, робіць нам заўвагу Антаніна Глебаўна. Запэўніваем, што ўлічым усе пажаданні.

### Замест Дома культуры — крама

Наш апошні прыпынак — суседняя вёска Цыпкі. Раней тут знаходзілася будаўнічая арганізацыя. Працы хапала, таму і людзей шмат было. А як прадпрыемства закрылася, усе паз'язджалі ў Оршу ці Віцебск.

— Вунь былы інтэрнат для работнікаў. А праз дарогу — завод закінуты, — паказвае тое, што засталося ад некалі прывабнага мястэчка, Любоў Емяльянаўна.

У Цыпках запланаваны калектыўны прыём. Валанцёры вязуць канцэрт мясцовым пенсіянерам. Праўда, праблема ўзнікла: дзе сабрацца? Дома культуры ў Цыпках няма. Адзінае памяшканне, прыдатнае для канцэрта, — вясковая крама. Гледачы ўжо падцягнуліся. Бабкі (дзядоў у такім узросце адзінкі) размясціліся ўздоўж прылаўкаў.

Пасля песень і баек, што прывёз клуб «Спявай, душа», людзі не разыходзяцца. Абступаюць работнікаў аддзялення і дзеляцца праблемамі. Больш за ўсё вяскоўцаў хвалюе закрыццё фельчарска-акушэрскага пункта, якое здарылася літаральна тыдзень таму.

— У ФАПе хлопец малады працаваў, на размеркаванне прыехаў. Некалькі месяцаў пабыў, і яго ў армію забралі. А ФАП закрылі. Што нам цяпер рабіць? — скардзяцца мясцічы.

Любоў Емяльянаўна ўсё запісвае: «Будзем разбірацца».

...Па дарозе ў аддзяленне Галіна Анатольеўна заўважае, што паслуга «суразмоўнік на гадзіну» дазваляе пенсіянерам не толькі выказацца пра тое, што іх хвалюе, але і атрымаць рэальную дапамогу. «Спрацоўваем, як служба хуткага рэагавання, — кажа яна. — Мы падказваем пажылым, куды звярнуцца са сваёй праблемай, як правільна аформіць неабходныя паперы, каб пытанне разглядзелі. Або самі спрабуем дастукацца да ўлады: нам дзесьці гэта лягчэй зрабіць, чым простаму чалавеку».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

*Сенненскі раён*



**Антаніна Глебаўна нават на пенсіі сочыць за дзейнасцю лясгаса, дзе некалі працавала.**

■

# МЕДЫЦЫНА ЕЎРАПЕЙСКАГА ЎЗРОЎНЮ

**Дзякуючы мэтанакіраванай грунтоўнай дзяржаўнай падтрымцы, айчынная медыцына выходзіць на еўрапейскі ўзровень.**

— У прыватнасці, у Віцебскай вобласці кардыялагічная служба за апошнія 5 гадоў дабілася бясспрэчнага поспеху ва ўдасканаленні аказання спецыялізаванай дапамогі. Многае зроблена і для дэмаграфічнай бяспекі. Магу параўнаць з краінамі Еўрапейскага саюза. Там у агульнай структуры смяротнасці ад хвароб сістэмы кровазвароту паміраюць каля 40%. А ў нашай вобласці — прыкладна 43% (інфармацыя на леташніх выніках і 9 месяцаў гэтага года. — **Аўт.**). І гэты паказчык традыцыйна самы нізкі ў Беларусі (сярэдні па краіне летась — 55,3%). У цэлым смяротнасць паніжаецца, — расказаў карэспандэнту «Звязды» **прафесар, загадчык кафедры тэрапіі факультэта павышэння кваліфікацыі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Уладзіслаў ПАДПАЛАЎ**.

Паводле слоў урача і навукоўцы, нараджальнасць сёння ў Беларусі вышэйшая за сярэднюю ў Еўропе. Смяротнасць немаўлят — адна з самых малых у свеце. Павялічваецца чаканая працяглаcць жыцця. Сёння яна ў сярэднім па краіне большая за 71 год...

Медыкі канстатуюць, што насельніцтва стала больш уважліва ставіцца да стану свайго здароўя. І гэта — вынік дзяржаўных праграм, якія прапагандуюць здаровы лад жыцця. Усё больш суграмадзян, якія добра сябе адчуваюць, хочуць «на ўсякі выпадак» праверыць стан здароўя. Некаторым не шкада на гэта грошай.

— Нядаўна мы ўкаранілі новую паслугу «Кардыяпакет». Яна ўключае ў сябе набор неабходных працэдур для комплекснага абследавання сэрца. Прапануецца паслуга беларускім і замежным грамадзянам... Можна аплаціць «Кардыяпакет №1» і «Кардыяпакет №2». Першы — мінімальны пералік неабходных даследаванняў. А другі звыш асноўнага пераліку прапануе: абследаванне сасудаў верхніх і ніжніхканечнасцяў, ультрагукавое даследаванне органаў брушной поласці, дадатковыя лабараторныя даследаванні. Склад паслугі, яе кошт могуць мяняцца ў залежнасці ад паказанняў і прызначэнняў медыка, а таксама па жаданні пацыента, — распавядае **выканаўца абавязкаў галоўнага ўрача Віцебскага абласнога кардыялагічнага дыспансера Алена КУЗНЯЦОВА**.

Мінімальны кошт вышэйзгаданых пакетаў для беларусаў каля 1 мільёна і больш за 1,6 мільёна рублёў. Для іншаземцаў — прыкладна ў 2 разы больш. У планах — больш грунтоўнае абследаванне з лячэннем на працягу 5 дзён. Ужо каля 20 чалавек скарысталіся прапановай. Дарэчы, у аднаго з іх выявілі інфаркт міякарду і пралячылі бясплатна. Прыкладна палова кліентаў — расіяне, якія спецыяльна прыехалі абследавацца...

Такім чынам павялічваецца ў цэлым у вобласці экспарт медыцынскіх паслуг. На заробленыя грошы можна прэміраваць медыкаў, часткова фінансаваць набыццё абсталявання. У выніку выйграюць і медыцынскія турысты, і беларуская медыцына.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
pukshanski@zviazda.by

# ВАША ЭСЭМЭСКА — І ХОСПІС ДАБУДУЕЦЦА!

**У кінатэатрах і тэатрах Мінска затрымліваюць паказы, каб звярнуцца да гледачоў з просьбай: падтрымаць дзіцячы хоспіс.**

У сталіцы завяршаецца дабрачынны флэшмоб «Засталося крыху». Буйныя кінатэатры, тэатры, музычныя і канцэртныя пляцоўкі затрымліваюць на хвіліну сеансы і спектаклі і просяць гледачоў адправіць SMS на дабрачынны нумар Velcom 2015 з мабільных тэлефонаў. Такім чынам прыцягваецца ўвага да праблемы Беларускага дзіцячага хоспіса, які намагаецца дабудаваць свой новы будынак, каб пазбегнуць «замарозкі».

Паводле слоў рэжысёра, сцэнарыста, пісьменніка і майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага Аляксандра Вергунова, на хвіліну затрымліваецца спектакль, застаецца зусім крыху да яго пачатку і зусім крыху застаецца да завяршэння будаўніцтва.

Акцыя «Засталося крыху» — частка дабрачыннай кампаніі #velcombegom, і яна працягвае эстафету мерапрыемстваў Velcom у падтрымку хоспіса. Не засталіся абыякавымі да праблемы многія спартсмены, у тым ліку футбольны клуб БАТЭ — на поле «Барысаў-Арэны» яны заклікалі балельшчыкаў адправіць SMS. Падключайцеся і вы — адпраўляйце SMS або званіце на нумар Velcom 2015.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
protas@zviazda.by

■ Кропка на карце

# МАТАЛЯНЕ КРЫЗІСАЎ НЕ БАЯЦЦА

## Чым жыве радзіма першага прэзідэнта Ізраіля і кулінарнага фестывалю



**Колькі разоў за сваю амаль 600-гадовую гісторыю Моталь перажываў войны, навалы, пажары, але вытрымліваў беды, адбудоўваўся зноў і сустракаў новыя часы. Сярэдзіна XVI стагоддзя была азначана каралеўскімі прывілеямі, а пачатак XXI — статусам аграгарадка. Яго вёска атрымала адной з першых у краіне. Цяпер Моталь выглядае сучасна, хоць крыху і захаваў асаблівасці былых архітэктуры, побыту. А што засталося ад старога мястэчка? Найперш дзелавая, прадпрымальніцкая жылка, карані якой прараслі ці то ад прыезджых еўрапейскіх рамеснікаў, ці то ад тутэйшых яўрэяў. Пра тое нікто не ведае дакладна.**

### АД КАРАЛЕЎСКІХ ПРЫВІЛЕЙ

Вольга Мацкевіч — тыповая прадстаўніца мотальскай інтэлігенцыі, любіць сваю вёску і ганарыцца ёю. Некалі была бібліятэкаркай, потым збірала па крупінках гісторыю і стварала музей народнай творчасці. Яна ведае мноства легендаў, звязаных з асаблівай міласцю, якую праявіла да палескага мястэчка каралева Бона. Паводле аднаго з паданняў, каралева праязджала тут і ўбачыла сялян, якія адрозніваліся ад іншых сваім знешнім выглядам. З ранку працоўнага дня яны былі чыста і прыгожа апрануты. Менавіта тут манаршая асоба ўзвяла адну са сваіх рэзідэнцый. Пазней яна прывезла з Італіі, Германіі майстроў-рамеснікаў, якія навучылі і местачковых. Адсюль і тыповыя мотальскія прозвішчы: Кульбеда, Шыкалай, Палто...

Моталь жа атрымаў асаблівыя прывілеі, падпарадкоўваўся непасрэдна вялікаму князю, а жыхары плацілі падатак у казну, ні паншчыны не адраблялі, ні прыгону не ведалі. У тыя часы ў мястэчку налічвалася сем вуліц, чатыры царквы і сто семдзесят восем сядзібных надзелаў. Усе вуліцы сыходзіліся на плошчу, на якой ладзіліся славутыя кірмашы. Так было аж да эпохі праўлення Кацярыны II, калі маталян запісалі дзяржаўнымі сялянамі.

### РАДЗІМА ХАІМА ВЕЙЦМАНА

Да сярэдзіны XIX стагоддзя палавіну насельніцтва Моталя складалі яўрэі. Надзвычай прадпрымальныя людзі, яны, несумненна, паспрыялі росквіту мястэчка. На тагачасныя восем тысяч насельніцтва тут працавала 96 невялічкіх крам. Гандлявалі самым разнастайным таварам. Як вядома, 141 год таму ў Моталі нарадзіўся першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман. Гэта чалавек, які стаяў каля вытокаў краіны, што з'явілася на карце свету ў 1948 годзе. Яго мотальскія бацька і дзед сплаўлялі лес у Польшчу ды іншыя краіны Еўропы. Драўніну пачыналі нарыхтоўваць у навакольных лясах у лістападзе, секлі і складвалі да вясны. А вясной вязалі ў плыты і сплаўлялі па рэках у Данцыг. На гэтых плытах часта праводзіў лета і Хаім.

Яго бацька быў чалавекам надзвычай пісьменным, славуты сын пазней назаве яго ў мемуарах «сапраўдным арыстакратам». Дарэчы, Эйзер Вейцман стаў адзіным з яўрэяў, каго выбралі старастам Моталя. Дом старасты стаяў недалёка ад сінагогі, а сінагога размяшчалася насупраць царквы. Так і жылі побач у згодзе яўрэі з беларусамі.

Пра знакамітага земляка шмат раскажуць і ў музеі народнай творчасці. Напрыклад, што ў 4 гады Хаім пайшоў у школу, а ў 12 гадоў зарабляў рэпетытарствам сабе на вучобу ў гімназіі. Хлопчык быў адным з дванаццаці дзяцей у сям'і. Таму і да працы прызвычаіўся змалку. А дзевяць дзяцей Эйзера Вейцмана атрымалі вышэйшую адукацыю, што па тым часе было з'явай асаблівай.

У Моталі на міхайлаўскія Дзяды дагэтуль асвячаюць камені, якія потым кладуць на магілу родзічаў. Адны лічаць, што гэтая славянская звычка вядзецца з паганскіх часоў, яе ў Моталі пераймалі таксама яўрэі. Другія кажуць, што маталяне далучыліся да яўрэйскай традыцыі шанаваць камяні.

### КАЖУХІ І ХУСТКІ

— Мотальскія кажухі насілі нават у Аргенціне, Бразіліі, Англіі, — працягвае мая суразмоўца. Потым у Турцыі навучыліся вырабляць скуры і наваднілі рынак. А раней, калі не было візавага рэжыму, да нас ехалі палякі, скуплялі кажухі і везлі па ўсім свеце. Тут амаль у кожнай хаце былі майстры па вырабе скуры. Дарэчы, авечак ніхто тут не гадаваў, аўчыну куплялі ў асноўным у Расіі. У Моталі сыравіну апрацоўвалі, шылі вырабы ды мелі добры прыбытак, але паступова попыт на кажухі паступова зменшыўся. І маталяне шукалі іншыя спосабы зарабіць.

Жанчыны сталі за ткацкія станкі, якія захоўваліся ў кожным доме, і пачалі ткаць хусткі. З сінтэтычных нітак атрымліваліся тонкія, мяккія, прыемныя на дотык хусцінкі, якія з ахвотай куплялі на прасторах амаль усяго былога Савецкага Саюза. І за тыя хусткавыя долары, не паверыце, многія дзецям кватэры ў вялікіх гарадах пакуплялі.

Тым часам падніміліся першыя мотальскія прадпрымальнікі-каўбаснікі. Асобныя маталяне бралі ў кааператыве каўбасы пад рэалізацыю і везлі ў Маскву прадаваць.

У Моталі расказваюць гісторыю пра жанчынгандлярак, якіх абакралі. Узялі яны прадукцыю ў кааператыве, паспяхова прадалі, а паколькі была нядзеля і банкі не працавалі, дАвяраліся вакзальнаму мяняле. Ён і падсунуў вяскоўкам «ляльку». Засталіся тры жанчыны фактычна ні з чым: прадукцыю ж бралі ў доўг. Прыйшлі яны са слязьмі да Сцяпана Шыкалая, не ведалі, што будзе далей. А ён сказаў, каб бралі яшчэ больш і везлі зноў, маўляў, паступова адпрацуеце і той доўг. Так і сталася. А свайго прадпрымальніка людзі сталі яшчэ больш паважаць.

Сёння ў аграгарадку паспяхова працуюць 53 індывідуальныя прадпрымальнікі і 26 прыватных унітарных прадпрыемстваў, прытым што колькасць насельніцтва вёскі складае прыкладна чатыры тысячы чалавек.

### ПА ЗВЫЧАЯХ БАБУЛЬ І МАТУЛЬ

Ды нават і без такіх прывілей вёска выглядае прывабна. І хоць, вядома, у кожным доме аграгарадка ёсць інтэрнэт, усё ж некаторыя звычаі бацькоў і дзядоў падтрымліваюцца. Многія гаспадыні маюць ткацкія станкі, ткуць абрусы, ручнікі, посцілкі.

Старшыня сельскага Савета Сяргей Піліповіч сказаў, што такіх гаспадынь, як у Моталі, няма нідзе. Пераканаўся ў тым нават на прыкладзе сваёй цешчы, якая пячэ такія булкі і пірагі, што пальчыкі абліжаш. І падкрэсліў яшчэ адзін важны момант: маці абавязкова вучаць гатаваць сваіх дачок, перадаюць ім навыкі сваіх матуль. У вёсцы 20-гадовая дзяўчына ўмее прыгатаваць любую з асноўных страў. Цяпер гэта, згадзіцеся, вялікая раскоша. А фармат «Мотальскіх прысмакаў», на думку Сяргея Міхалаевіча, трэба мяняць. Фэст нечым нагадвае нашы традыцыйныя дажынкі, што ў цэлым нядрэнна, але важна знайсці сваю разыначку, больш ўпор варта рабіць на мотальскую школу кухарства.

...У Моталі ганарацца сваёй малой радзімай. Можна меркаваць ну хоць бы па тым, што з ахвотай прыводзяць такую байку-паказку: «Якое Іванава? Тое, што каля Масквы?» «Не, тое, што каля Моталя!» А ў далёкай Сібіры ёсць вёска Караленка, якую заснавалі і пабудавалі выхадцы з Моталя. У 1905-м, а затым і ў 1913-м туды выехалі 94 сям'і з палескага мястэчка. Кажуць, што там да гэтай пары шануюць мотальскія традыцыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**, *yackevich@zviazda.by*, *Іванаўскі раён.*

**Фота з архіва сельскага Савета**

■ Толькі ў нас

# НЕЧАКАНЫ МАЛЮНАК ШАГАЛА

**Віцебская даследчыца творчасці Шагала расказала карэспандэнту «Звязды» пра малавядомы факт з жыцця майстра.**

— Менавіта з Германіі слава мастака Марка Шагала распаўсюдзілася па свеце. Ён спыняўся ў Берліне ў 1911, 1914 і ў 1922-1923 гадах. У 1913-м Херварт Вальд, уладальнік знакамітай берлінскай галерэі Der Sturm, выставіў упершыню ў Германіі работы Шагала. Праз год тут прайшла яго першая персанальная выстава.

Да прыходу Гітлера да ўлады ў прыватных калекцыях Германіі знаходзілася каля 200 работ Шагала. Потым ён быў абвешчаны «яўрэйска-бальшавіцкім» мастаком, а яго карціны — «дэгенератыўным мастацтвам», — кажа **старшы навуковы супрацоўнік Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва, магістр мастацтваў Марына КАРМАН.**

Вясной 1933 года ўрад Германіі пачынае ажыццяўляць жорсткія меры па «аздараўленні нямецкай культуры». З сакавіка спецыяльна арганізуюцца акруговыя выставы «дэгенератыўнага мастацтва»: у Мангейме («Бальшавізм у культуры»), Нюрнбергу («Камера жахаў у мастацтве»), Дрэздэне («Мастацтва на службе разлажэння») і іншых. Усяго да 1941 года адбылося 38 падобных выстаў па ўсёй краіне. На іх тройчы былі прадстаўлены і работы Марка Шагала.

— У верасні 1933 года была заснавана Палата па справах мастацтва (Kunstkammer) з Гебельсам у якасці прэзідэнта. Яе найвышэйшая задача — пакласці канец незалежнай творчай дзейнасці ў любых яе праявах. У тым жа годзе ў Базэлі з мэтай ганьбавання была адкрыта рэтраспектыўная выстава Марка Шагала, а ў Мангейме па загадзе Гебельса адбылося публічнае спальванне работ віцебскага мастака.

У 1935-м Гітлер выступіў на VI партыйным з'ездзе і адкрыта заявіў аб «прынцыповым адарванні» духу авангарду. Да канца 1936 года з краіны эмігрыравалі сотні прагрэсіўных літаратараў, архітэктараў, рэжысёраў, мастакоў і музыкантаў. Сярод іх — самыя знакамітыя: Томас і Генрых Маны, Марлен Дзітрых, Георг Грос і іншыя. Марк Шагал у 1937 годзе стаў грамадзянінам Францыі.

У чэрвені 1937-га Гебельс выдаў дэкрэт аб стварэнні камісіі, якая павінна была канфіскаваць экспанаты «дэгенератыўнага мастацтва» з музеяў Германіі. Быў падпісаны і ўказ аб арганізацыі выставы. Як напісаў адзін з членаў камісіі па адборы, асноўная мэта выставы — выпрацоўка ў немцаў «здаровага інстынкту супраць бацылы мастацтва вар'яцтва і заняпаду, прышчэпленай яўрэямі».

— Члены камісіі ўмудрыліся ўсяго за два тыдні наведаць каля 30 гарадоў і адабраць у 32 музеях 700 «дэгенератыўных» твораў. А ўсяго канфіскавалі больш за 5,2 тысячы работ... У тым ліку з нямецкіх музеяў 59 работ Марка Шагала. Творы канфіскоўвалі ў спешцы, ды і стаўленне да іх было, найперш, як да аб'ектаў, якія будуць выстаўлены на ўсеагульнае абсмейванне, каталогі і запісы вяліся не заўсёды. Менавіта таму дагэтуль не высветлена месцазнаходжанне многіх з іх, — адзначае даследчыца.



**На аўкцыёне прадаецца карціна М. Шагала «Панюшка тытуню». Чэрвень 1939 года.**

Выстава «дэгенератыўнага мастацтва», якая адкрылася ў ліпені 1937 года ў Мюнхене, выклікала неверагодны ажыятаж. За дзень яе наведвалі да 20 тысяч чалавек. Між іншым, уваход быў вольны. Менш чым за чатыры месяцы выставу пабачылі больш за 2 мільёны чалавек. І гэта ўтрая больш, чым колькасць наведвальнікаў выставы любімых аўтараў нацысцкага кіраўніцтва, якая працавала недалёка... Карціны былі развешаны хаатычна і крыва, назвы работ напісаны часам мелам літаральна на палатне, па сценах — выпрыжкі з тэкстаў мадэрністаў, а побач — строгія плакаты з цытатамі фюрара.

— Пазней гэтую экспазіцыю адправілі ў Берлін. Там да работ мастакоў далучылі калекцыю карцін псіхічна хворых людзей, размясціўшы іх упераменшку. Усяго 6 са 112 аўтараў былі яўрэямі, аднак «яўрэйская тэма» падавалася публіцы асабліва. Карціна «Рабін» («Панюшка тытуню») Шагала стала своеасаблівым сімвалам гэтай выставы, — працягвае Марына Карман. — Цікава, што перад пачаткам Другой сусветнай вайны, калі фашысцкай Германіі спатрэбіліся грошы на пераўзбраенне арміі, творы прадстаўнікоў «дэгенератыўнага мастацтва» прадавалі на аўкцыёнах у Швейцарыі.

Пасля вайны стаўленне да Шагала ў Германіі кардынальна змянілася. Але ён не мог дараваць немцам іх злачынствы.

«Я думаю, што грахі нашых ворагаў нельга загладзіць, складаючы з імі пагадненні і дапамагаючы ім адноўляць гаспадарку, а можна толькі абмыць у моры іх уласных слёз. Ад імя расстраляных і жывцом спаленых мы гаворым ворагу, што ніколі не забудземся пра яго і ніколі яму не даруем — ні ў жыцці, ні ў мастацтве», — сказаў ён у 1947 годзе.

Мастак доўгія гады не хацеў мець нічога агульнага з Германіяй. Аднак урэшце даў згоду браць удзел у акцыях прымірэння. Нават выконваў буйныя дзяржаўныя заказы.

У 1959 годзе завяршыў работу для фае тэатра оперы ў Франкфурце-на-Майне. А ў 1978-м стварыў цыкл вітражоў у храме Святога Стэфана ў Майнцы. Гэта не толькі апошнія, але і самыя буйныя вітражы Шагала. Святару, каб атрымаць згоду віцебскага мастака, спатрэбілася амаль чатыры гады. Сваё імкненне працаваць менавіта з Шагалам ён тлумачыў жаданнем сцерці межы паміж рэлігіямі і нацыянальнасцямі.

Асабіста мяне ўразіў наступны факт. У навінах французскага тэлевізійнага канала быў паказаны цікавы сюжэт. Амерыканскі ваенны журналіст, трапіўшы ў кабінет Гітлера, у якасці трафея ўзяў... падпісаны фюрарам бланк.

— Гэта быў чысты аркуш паперы фармату А3 з фашысцкімі гербамі. Карэспандэнт быў знаёмы з Шагалам. Мастак папрасіў у яго гэтую паперу. На ёй ён намаляваў рабіна, які плача над скрываўленай торай, і вёскі, якія гараць... А збоку — сябе за мальбертам... Здзіўляе чалавечая сіла Майстра, які, можна сказаць, такім чынам «адпомсціў» злу, — кажа Марына Карман.

Той насамрэч унікальны твор знаходзіцца ў прыватнай калекцыі ў Францыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# ТАПАНІМІЧНАЯ ВУЛІЦ

**Назвы вуліц — тое, з чым мы сутыкаемся кожны дзень, ідучы па справах і шукаючы патрэбныя адрасы ці вяртаючыся дадому ў знаёмы раён. Тапанімія мае найперш практычнае значэнне, яе галоўная задача — дапамагчы зарыентавацца на мясцовасці. Аднак, заўважаем мы гэта ці не, свядомасць успрымае і тое, што абазначаюць назвы: яны нябачнай ніткай звязваюць нас з гістарычнымі эпохамі, выбітнымі асобамі або, наадварот, пазбаўлены глыбінных сэнсаў (напрыклад вуліца Прыгожая, Вясёлая) ці ўвогуле адсылаюць нас да людзей, што не дбалі пра дабрабыт Беларусі...**

**У нацыянальнай тапаніміі ёсць як свае праблемы, так і дасягненні. Пагутарыць пра тое, што адбываецца ў сферы сучасных гарадскіх назваў, у Выдавецкім доме «Звязда» за «круглым сталом» сабраліся старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Ігар КАПЫЛОЎ, даследчык урбаністыкі і тапанімікі Мінска, член тапанімічнай камісіі пры Мінскім гарвыканкаме Іван САЦУКЕВІЧ, былы загадчык аддзела адукацыі Маладзечанскага райвыканкама, настаўнік матэматыкі гімназіі №7 горада Маладзечна Вікенцій СІРОТА, вядучы спецыяліст аддзела галоўнага рэдактара прадпрыемства «Белгеадэзія» Іна СЦЕПАНОВІЧ, кансультант упраўлення геадэзіі і картаграфіі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, адказны сакратар Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў Беларусі Ірына БАРОДЗІЧ.**


Вікенцій СІРОТА.


Ірына БАРОДЗІЧ.


Іван САЦУКЕВІЧ.


Іна СЦЕПАНОВІЧ.


Ігар КАПЫЛОЎ.

## «НЕ ЗМАГЛІ ДАМОВІЦЦА ПАМІЖ САБОЙ»

**— У нашых гарадах застаецца вельмі шмат вуліц, назвы якіх сведчаць толькі пра адзін перыяд гісторыі — савецкі час. У некаторых месцах рабіліся спробы вяртання ранейшых гістарычных назваў, аднак не заўсёды яны былі плённымі. Давайце прыгадаем, што тады адбывалася?**

**Іван Сацукевіч:**

— У 1990-я гады было адразу два праекты па перайменаванні толькі ў сталіцы, згодна з імі планавалі перайменаваць ці даць новыя назвы 20-30 вуліцам. Былі прапановы ўвекавечыць імёны Усяслава Чарадзея, Рагнеды і Рагвалода... Аднак прыхільнікі такіх зменаў не змаглі дамовіцца паміж сабой. Натуральна, гэтая праблема тады яшчэ не была адпрацавана комплексна: мы банальна не ведалі, якімі гістарычна былі назвы вуліц? Рэдкі горад Беларусі можа пахваліцца тым, што ў яго распрацавана гістарычная тапаніміка — вядомы ранейшыя назвы вуліц, зафіксаваны змены, якія адбываліся ў пэўныя эпохі. Прадстаўнікі ўлады толькі разводзілі рукамі: калі даследчыкі паміж сабой не могуць дамовіцца, то пра якое перайменаванне можна казаць?.. У Мінску гістарычныя назвы былі вернуты толькі тром вуліцам — Кальварыйскай, Ракаўскай і Гарадскому Валу. Хтосьці лічыць, што гістарычная назва была вернута таксама вуліцы Раманаўская Слабада. Аднак гэта не зусім дакладна. Такую назву мела вуліца, якая сёння называецца Мяснікова. А гэта называлася Новараманаўскай.

**Ігар Капылоў:**

— У нас да гэтага часу ёсць вуліцы Ландара, Кнорына, Мяснікова. Чытаю гістарычныя дакументы і разумею, што гэтыя рэвалюцыянеры ўвогуле не прызнавалі беларусаў за самастойны этнас і выступалі нават супраць утварэння БССР 1 студзеня 1919 года. А мы іх увекавечылі, яшчэ ў савецкі час. Але толькі год ці два таму з'явілася вуліца імя Карскага, дзякуючы якому ўвесь свет даведаўся, што ёсць такія беларусы, з адметнай мовай.

## «ГІСТАРЫЧНЫЯ НАЗВЫ ТАК І ПРОСЯЦЦА, КАБ ІХ ВЯРНУЛІ»

**Ірына Бародзіч:**

— Да ўсяго трэба падыходзіць з розумам. У нас ёсць свая гісторыя, і савецкі перыяд таксама туды ўваходзіць. Таму сёння ўсё ламаць і перакройваць, праводзячы дэсаветызацыю назваў вуліц у маштабах краіны, не трэба. Аднак некаторыя вуліцы падлягаюць перайменаванню, і ў пэўных выпадках гістарычныя назвы так і просяцца, каб іх вярнулі. Аднак праблема не толькі ў тым, што прыхільнікі розных назваў для адной вуліцы не могуць дамовіцца паміж сабой, але і ў вялікіх матэрыяльных затратах, з якімі давядзецца сутыкнуцца жыхарам перайменаваных вуліц: замена асабістых пашпартоў, дакументаў аб рэгістрацыі нерухомай маёмасці і іншага. Людзі не хочуць уносіць грошы за перарэгістрацыю, скардзяцца, што назву памянялі і цяпер ім давядзецца мяняць пашпарты за свой кошт. Складана патлумачыць чалавеку, што гэта насамрэч патрэбна. Да таго ж трэба ўносіць новыя назвы ва ўсе рэестры, мяняць таблічкі вулічна-дарожнай сеткі, даведнікі, карты. Ні ў якім разе нельга сячы з-за пляча, так, як робяць нашы найбліжэйшыя суседзі, мяняючы ўсе запар савецкія назвы вуліц.

**Ігар Капылоў:**

— Аднак можна рабіць гэта паступова. Калі за 24 гады незалежнасці адну назву ў год вяртаць, то не такія вялікія выдаткі патрэбны. Мы маглі б мець ужо 24 назвы — гэта істотныя змены і не такія балючыя. Шмат што залежыць і ад псіхалогіі чалавека: людзі прызвычаіліся да тых назваў, якія ні пра што ім не кажуць. Напрыклад на Дні пісьменства ў Быхаве выступала прафесар Ганна Мезенка і адзначыла, што толькі 6% назваў вуліц горада маюць пэўныя адносіны да Беларусі. Як на такой унутрыгарадской тапаніміцы можна выхоўваць пакаленні, як можна прывіваць патрыятызм і рэалізоўваць нацыянальную ідэю?.. Калі мне ўдалося з гэтай нагоды пагутарыць з прадстаўнікамі мясцовай улады, яны адзначылі, што асноўная прычына — гэта тое, што не жадаюць мясцовыя жыхары, яны прывыклі да такіх назваў. Тут трэба падключаць сродкам масавай інфармацыі, каб паступова перакана́ць людзей. Трэба рыхтаваць глебу ў свядомасці людзей, казаць пра неабходнасць такіх зменаў.

## МІСТАР РЫБАКОЎ І МІСТАР ФІШАР

**Іван Сацукевіч:**

— Яшчэ адна праблема, на маю думку, гэта новыя назвы вуліц. Раней ім маглі даць назву на рускай мове, напрыклад «Янтарная», «Восточная», «Южная», не задумваючыся пра тое, як гэта будзе перадавацца па-беларуску...

**Ірына Бародзіч:**

— Названая праблема таксама вырашаецца. Дзяржаўны камітэт па маёмасці вядзе рэестр адрасоў Беларусі, звесткі ў які ўносяцца на падставе рашэнняў аб прысваенні найменняў вуліцам і іх перайменаванні. Усе пастановы раённых органаў улады, якія да нас паступаюць, праходзяць мясцовую экспертызу на адпаведнасць заканадаўству Беларусі. У рэгістрацыі вуліц, названых няправільна, напрыклад з граматычнымі памылкамі, даецца адмова. Яны не ўносяцца ў рэестр адрасоў, пакуль на месцы не будзе прынята афіцыйнае рашэнне аб выпраўленні памылак. Аднак часам адбываецца так, што мы даём адмову, адпраўляем на месца ліст, у якім тлумачым яе прычыну, а там наша папярэджанне кладзецца ў стол і больш нічога не робіцца. Такім чынам ствараецца сітуацыя, калі ў рэестры адрасоў звестак па пэўнай вуліцы няма, а яе жыхарам нейкім чынам трэба ажыццяўляць маёмасныя здзелкі.

**Ігар Капылоў:**

— Людзі праводзяць сесіі на месцах, даюць назвы на рускай мове — так, як прывыклі. А ўжо пасля таго, як прынята рашэнне, усё зафіксавана ў дакуменце, задумваюцца, як гэта перакласці на беларускую мову, узгадваюць, што ёсць спецыялісты, тапанімічная камісія, камітэт па маёмасці. А рашэнне ўжо зацверджана...

**Іван Сацукевіч:**

— Я памятаю, як гады два таму ў нашу камісію звярнуўся мінчанін па прозвішчы Рыбакоў. Ён настойваў на тым, каб назвы новых станцый метро перакладалі — не Кавальская Слабада, а Кузнечная Слобода і г.д. На гэта мы яму адказалі, што калі ён прыедзе, напрыклад, у Вялікабрытанію, яго не будуць называць там містар Фішар — ён застанецца містарам Рыбаковым. Гэта імя асабістае, яно не перакладаецца. Тое ж і з назвамі вуліц, якія ў нашай краіне прысвойваюцца па-беларуску.

## «ВЯЛІКІЯ ГЕРОІ МАЛЫХ ТЭРЫТОРЫЙ»

**— Ці ёсць пэўныя правілы, прынцыпы, якіх прытрымліваюцца, прысвойваючы новыя назвы?**

**Ірына Бародзіч:**

— Арыентуемся на артыкул 16 закона «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў», у якім гаворыцца, што новыя назвы павінны адлюстроўваць гістарычныя, нацыянальныя, сацыяльныя, культурныя і іншыя асаблівасці гэтай зямлі. Абавязкова пры прысваенні наймення трэба ўлічваць меркаванне грамадзян, што пражываюць у пэўнай мясцовасці. Мы рэкамендуем даваць толькі абгрунтаваныя найменні, а не называць вуліцы Вясёлкавымі, Кветкавымі, Прыгожымі, Сонечнымі. Абгрунтаваныя — значыць тыя, што захоўваюць звесткі пра пэўныя падзеі, адлюстроўваюць гісторыю, ушаноўваюць памяць людзей, якія маюць заслугі перад грамадствам, Радзімай. Мы раім прадстаўнікам раёнаў шукаць імёны сваіх землякоў — тых, пра каго, магчыма, мала вядома ў краіне, аднак гэта вялікія героі для малых тэрыторый. Напрыклад, у 2013 годзе Гродзенскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў рашэнне прысвоіць адной з вуліц горада імя доктара медыцынскіх навук, былога рэктара Гродзенскага медыцынскага інстытута, ганаровага грамадзяніна Гродна Дзмітрыя Маслакова. Мы такую ідэю падтрымалі.

**Іна Сцепановіч:**

— Увогуле, пра існаванне закона «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў» на месцах ведала вельмі мала людзей, нават сярод тых, хто непасрэдна з гэтым звязаны — прысвоіе назвы, зацвярджае такія рашэнні. Часам даюць найменне вуліцы на рускай мове, а потым перакладаюць на беларускую, а па законе павінна быць наадварот: прысвойваецца на беларускай мове, з якой спосабам транслітарацыі перадаецца на рускую мову. Напрыклад, вуліца Усходняя і па-руску будзе называцца Усходняя, а не Восточная... Мы раім прадстаўнікам мясцовай улады дбаць пра прыгажосць назвы — пагутарыць са старажыламі, пагартаць кнігу «Памяць». Каб назва адпавядала гісторыі і прыгожа гучала.

## «ЛЁГКІЯ» НАЗВЫ

**— Ці варта праводзіць грамадскае абмеркаванне, даючы назвы новым вуліцам? Мне вядомы прыклад, калі ў адным горадзе, пабудаваўшы новы мікраён, мясцовыя ўлады сталі праводзіць апытанне, каб высветліць, як бы людзям хацелася назваць вуліцы ў ім. Натуральна, мясцовыя краязнаўцы прапанавалі імёны выбітных землякоў, аднак большасць насельніцтва аказалася схільнай акурат да вуліц Прыгожых і Вясёлкавых.**

**Ігар Капылоў:**

— Абмеркаванне праводзіць трэба, бо гэтага патрабуе закон. Аднак грамадскую думку варта рыхтаваць загадзя. Зімняя, Летняя, Сонечная — усё гэта прыгожыя назвы вуліц, якія ёсць у Мінску. Аднак што пакідаюць сваім нашчадкам людзі, якія даюць іх? Такія назвы абсалютна безаблічныя. А павінны мець пад сабой пэўнае абгрунтаванне — гістарычны сэнс, прыродна-геаграфічныя асаблівасці — і ўпісвацца ў нацыянальную тапанімічную сістэму. Аднак без адпаведных ведаў звычайны чалавек сапраўды можа схіляцца да больш простых, «лёгкіх» назваў.




## СЁННЯ ЎСКРАІНА — ЗАЎТРА ЦЭНТР

**— У інтэрнэце часта крытыкуюць тое, што імёнамі выбітных дзеячаў — Сапегі, Астрожскага — называюць зусім маленькія вуліцы на ўскрайку горада, дзе можа знаходзіцца толькі 10 катэджаў. Кажуць, што маштаб асобы не адпавядае выбранай вуліцы...**

# ГЕАМЕТРЫЯ

**Ірына Бародзіч:**

— Калі сёння на вуліцы 10 катэджаў, гэта не значыць, што заўтра на ёй не будзе 30 шматпавярхоўікаў. Вуліцы разрастаюцца. А калі цяпер правесці перайменаванне і імем гэтай асобы назваць большую па памеры вуліцу ў цэнтры, гэта прывядзе да вялікіх фінансавых затрат і незадаволенасці грамадзян. Калі пэўны дзеяч увекавечаны ў назве вуліцы, то не важна, колькі на ёй дамоў: галоўнае — імя працягвае жыць у тапаніміцы.

**Ігар Капылоў:**

— Горш, калі такія імёны ў нас зусім не фігуруюць. Іду я, напрыклад, па Кракаве, і экскурсавод кажа пра тое, што Касцюшка, Сыракомля, Міцкевіч — польскія дзеячы. Іду па Вільні, і мне кажуць пра Ластоўскага, што ён літовец. Быў бы дзесьці ў Ізраілі, і там бы мне сказалі, што Міцкевіч — іх творца. А беларусы сваю гісторыю і спадчыну раздаюць суседзям і самі нічога не маюць. Нашмат горш, калі мы зусім не называем вуліцы імёнамі такіх дзеячаў.

## «МАЛАДЗЕЧНУ ПАШАНЦАВАЛА»

**— У Беларусі ёсць толькі адзін горад, дзе ў свой час адбылося ўпарадкаванне абсалютна ўсіх назваў вуліц — былі вернуты гістарычныя найменні або прыдуманы новыя, больш адпаведныя. Вікенцій Сірота працаваў тады ў Маладзечанскім райвыканкаме і таму ўсе працэсы, якія адбываліся, ведае знутры. Хацелася б пачуць пра гэты пазітыўны прыклад.**

**Вікенцій Сірота:**

— Маладзечну пашанцавала. У 1990-х гадах там стварылася тапанімічная камісія пры райвыканкаме, мэтай якой было правесці ўпарадкаванне назваў вуліц. Кіраваліся двума крытэрыямі — гістарычнай абгрунтаванасцю і правільнасцю з пункту гледжання беларускай мовы. У камісію ўваходзілі гісторык Генадзь Каханоўскі, мастак Кастусь Харашэвіч, супрацоўнік абласнога музея, настаўнікі гісторыі і многія іншыя. Натуральна, вельмі істотным было тое, што прадстаўнікі мясцовай улады станоўча ставіліся да такой працы. Многім вуліцам былі вернуты іх гістарычныя назвы. Часам вяліся спрэчкі, ці варта гэта рабіць. Напрыклад, вуліца Пушкіна раней называлася Гарадоцкай, да таго ж побач з горадам ёсць мястэчка Гарадок (знакамітае да Другой сусветнай вайны яўрэйскае пасяленне), таму было вырашана вярнуць гістарычную назву. Вуліца Максіма Горкага раней называлася Замкавай — і яе назву таксама вярнулі. Вуліцу Савецкую назвалі Віленскай. З'явілася вуліца Лібава-Роменская, якая надзвычай добра ўпісалася ў тапанімічную карту, бо ідзе яна акурат уздоўж чыгункі (першая мясцовая чыгунка называлася Лібава-Роменская). Некаторыя спрэчкі вяліся толькі вакол цэнтральнай вуліцы: праспекту імя Леніна была прапанавана назва Вялікі Гасцінец. Цяпер з ёй усе пагаджаюцца і вельмі задаволены. Але спачатку «гасцінец» многімі ўспрымаўся як тое, што бацькі дзецям вязуць з дарогі, нейкія цукеркі. Людзям патлумачылі, што гасцінец — гэта вялікі гандлёвы шлях, а маладзечанскі праспект — акурат кавалак той дарогі, што ішла з Мінска да Вільні. З такім абгрунтаваннем усе пагадзіліся. Такім чынам вуліцам вярнулі назвы, якія былі раней. Аднак некаторым прыдумвалі новыя найменні. Напрыклад, вуліцы Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса, Мікалая Шчорса сталі называцца імёнамі беларускіх дзеячаў — тэатрала Ігната Буйніцкага, спевака Міхася Забэйды-Суміцкага, паплечніка Тадэвуша Касцюшкі Язэпа Ясінскага. Варта дадаць, што многія вуліцы ў Маладзечне захавалі свае ранейшыя назвы, напрыклад Маркава, Валынца, Прытыцкага, з'явілася вуліца Машэрава.

**— Прыгадайце, ці скардзіліся мясцовыя жыхары на матэрыяльныя выдаткі.**

**Вікенцій Сірота:**

— Перайменаванні адбываліся ў поўным спакоі, усе пагаджаліся — чуліся хіба што адзінкавыя пярэчанні. Зноў з'явілася вуліца Святаянская — такая адметная назва была адшукана ў архіве. Вуліцу, на якой раней стаяла настаўніцкая семінарыя, назвалі Семінарысцкай. Плошчу Свабоды назвалі Старое Месца. Усе былі згодны з такімі назвамі. А наконт выдаткаў — Маладзечна не надта вялікі горад, і не так шмат там было перайменаванняў, адразу каля 10. А астатнія рабіліся паступова — і гэта было не так заўважна. Каб агучваліся праблемы, звязаныя з матэрыяльнымі выдаткамі, не памятаю такога. Пэўна, знайшліся людзі, якія ў той час дапамагалі.

## ПРАСПЕКТ, ТУПІК, ЛІНІЯ, ШАША

**Іван Сацукевіч:**

— Хочацца падняць яшчэ адну цікавую, актуальную праблему. Сёння ў гарадах мы карыстаемся тэрмінамі, якія абазначаюць лінейныя аб'екты: вуліца, завулак, праезд, праспект, тупік, лінія, тракт, шаша. На месцах часта забываюць, што ўсё гэта сінонімы. Напрыклад, можна ісці па Мінску і на адным доме на шыльдзе прачытаць надпіс Старавіленскі тракт, а на суседнім — вуліца Старавіленскі тракт. Гэта проста анекдатычная сітуацыя. Мне неяк тэлефанаваў жыхар, які купіў кватэру на Старавіленскім тракце, збіраўся яе прадаць ужо на вуліцы Старавіленскі тракт, аднак юрысты яму сказалі, што гэта розныя аб'екты!

**Іна Сцепановіч:**

— Гэта вельмі вялікая праблема, з якой мы часта сутыкаемся. Каб неяк вырашыць яе, дасылалі рэкамендацыі ў мясцовыя райвыканкамы, каб там карысталіся імі. Вельмі складана, калі катэгорыі, такія як тракт, шаша, уваходзяць ва ўласную назву.

**Іван Сацукевіч:**

— Відавочна, гэта памылка робіцца на ўзроўні мясцовых ЖЭСаў, якія няправільна робяць шыльды?

**Ірына Бародзіч:**

— Так, да нас часта прыходзяць лісты жыхароў, якія спрабуюць разабрацца ў сітуацыі. Аднак мы іх накіроўваем у мясцовыя адміністрацыі, дзе прымаюцца адпаведныя рашэнні. Такія назвы даюць у раёнах, не разумеючы, што побач аказваюцца два родавыя тэрміны — вуліца і тракт, якія не могуць уваходзіць у назву. Спрабуем патлумачыць, што гэта няправільна, аднак праца пакуль ідзе цяжка. З 1 студзеня 2016 года рэестр адрасоў Беларусі (у электронным выглядзе даступны на сайце Нацыянальнага кадастравага агенцтва) стане абавязковым для выкарыстання ўсімі, хто працуе з найменнямі вулічна-дарожнай сеткі. Тым, хто робіць таблічкі, таксама варта зазірнуць у яго і, калі адшукаюць у сябе памылкі, перарабіць правільна. Аднак пра тое, што ёсць рэестр адрасоў, многія пакуль увогуле не ведаюць.

## З НОВАГА ГОДА — НОВЫЯ ПРАВІЛЫ

**— Што чакае тых, хто не паспее ўпарадкаваць мясцовую тапанімію да 1 студзеня 2016 года?**

**Ірына Бародзіч:**

— Іх пакараюць іх жа грамадзяне, калі пойдуць скаргі на тое, што нельга зарэгістраваць, прадаць жыллё, пакінуць спадчыну. І такія выпадкі ўжо здараліся, калі жыхар хацеў прадаць нерухомасць, а звестак пра вуліцу, на якой яна знаходзіцца, у рэестры адрасоў Беларусі не было. Тэлефануюць наўпрост у Дзяржаўны камітэт па маёмасці, запытваючыся, як бы хутчэй зарэгістраваць назву вуліцы. Паспрыяць мы пры ўсім жаданні не можам: на прыняцце такога рашэння мясцовымі ўладамі патрэбна каля трох месяцаў. Натуральна, чалавек тут жа піша скаргу, што ён такі доўгі час не можа ажыццявіць пэўную здзелку са сваёй нерухомасцю.

**Ігар Капылоў:**

— Акрамя практычнага аспекту, усе мы разумеем выхаваўчую, патрыятычную важнасць тапаніміі. Таксама яе моўную каштоўнасць, бо столькі цікавых, невядомых сёння слоў зафіксавана ў тапаніміі. Да яе павінны ставіцца ашчадна, як і да іншых гісторыка-культурных помнікаў.

**Вікенцій Сірота:**

— Сапраўды, я бачу тут вялікі выхаваўчы і патрыятычны аспект. Навучэнка гімназіі №7 горада Маладзечна, у якой я працую, Наталля Мучынская рабіла навуковую працу па гарадской тапаніміцы. Многія іншыя вучні таксама пачалі цікавіцца значэннем назваў сваіх ці суседніх вуліц. Так з небыцця паўсталі імёны многіх слынных землякоў і важных дзеячаў краіны...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**






**Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

**Организатор аукциона и продавец имущества: открытое акционерное общество «Дорожно-строительное управление №1, г. Рогачев»,**
ул. Генерала Петровского, 1, т. 8(023339) 2-55-37.

**Аукцион проводится 28 декабря 2015 года в 13.00 по адресу: г. Рогачев, ул. Генерала Петровского, 1, актовый зал (3-й этаж).**

**Сведения о предмете аукциона:**
Имущество находится в собственности ОАО «ДСУ-1, г. Рогачев»:

**бывший в эксплуатации технически неисправный**
**легковой автомобиль ПЕЖО 607**
**2002 года выпуска,**
**кузов № VF39DXFXB92071003, цвета серебристый металлик, регистрационный знак 1070 АЕ-3.**

Продается методом повышения начальной цены.

**Место нахождения имущества:** г. Рогачев Гомельской области, ул. Генерала Петровского, 1.

**Начальная цена имущества с учетом понижения на 20%: 47 479 680 рублей с НДС.**

Задаток для участия в аукционе (рублей): 2 373 984 рубля. Сумма задатка, внесенная покупателем, засчитывается в цену продажи. Шаг аукционных торгов составляет 5%.

Осмотреть имущество и ознакомиться с его техническим состоянием можно по адресу: 247671, г. Рогачев, ул. Генерала Петровского, 1 с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни.

*Задаток перечисляется на расчетный счет ОАО «ДСУ-1, г. Рогачев» № 3012115070013 в ЦБУ № 320 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Рогачев, ул. Ленина, 69, БИК 153001369, УНП 400041344.*

Заявления (с прилагаемыми документами) на участие в аукционе принимаются по адресу: **247671, г. Рогачев, ул. Генерала Петровского, 1**, приемная генерального директора с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни**, прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27 декабря 2015 года в 17.00.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. заявление на участие в аукционе и соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, подписанное директором ОАО по установленной форме;
2. документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
3. юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
4. иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык;
5. иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык;
6. представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан**: подписать протокол аукциона; в течение 3 рабочих дней после утверждения протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с оценкой объекта аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом имущества договор купли-продажи автомобиля. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 2 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения.



**Извещение о проведении 18 декабря 2015 года повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, местонахождение, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Балансо-держатель (должник) | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | Цех столярный для распиловки, дата ввода 01.08.2004, инвентарный номер 10000008, общей площадью 335,6 кв. м, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 16а | ОАО «Монолит-Град» | 2 122 550 100 | 212 000 000 |
| 2. | Капитальное строение (временная открытая автостоянка с контрольно-пропускным пунктом), инвентарный номер № 500/С-32053, общей площадью 3878,3 кв.м, расположенное: г. Минск, ул. Радиальная, д. 19 | ЗАО «Легас» | 1 228 857 300 | 122 000 000 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **18 декабря 2015 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 30.11.2015 по 16.12.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36, 327-40-22 (УП «Минский городской центр недвижимости»).**

■ Займець голас

# ДА МОЛАДЗІ АБЯЦАЮЦЬ ПРЫСЛУХАЦЦА

**Першае пасяджэнне Рэспубліканскага маладзёжнага савета пры міністры адукацыі адбылося ў сценах галоўнага адукацыйнага ведамства.**

— Амаль год мы ішлі да таго, каб стварыць калегіяльны грамадскі орган, які будзе дапамагаць нам у вырашэнні актуальных пытанняў у галіне маладзёжнай палітыкі. Менавіта маладыя людзі шмат у чым вызначаюць не толькі сучаснасць, але і нашу будучыню. Моладзь — наш стратэгічны і кадравы рэсурс. Сёння на вас робіцца вельмі вялікая стаўка, — падкрэсліў **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**, звяртаючыся да членаў савета. — Сам факт абвяшчэння 2015-га Годам моладзі сведчыць аб тым, што дзяржава давярае сучаснаму пакаленню і падтрымлівае маладзёжныя ініцыятывы.

Міністр прапанаваў, каб савет як мага хутчэй распачаў сваю працу і паставіў перад яго ўдзельнікі адразу два пытанні для разгляду: далучыцца да ўдзелу ў выбары маладзёжнай сталіцы Беларусі, а таксама прысвяціць маладзёжнай палітыцы адну з секцый на форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў чэрвені 2016 года.

Старшынёй савета была выбрана **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Інэса КЛЯШЧУК.** Яна адзначыла, што «ўдзел у савеце — гэта не толькі шанц праявіць сябе, але і экзамен на сталасць, магчымасць падтрымаць не толькі асобнага чалавека, а ўсё грамадства».

— Стварэнне такога савета вельмі своечасовае, бо ў цэнтры нашай увагі будуць праблемы і працоўнай моладзі, і навучэнскай, — падкрэсліла Інэса Кляшчук.

Яна заклікала членаў савета больш актыўна прапаноўваць новыя формы работы з моладдзю і агучваць ініцыятывы.

Рэспубліканскі маладзёжны савет пры міністры адукацыі плануе ўносіць прапановы па ўдасканаленні заканадаўства, абмяркоўваць актуальныя пытанні і праблемы, выпрацоўваць прапановы і рэкамендацыі па пытаннях дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, спрыяць узаемадзеянню арганізацый і дзяржаўных структур, якія працуюць з моладдзю.

У склад савета ўвайшлі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзных арганізацый, вучнёўскай і студэнцкай моладзі, маладыя педагогі і навукоўцы, работнікі навуковых арганізацый.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Сацыяльныя праекты

# УКЛЮЧАЙСЯ!..

## Каб вучань з аўтызмам не стаў «шокам» для школы

**Дзве вышэйшыя ўзнагароды шостага рэспубліканскага конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend атрымалі праекты, скіраваныя на ўключэнне дзяцей з інваліднасцю ў соцыум.**

**Са 140 дапушчаных да этапу «Народнае галасаванне» праектаў да фіналу дайшлі 15 самых актуальных і перспектыўных. Найлепшымі былі прызнаны праекты «Каманда «Крылы Анёлаў», які атрымаў Гран-пры і 30 млн рублёў, і «Інклюзія АНЛАЙН» міжнароднай дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі».**

Сутнасць праекта «Каманда «Крылы Анёлаў» заключаецца ў стварэнні спартыўнай каманды, якая складаецца з фізічна здаровых людзей і дзяцей-інвалідаў. Удзел апошніх у спартыўных спаборніцтвах забяспечваецца выкарыстаннем адмысловых гоначных прыстасаванняў — калясак, велапрычэпаў, лодак і г.д.

— Мы хочам, каб дзеці з інваліднасцю, а таксама іх бацькі ўдзельнічалі не ў нейкіх арганізаваных толькі для інвалідаў мерапрыемствах, а ў спартыўных спаборніцтвах і любых іншых актыўных відах дзейнасці разам з усімі, — падкрэслівае **Дзмітрый ЦІМАШКОЎ, аўтар праекта і заснавальнік сацыяльна-дабрачыннай спартыўнай установы «Каманда «Крылы Анёлаў».** —- Гэта дапаможа дабавіць да спагады, якая звычайна суправаджае «тэму інвалідаў», пазітыўных эмоцый і пазхаповага ўзаемадзеяння.

Ідэя стварэння каманды з'явілася ў аўтара праекта пасля таго, як ён сам прабег 21 кіламетр «Мінскага паўмарафону — 2015» разам са сваёй дачкой, васьмігадовай Ліліяй, штурхаючы яе ў калясцы перад сабой. Задума вельмі хутка знайшла водгук у іншых людзей, і сёння каманда ўжо рэальна існуе, трэніруецца і рыхтуецца да ўдзелу ў найбліжэйшых бегавых спаборніцтвах.

Уладальнікам Прыза глядацкіх сімпатый і 50 млн рублёў стаў праект «Інклюзія АНЛАЙН».

— Мы жадаем, каб вучань з аўтызмам мог прыйсці ў школу па месцы жыхарства, і ні для яго, ні для школы гэта не стала шокам, — расказвае **кіраўнік праекта Ірына ДЗЯРГАЧ**. — У мінскіх агульнаадукацыйных школах ужо сталі адкрывацца класы для дзяцей з аўтызмам, якія працуюць па прынятай у свеце інклюзіўнай мадэлі. А ў верасні такіх дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту прыняла мінская школа №187. Але па-за межамі сталічнай кальцавой дарогі ўсё інакш: сем'і з невялікіх гарадоў вымушаны пагаджацца на надомнае навучанне, паколькі ні педагогі, ні псіхолагі не валодаюць неабходнымі ведамі, каб паспяхова працаваць з такімі вучнямі.

**Ідэя стварэння каманды з'явілася ў аўтара праекта пасля таго, як ён сам прабег 21 кіламетр «Мінскага паўмарафону — 2015» разам са сваёй дачкой, васьмігадовай Ліліяй, штурхаючы яе ў калясцы перад сабой.**

Рэгіянальных спецыялістаў трэба рыхтаваць. Пажадана ў зручны для іх час. Сутнасць нашай ідэі — арганізаваць сістэму бясплатнага дыстанцыйнага навучання для педагогаў, дэфектолагаў, псіхолагаў, цьютараў і бацькоў дзяцей з аўтызмам.

— А яшчэ ў нашым курсе ёсць эксклюзіўны бонус: у сярэдзіне снежня мы запускаем праграмны прадукт «Камунікатар для дзяцей і дарослых з аўтызмам». Выкладзем яго ў адкрытым доступе, а на сваіх вэбінарах навучым, як максімальна выкарыстоўваць магчымасці распрацоўкі, — дадала Ірына Дзяргач. — Таму запрашаем усіх, хто ўсведамляе важнасць праекта «Інклюзія АНЛАЙН», паўдзельнічаць у стварэнні яго матэрыяльнага падмурка, наведаўшы нашу старонку на краўдфандзінгавай платформе «Вулей».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Пераемнасць

# МІНУЛАЕ НІКУДЫ НЕ ЗНІКАЕ...

**Цяжка нават назваць тое шчымлівае пачуццё, з якім назіраў, як паэтэса Соф'я Шах гутарыла са сваёй першай настаўніцай Марыяй Фёдараўнай Бачурай — у тым жа класе, мабыць, седзячы за тым жа сталом Азарыцкай школы, праз 35 гадоў пасля развітання з ёю. Аднолькавыя адчуванні часавага суму засяроджваліся ў вачах былой вучаніцы і настаўніцы. Гаворка ішла не толькі аб шматлікіх паэтычных кнігах санетнага жанру, якімі цікавілася Марыя Фёдараўна, але і пра жыццёвыя акалічнасці, здаецца, вельмі хуткі пазашкольных гадоў. Я ж спяшаўся з дапамогай фотаапарата «занатаваць» моманты ўзнёсла-хвалюючай сустрэчы.**



Калектыў Азарыцкай сярэдняй школы.

Шмат было і іншых уражанняў ад майго першага знаёмства са школай, але тая гутарка надала ім менавіта настальгічную танальнасць. Яна пераконвала ў тым, што мінулае нікуды не знікае, яно застаецца ў сённяшнім.

Думаю аб гэтым і цяпер, калі збіраемся на святкаванне 150-годдзя школы. Няма ўжо, на вялікі жаль, Марыі Фёдараўны Бачуры, Рыгора Мікалаевіча Басякова, Надзеі Сямёнаўны Казакевіч і многіх іншых яе былых настаўнікаў. Але ёсць яшчэ, дзякуй Богу, з кім сустрэцца і пагутарыць. Неяк неспадзявана школьныя сябры Соф'і Мікалаеўны Шах сталі і маімі. Ды і сама школа з яе засяроджанасцю на пераемнасці часу робіцца чымсьці вельмі блізкай. Вучыцца ў такой, якая памятае, што ёй 150 гадоў, зусім не тое, што ў звычайнай ці нават незвычайнай, узведзенай нядаўна.

Заўжды прыемна пераканацца, што менавіта тут нейкім цудам захоўваецца духоўнае паветра часу. І справа не толькі ў тым, што сцены вестыбюля запоўнены фотаздымкамі і тэматычнымі стэндамі, што там ёсць месца тэксту гімна школы і яе гербу...

Трохпавярховы цагляны будынак, узведзены ў студзені 1962 года, нібыта ўвабраў у сябе нешта вельмі істотнае ад усіх папярэдніх. І калі б нават не ведаў, што першым з іх быў той, у якім 5 кастрычніка 1865 года адкрылася народнае вучылішча, то самі сцены з іх інфармацыйнымі стэндамі падказалі б.

Вось выпіска з «Памятнай кнігі Віленскай навучальнай акругі», якая сведчыць, што размяшчалася яно ў грамадскім доме, а фінансавалася з дзяржаўнай і сялянскай абшчыннай казны. Першымі навучэнцамі былі 34 хлапчукі і 5 дзяўчынак. Не забылісі і пра выкладчыка, выпускніка Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі Ігната Пятровіча Ліпніцкага. Між іншым, па прозвішчах, з якімі знаёмішся, можна скласці асобасную біяграфію сённяшняй школы. У 1918 годзе сюды прыйшоў таксама выпускнік гэтай семінарыі Кірыла Сысоевіч Лучкоў разам з жонкай Марыяй Сяргееўнай і яе сястрой Аленай Сяргееўнай Шаблінскай — настаўніцамі пачатковых класаў. Тады ж ён узначаліў аддзел адукацыі Азарыцкага валаснога ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Гэта пры яго непасрэдным удзеле былі створаны новыя школы ў вёсках Азарыцкай воласці, а ў Азарычах яшчэ адкрыта і пачатковая яўрэйская, пачалася ліквідацыя непісьменнасці мясцовага насельніцтва. Менавіта ён потым пераўтварыў царкоўна-прыходскую школу ў беларускую агульнаадукацыйную — спачатку пяці-, пасля сямігадовую, а ў 1936-м — у сярэднюю. Кіраваць ёю і выкладаць біялогію Кірыла Сысоевіч вярнуўся і пасля вайны. За шматгадовую адукацыйную працу быў удастоены найвышэйшай узнагароды СССР — ордэна Леніна.

Угады Вялікай Айчыннай ці не ўсе выпускнікі школы пайшлі на фронт або ў партызаны. Цяпер мы ведаем, што 34 з іх загінулі. Сярод тых, хто вярнуўся з узнагародамі, — Мікалай Сямёнавіч Цяслюк, Васіль Мікалаевіч Паўлоўскі, Міхаіл Сяргеевіч Ботка... Нельга не прыгадаць Аркадзя Сямёнавіча Шаблінскага. У 1939 годзе ён скончыў 10 класаў і паступіў у Маскоўскі аўтамеханічны інстытут. Прайшоў усю вайну ад яе пачатку. Перамогу сустрэў у Прусіі. За адвагу і гераізм узнагароджаны шматлікімі медалямі і ордэнамі. Вярнуўшыся ў Маскву, паступіў у Ваенна-тэхнічную артылерыйскую акадэмію імя Дзяржынскага (зараз Ваенная акадэмія ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння імя Пятра Вялікага). Пасля заканчэння амаль чатыры дзесяцігоддзі аддаў выкладчыцкай працы ў гэтай жа навучальнай установе. Стаў доктарам тэхнічных навук, прафесарам. Па яго падручніках курсанты акадэміі вучацца і зараз. Яму прысвоена воінскае званне генерал-маёр. На вялікі жаль, у 1994-м загінуў пры выпрабаванні новых ракет стратэгічнага прызначэння... А колькі іншых лёсаў можна было б прыгадаць!

Між тым, эстафету педагагічнага і дырэктарскага клопату пасля Кірылы Лучкова перамалі Залесін, Педрын, Гуло, Цяслюк, Штукар, Каліноўскі, Ігнацьева, Мішчанкоў, Гаруля... 20 гадоў такога працоўнага энтузіязму аддаў школе ініцыятар-краязнавец, настаўнік гісторыі Уладзімір Лазаравіч Макатроў. Архіўныя дакументы аб дарэвалюцыйным і савецкім часе школы, аб Азарыцкім лагеры смерці, фотаздымкі, дакументы, успаміны аднапалчан і родзічаў аб Героі Савецкага Саюза Зінаідзе Самсонавай, успаміны азарычан — ветэранаў вайны і многае іншае — яго вялікі ўклад у стварэнне ў школе краязнаўчага музея. Потым да гэтай працы далучыліся Сяргей Аркадзьевіч Пуцікаў, Рыгор Мікалаевіч Басякоў, Валянціна Рыгораўна Клім, Вера Уладзіміраўна Навіцкая, іншыя настаўнікі. А неўзабаве пры падтрымцы Рэспубліканскага фонду ўзаемаразумення і прымірэння з'явіўся школьны музей «Памяці ахвяр Азарыцкага лагера смерці», якім таленавіта кіравала настаўніца гісторыі Ірына Леанідаўна Міхайлава.

Вось ужо 21 год цудоўнай пераемнічай Макатрова на дырэктарскай пасадзе з'яўляецца выдатнік адукацыі Беларусі Таццяна Пятроўна Цяцерыч — не менш руплівая збіральніца гістарычнай спадчыны. Шмат было ў нас сустрэч з гэтым засяроджаным на школьных турботах чалавекам. Але іх будзённасць не здолела пазбавіць яе святочнасці адчування штодзённай педагагічнай працы. Дырэктарская строгасць нейкім дзіўным чынам спалучаецца ў ёй з уменнем надаць творчую свабоду і настаўнікам, і вучням. Трэба было бачыць, якім сюрпрызам для выкладчыкаў станавіліся вучнёўскія капуснікі, канцэрты, дні прафесійных настаўніцкіх свят. І ўсё гэта — праз патрыятычнае ўспрыманне не толькі школы, але і роднага пасёлка. Вось чаму так натуральна ўпісалася ў сцэны роднай школы карцінная галерэя з жывапісных твораў Соф'і Шах, якія ўвасобілі менавіта прыгажосць родных азарыцкіх краявідаў. І кожны з іх — не толькі ў фарбах, але і ў паэтычных радках.

Школу скончылі каля трох тысяч азарычан і жыхароў навакольных вёсак. Больш за 80 залатых і сярэбраных медалёў было ўручана найлепшым. Школьныя сцены захавалі памяць пра многіх з іх. Вось з фотаздымка пазірае на нас старшы выкладчык Беларускай эканамічнай акадэміі Уладзімір Пігуль. Побач намеснік міністра меліярацыі Іван Бярдзічавец, старшы выкладчык Белдзяржуніверсітэта Віктар Ахраменка, загадчык кафедры фізікі і матэматыкі гэтай жа навучальнай установы Іван Казлоў, першы прарэктар БНТУ, доктар тэхнічных навук, прафесар Фёдар Панцялеенка, былы намеснік старшыні Дзяржкантролю, потым першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі Аляксандр Пракопаў, кандыдат біялагічных навук Павел Белы...

Гэта асабістыя дасягненні. А ёсць і калектыўныя. Школа неаднаразова станавілася пераможцай разнастайных конкурсаў і спаборніцтваў, прадметных алімпіяд, канферэнцый, удзельніцай і прызёрам ВДНГ СССР, адзначалася самымі рознымі ўзнагародамі. Гонар навучальнай установы сёння памнажаюць выдатныя педагогі, якія не абмяжоўваюцца абавязковымі вучэбнымі праграмамі. Распрацоўваюць дадатковыя: па асновах камп'ютарнай адукацыі, справаводстве, краязнаўстве, асновах псіхалагічнага навучання, здаровым ладзе жыцця, па інтарэсах і па ўсіх факультатыўных прадметах... Дзякуючы пераемнасці захоўваецца далучанасць да 150-гадовай гісторыі школы — незвычайнай па сваім духоўным і творчым абліччы.

**Ізяслаў КАТЛЯРОЎ**

# Алесь МУХІН:
# «ЧАЛАВЕК, ЯКІ ДУМАЕ, САПРАЎДЫ РАЗВІВАЕ СВЕТ»

**Бізнесмен, інтэлектуал і добры сем'янін. Алесь Мухін не толькі самы вядомы беларускі ігрок «Што? Дзе? Калі?» і вядучы беларускай версіі гульні. Адначасова ён і генеральны дырэктар кампаніі «Караван» — самага вялікага дыстрыб'ютара кавы і чаю ў Беларусі, тата дваіх дзяцей, муж. Пра тое, як можна ўдала спалучыць усе гэтыя іпастасі — у размове сам-насам.**

***— У вашым офісе ўсё даволі дэмакратычна і адкрыта. Вы, як кіраўнік, таксама маеце адпаведныя якасці?***

— У сваёй працы я абапіраюся на прынцыпы дэмакратычнасці і інавацыйнасці. Нам важна, каб людзі на працоўных месцах праяўлялі ініцыятыву. Ёсць кампаніі, дзе большая частка ідэй ідзе ад кіраўніцтва: дзесьці штосьці пачулі, прыдумалі, пабачылі ў сне. А мы імкнёмся рабіць так, каб нашы супрацоўнікі, якія пастаянна наведваюць тэматычныя семінары і лекцыі, таксама былі на вяршыні сучаснай думкі ў продажы, маркетынгу, лагістыцы. Напэўна, кампанія «Караван» якраз і адрозніваецца тым, што ў нашых людзей слова «праца» асацыюецца з паняццем «другі дом».

***— Які чалавек ніколі не трапіць у вашу кампанію?***

— Найбольш мне не падабаецца коснасць мыслення. Той, хто жыве выключна па нормах і правілах, не будзе паспяховым у сучаснай камерцыйнай думаючай структуры. Раней я лічыў, што юрысты і бухгалтары павінны быць у пэўных рамках. Але, насамрэч, у іх задача яшчэ складанейшая: трэба быць у рамках, але, з іншага боку, мысліць шырэй, каб мець магчымасць прапанаваць альтэрнатыўныя варыянты існуючай рэчаіснасці.

***— Што для вас першаснае ў працы: самарэалізацыя ці грошы?***

— Калі я быў маладым чалавекам і заканчваў Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт (у сярэдзіне 1990-х), разумеў, што тыя фінансавыя магчымасці, якія прапаноўвае дзяржава маладым настаўнікам, нават калі працаваць на некалькі ставак, крыху не адпавядаюць звычайнаму для мяне ўзроўню жыцця і амбіцыям. Таму кар'ера педагога не склалася.

Казаць, што грошы не адыгрываюць ніякай ролі, будзе няправільна. Сёння яны — крытэрый паспяховасці чалавека. З іншага боку, мне было важна займацца тым, што добра атрымліваецца, няхай і трэба дзесьці падвучыцца. І каб праца была выканана на сто працэнтаў. Я не раблю нічога «і так пойдзе». Ужо калі забіў цвік — будзе моцна сядзець. Хаця гэта рэдка здараецца. Калі дзяцей выхоўваю, значыць, яны павінны вырасці добрымі. Калі кірую кампаніяй, тады стараюся рабіць гэта максімальна эфектыўна, як дазваляюць мае магчымасці, амбіцыі і інтэлект.

**«Калі два нармальныя чалавекі сустракаюцца і пачынаюць жыць разам, усё залежыць ад жаночай мудрасці. Мужчыны — яны ж пеўнікі, абы пакрасавацца».**

***— Наколькі тое, што вы займаецеся «інтэлектуальным спортам» — «Што? Дзе? Калі?», звязана з вашымі поспехамі ў бізнесе?***

— Нездарма дэвіз знатакоў усіх краін — «Што наша жыццё? Гульня!». Калі ўдумацца ў гэту пушкінскую фразу, яна дае адказ на ваша пытанне. Справа ў тым, што я ўспрымаю «Што? Дзе? Калі?» як квінтэсэнцыю штодзённага жыцця, асабліва ў маім выпадку — як мадэль пабудовы адносін у якасці кіраўніка. Там я капітан каманды, тут — узначальваю буйны холдынг. І там, і там мне неабходна псіхалагічна падвесці ігракоў каманды да належнага піка формы. Што і адбываецца на нашых нарадах. І там, і там мне трэба адшукаць правільны адказ. Іншае пытанне, што ў гульні гэта адбываецца за хвіліну, а тут — у нейкіх сітуацыях нават хутчэй ці, наадварот, расцягваецца на месяцы. Таму гульня — гэта своеасаблівая мадэль жыцця.

***— Чаму «Што? Дзе? Калі?» мае столькі прыхільнікаў? Чаму людзі імкнуцца да інтэлектуальнасці?***

— Я лічу, што найболей прагрэсіўную частку чалавецтва, як казалі ў савецкія часы, адрознівае так званы «сенсорны голад» — пошук новай інфармацыі, адчуванняў, падзей. Менавіта такія людзі рухаюць наперад чалавечую цывілізацыю. Гэта не значыць, што ўсе павінны стаць знатакамі. Але гульня «Што? Дзе? Калі?» для тых, хто бярэ ў ёй удзел, — гэта спосаб самарэалізацыі. Чалавек, які думае, сапраўды развівае свет.



Але валодаць глыбокімі ведамі — гэта эрудыцыя, а ўмець імі скарыстацца — інтэлект. У нас менавіта інтэлектуальная перадача. Яна дае людзям магчымасць з дапамогай іх ведаў і, прыкладаўшы інтэлектуальнае намаганне, адказаць на пытанне. Толькі ўлічваючы мноства фактараў і адсякаючы непатрэбнае, аддзяляючы зерне ад пустазелля, можна адшукаць правільны адказ на пытанне і ў «Што? Дзе? Калі?», і ў жыцці.

***— Вы якраз ведзяце беларускую версію гульні. Ужо каму, калі не вам, ведаць, ці здольны беларусы карыстацца тымі ведамі, якія ў іх ёсць?***

— Вядома. Шмат хто кажа, што Беларусь — краіна-транзіт, знаходзіцца на стыку цывілізацый... І ўсё гэта правільна. Але гэта абставіны, якія ёсць апрыёры. Тое, што наша краіна валодае цудоўнымі тэхнічнымі і гуманітарнымі спецыялістамі ўсіх узроўняў, абсалютна дакладна. І доказ гэтаму, што ў пасляваенныя часы менавіта Беларусь была "зборачным цэхам" усяго СССР. Запчасткі рабіліся па ўсім Саюзе, а збіралі менавіта ў нас ці часам у краінах Балтыі. Гэта кажа пра тое, што ў Беларусі ўзровень інжынернай думкі быў вышэйшы, чым у іншых краінах.

Тыя вынікі, якія паказваюць беларускія каманды «Што? Дзе? Калі?», пры праглядзе нашымі маскоўскімі калегамі выклікаюць захапленне. Я не магу сказаць, што ў нас нейкае местачковае мерапрыемства, якому далёка да найлепшых аналагаў. Справа не толькі ў асобе вядучага ці ў тым, што мы самі сабою ганарымся. Як толькі мы пачалі здымаць беларускі клуб, значная колькасць нашых знатакоў аказалася ў маскоўскім.

***— А вашы дзеці гуляюць у «Што? Дзе? Калі?»?***

— На прафесійным узроўні не. На аматарскім, зразумела. Я прыхільнік таго, што дзіцяці трэба даць шмат розных альтэрнатыў. А далей няхай яно само выбірае. Калі мая дачка паміж «схадзіць у суботу ў інтэлектуальны гурток» ці «з'ездзіць пакатацца на кані» выбера другое, таму што ёй гэта больш падабаецца, калі ласка.

***— Значыць, вы не вельмі строгі тата?***

— Напэўна, так. Я ўсё ж такі стараюся выканаць тую функцыю, якой, на жаль, у нашай краіне ў сістэме адукацыі не хапае, — прафарыентацыі. І гэта моцна адбіваецца на лёсе ўсіх нашых суайчыннікаў. Таму я імкнуся максімальна дапамагчы з гэтым сваім дзецям на любым этапе іх жыцця. Я ў савецкія часы хадзіў у спартыўную секцыю, скончыў музычную школу, паралельна гуляў у двары, збіраў манеты, маркі, чытаў кніжкі. Таксама стараўся вырасціць і сына. У выніку ён самастойна паступіў на факультэт міжнародных адносін БДУ. А я і мезенцам не паварушыў. Гэта значыць, што мы змаглі выхаваць у ім здольнасць чагосьці дасягаць, а з іншага боку, далі такі інтэлектуальны патэнцыял, які дазволіў яму паступіць у ВНУ. Тое ж і з дачкой. Яна і тэнісам займаецца, і ў гуртох тэатральны ходзіць, і на кані любіць пакатацца. Я хачу, каб дзеці адчулі жыццё ва ўсіх яго праявах і займаліся тым, што ім болей даспадобы.

***— Усё ж такі дзіця трэба накіроўваць?***

— Пазіцыя, што дзіця само разбярэцца ці няхай яму ў гэтым дапамогуць настаўнікі, памылковая. Асабліва ў сучасным грамадстве. Пэўныя арыенціры, якія стрымлівалі чалавецтва падчас усяго цывілізацыйнага развіцця — рэлігія ці дэспатычныя рэжымы, трымалі людзей у цуглях. Зараз гэтага няма. Інтэрнэт, камп'ютарныя гульні — маса спакус прапануе збочыць з жыццёвай сцежкі і абстрагавацца ад рэчаіснасці. У гэтым сэнсе задача бацькоў — накручваць хвост. Мала людзей нараджаюцца з унутраным «маторчыкам», што «я абавязкова чагосьці дасягну». Як правіла, так усе кажуць, але, калі сутыкаюцца з першымі жыццёвымі цяжкасцямі, пасуюць, а жыццё часта прапаноўвае больш лёгкія варыянты.

Бацькі павінны ставіць перад дзіцем болей суровыя выклікі, чым асяроддзе. Напрыклад, матываваць наведваць тыя ж секцыі. А яшчэ ў школе добра вучыцца, рабіць хатнія заданні, сабаку выгульваць, мыць посуд. Гэта не армейскі падыход, але з цягам часу я бачу, што падабаецца дзіцяці, і ў гэтым падштурхоўваю яго напружвацца і станавіцца больш дасканалым.

Магчыма, у хуткім часе з'явіцца новая ідэя, якае аб'яднае чалавецтва, ці адновіцца мінулая — тая ж рэлігія. А пакуль што культывуецца грамадства спажыўцоў і ўсё, што з ім звязана. Таму тое, што частку свайго жыцця я выраашыў прысвяціць папулярызацыі такіх інтэлектуальных гульняў, як «Што? Дзе? Калі?» і «Брэйн-рынг», — мой пасільны ўклад у развіццё беларускага грамадства.

**«Мне не падабаецца коснасць мыслення. Той, хто жыве выключна па нормах і правілах, не будзе паспяховым у сучаснай камерцыйнай думаючай структуры».**

***— Ці ёсць у вас нейкія сямейныя традыцыі?***

— Вядома. Напрыклад, я не гатую ясці! Але час ад часу пачынаецца абурэнне, і тады мы ўсе разам пешшу ідзём гуляць, заходзім у кавярню. Лічыцца, што тата «згатаваў паесці» — ён жа заплаціў за вячэру!



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Хто важнейшы: мама ці тата?***

— Нельга сказаць, нават дзеці на гэтае пытанне ніколі не давалі адназначны адказ. У нас з жонкай зусім розныя функцыі ў сям'і. Мы дамовіліся, яшчэ калі былі студэнтамі, аб размеркаванні абавязкаў, і далейшае жыццё ўсё гэта толькі ўдасканаліла. Ёсць пытанні, якія вырашаю толькі я, ёсць і тыя, што цалкам ляжаць на Таццяне. Час ад часу збіраемся на сямейныя саветы. З гэтага пункту гледжання ў нас быт наладжаны. Толькі для такога трэба найперш стварыць усе ўмовы для жонкі.

***— Вы можаце сказаць, што адшукалі сваю палавінку?***

— Чалавецтва давала гэтаму сотні азначэнняў. Палавінка — толькі адно з іх. «Мы абодва нарадзіліся з дзіркай у сэрцы: ты заткнула маю, а я тваю» — пісаў Сцівен Кінг. Я, па шчырасці, веру не ў гэта, а ў розум мужчыны і мудрасць жанчыны. Калі два нармальныя чалавекі сустракаюцца і пачынаюць жыць разам, усё залежыць ад жаночай мудрасці. Мужчыны — яны ж пеўнікі, абы пакрасавацца. А жанчына будзе яго такога хваліць, але неназойліва скіроўваць рабіць тое, што ёй хочацца. У гэтым і ёсць поспех сям'і.

***— Як вы думаеце, для жанчыны важна самарэалізоўвацца?***

— Гэта таксама адна з праблем сучаснага грамадства. Яно падштурхоўвае жанчыну станавіцца ці хатняй гаспадыняй, але пры гэтым даглядаць дзяцей і сябе, калі муж у стане забяспечваць сям'ю. Ці ператварыцца ў зусім загнаную кабету, якая пасля працы павінна яшчэ і домам займацца. А пасля азіраецца — у 40 гадоў яна ўжо фізічна і маральна бабулька. У гэтым сэнсе беларускам падышла б сістэма частковай занятасці, папулярная зараз на Захадзе. У еўрапейскай эканоміцы ёсць цэлыя профільныя кірункі, у якіх запатрабаваны менавіта такія спецыялісты.

Лічу, што для жанчыны самарэалізацыя сапраўды важная. Я якраз не з таго разраду мужчын, якія ўпэўнены, што жонка павінна сядзець дома і ляпіць пельмені. Мне было б нецікава жыць з такой. Таму ў нашым грамадстве паўнавартаснай маці і жонцы досыць складана рэалізавацца ў прафесійным плане.

***— Як вы вырашылі гэтую праблему?***

— Я прыдумаў здымаць «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі, чым зараз цалкам займаецца мая жонка. Праўда, гэта была нават не мая ідэя. Калегі па клубе, ведаючы Таццяну, самі прапанавалі пры здымках гульні ў Мінску зрабіць галоўнай менавіта яе: у жонкі адпаведная адукацыя. Я не думаю, што Таццяна справіцца, але ўсё атрымліваецца. Яна малайчына.

***— А калі б ваша жонка зарабляла больш, чым вы?***

— На шчасце, я гэтага не зведаў.

***— Як спалучаеце працу і сям'ю?***

— Часта задаюць пытанне: «А як вы са знатакамі рыхтуецеся да гульні? Ёсць у вас нейкія фішкі?» У сям'і тое ж, яны таксама існуюць. Не займаюць шмат часу, але адыгрываюць значную ролю. Сумесныя шпацыры з сабакам ці без яго, паход у кавярню, сумесны адпачынак. У мяне не ідэальная сям'я, але гэтыя рэчы даюць магчымасць дзецям адчуць бацькоў. Я бачу, што ім мяне хапае. Але за ўсё трэба плаціць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*



### БЛІЦ-АПЫТАННЕ

***— Бландзінкі ці брунеткі?***

— Адназначна брунеткі.

***— Гарбата ці кава?***

— І гарбата, і кава. Кампанія, у якой я працую, пастаўляе і тое, і тое.

***— Сябры ці сям'я?***

— Хацелася б, каб сям'я, але вельмі часта сябры.

***— Розум ці сэрца?***

— Розум.

***— Інтэрнэт ці тэлебачанне?***

— Прабач мне, мой бізнес, але, хутчэй, інтэрнэт, бо на тэлевізар няма часу.

***— Эканомія ці марнатраўства?***

— Марнатраўства.

***— Вы ніколі не даруеце...***

— Здрады.

***— Кніга, якая вас кардынальна змяніла.***

— Дыялогі Платона. У свой час яны мяне падштурхнулі стаць думаючым чалавекам.

***— У першай кнізе аб Гары Потары ёсць люстэрка Еіналеж, якое паказвае не знешнасць чалавека, а яго самыя прыхаваныя жаданні. Што б вы пабачылі ў ім?***

— Не буду адрозніваціся ад Гары Потара. Я хацеў бы пабачыць сваіх бацькоў.



# УСЛЕД ЗА ВЕТРАМ

**Наталля Арлова з Віцебска кінула працу ў буйной кампаніі, каб год прысвяціць Азіі — пакандраваць, пажыць там... Цяпер яна дзеліцца сваімі ўражаннямі.**

*Фактычна, Наталля мела лета ўвесь год. Аднак душа нашага чалавека прагне звыклых прыродных зменаў. Гэта тое, чаго бракавала ў дарозе. Сама Наталля кажа: «У беларусаў глыбока ўнутры закладзена перамена пор года — зіма, вясна, лета, восень. Файна вяртацца дадому — зноў адчуваеш подых прахалоды».*

## Замежнікам вельмі спадабалася наша «Купалінка»

***— Што натхніла на падарожжа? Можа, чыйсьці прыклад?***

— У адпачынку ад працы на Філіпінах пазнаёмілася з кайтсёрферамі (ад англ. kite — паветраны змей. Від спорту, на аснове руху пад уздзеяннем сілы цягі, што развіваецца паветраным змеем. Змея ж утрымлівае і накіроўвае спартсмен). Гэтая катэгорыя людзей вандруе ў прамым сэнсе разам з ветрам, высочваючы найлепшыя ўмовы для кайтсёрфінга па прагнозе надвор'я. Напрыклад, увосень яны могуць быць у Егіпце, а ўлетку — у Крыме.

*І тады Наташа падумала: «Абавязкова і я паеду свабодна вандраваць. Хачу быць там, дзе вецер». І ўжо менш чым праз год адправілася ў сваё незабыўнае падарожжа.*

***— Ці ва ўсіх краінах ведаюць пра Беларусь?***

— Некаторыя азіяты нешта чулі пра нашу краіну — у асноўным гэта тыя, хто мае тут сваякоў (якія вучацца альбо працуюць у Беларусі). Калі была ў кітайскім горадзе Яншо, зрабіла для тамтэйшых жыхароў (студэнтаў школы, дзе была валанцёрам) прэзентацыю з беларускімі фотаздымкамі, відэа. Напрыканцы «прымусіла» ўсіх прысутных хорам сказаць «Бе-ла-русь!». Замежнікам вельмі спадабалася наша «Купалінка». Падчас прэзентацыі ўсім давала рэцэпт дранікаў. А падчас вандроўкі гатавала іх сваім новым сябрам.



Рысавыя палі ў Інданезіі.

***— Надоўга затрымлівалася дзе-небудзь ці не? Год усё ж такі не малы тэрмін.***

— У в'етнамскім горадзе Муйнэ, дзе затрымалася на цэлых паўгода, займалася фатаграфіяй ды сёрфінгам.

Калі рушыла ў падарожжа, натуральна, мела з сабой грошы. Але яны не бясконцыя...

Потым накіравалася ў Кітай, дзе правяла два месяцы. Пасля максімум тыдня аўтастопа альбо проста пастаяннай дарогі непазбежна з'яўляецца стома (наступствы таго, што пастаянна знаходзішся ў дарозе альбо на трасе, спіш у машынах ці намёце), і тады перапынак у вандроўцы арганізуецца неяк сам. А маршрут часам змяняецца пад уплывам акалічнасцяў ды парад мясцовых жыхароў: яны часта падказваюць, дзе варта абавязкова пабываць, што пабачыць.

## Ехала над кіламетровай прорвай у грузавіку з беларускай калійнай соллю

***— Што цікавага бачыла?***

— Шмат чаго. Напрыклад, ступеньчатыя рысавыя палі на поўначы В'етнама, нацыянальныя меншасці з унікальным выглядам — хмонгі, чорныя таі... Горы, дзе дарога шчасця была больш падобная да дарогі смерці, бо ішла па стромкай горнай сцяжынцы. Наша жыццё тады цалкам было ў руках кіроўцы.

**«Машына ехала па дарозе-нітцы з хуткасцю 15 км за гадзіну. У такія моманты вучышся давяраць жыццю, калі не можаш нічога змяніць».**

Ехала над кіламетровай прорвай у В'етнамскіх гарах у грузавіку з беларускай калійнай соллю (справа ў тым, што наша калійная соль — гэта мінеральнае ўгнаенне для в'етнамскіх сялян). Машына ехала па дарозе-нітцы з хуткасцю 15 км за гадзіну. У такія моманты вучышся давяраць жыццю, калі не можаш нічога змяніць.

***— Якая іншаземная страва ўразіла цябе найбольш? А можа, нават шакіравала.***

— На поўначы В'етнама мяне шакіравала, што ў ежу ўжываюць сяброў нашых меншых — сабак. Жудаснае відовішча, калі бачыш, як жывёл зганяюць у клеткі. Хацелася падбегчы ды выпусціць іх.

***— Як там з транспартам?***

— Датычна В'етнама, Балі — там самым зручным транспартам з'яўляецца мапед. У турыстычных месцах можна купіць за $200-300 нянавыя мапеды і стаць досыць мабільным, на Балі выгадней арандаваць. Пробкі на дарогах таксама не страшныя: іх можна праехаць, манеўруючы паміж машынамі. Акрамя таго, рухацца на такім транспарце зручна — заўжды свежае паветра, што важна, улічваючы пастаянную гарачыню. Уразіў дарожны рух. Фактычна нашым чалавекам тамтэйшы стыль язды ўспрымаецца як хаос. Але кажуць, што ў аварыі трапляюць пераважна прыезджыя.



Вучні, якія праходзілі навучанне кунг-фу і Тай-Чы ў будыйскім манастыры.

***— Прыгадай што-небудзь цікавае...***

— Напрыклад, у Кітаі займалася Тай-Чы, на Балі прайшла курс Віпасаны, а Малая Азія запомнілася яшчэ і такой садавінай, як дурыян. Ён вельмі карысны, але мае надзвычай непрыемны пах, нібы штосьці пратухла. З гэтай прычыны існуе нават афіцыйная забарона на яго перавозку.

***— Як атрымлівалася паразумецца з насельніцтвам?***

— Дапамагала англійская мова, жэсты, у В'етнаме пісалі шыльды, у Кітаі — нават іерогліфы. На Балі (і ў В'етнаме) было шмат турыстаў, якія ведалі рускую мову. Найцяжэй было ў Кітаі. Спачатку адчула шок. Пошук патрэбнага горада нагадваў гульню-рэбус, калі параўноўвала выяву іерогліфа на «Googlemaps» з шыльдай перад вачыма. Наконт мовы: у кітайскай ледзь не галоўную ролю адыгрываюць тоны. Таму, нават калі ведаеш нейкія словы, гэта можа не дапамагчы, бо адно і тое ж фанетычнае спалучэнне, сказанае не тым тананьем, прыводзіць да абсалютнага непаразумення ды разгубленасці.

## «Адзін кітаец вёз мяне 500 км да горада, у які не збіраўся ехаць»

***— У якой краіне быў найлепшы аўтастоп? Якую самую вялікую адлегласць праехала, не змяняючы машыны?***

— У Кітаі на платных трасах бывут самы хуткі аўтастоп. Не мяняючы машыны, пашчасціла праехаць амаль 800 кіламетраў.

***— Што дапамагала спыніць патрэбную машыну?***

— Вера ў дабрыню ды візуалізацыя. Уяўляла, як спыняецца машына ля мяне. Быў такі выпадак: уявіла вялікую белую машыну... і забылася пра гэта. А ўзгадала толькі пасля таго, як адзін кітаец вёз мяне 500 км да горада, у які сам не збіраўся ехаць. Наогул, кітайцы вельмі добразычлівыя: не раз прапаноўвалі накарміць і часам адвозілі не толькі ў патрэбны горад, а нават да патрэбнага дома. Чула такое: «Як ты стаіш тут пад дажджом? Як я мог бы праехаць міма?!» На ноч спынялася, загадзя дамовіўшыся пра начоўку праз сайт couchsurfing.com.

***— Ты казала, што займалася Тай-Чы ды Віпасанай...***

— Тай-Чы займалася ў будыйскім манастыры недалёка ад горада Далі ў Кітаі. Кожную раніцу мы прачыналіся пад гукі гонга і адпраўляліся на занятні. Раніцай трэба было зрабіць прабежку і на зваротнай дарозе пранесці на галаве камень, каб ён не ўпаў. Вельмі карысная практыка: як толькі мільгане думка — камень адразу ж падае. Прымушае знаходзіцца «тут і цяпер». За тыдзень, вядома, немагчыма спасцігнуць баявое мастацтва, хутчэй, толькі дакрануцца. Кожны дзень мы трэніраваліся па некалькі гадзін. У манастыры зусім не было сувязі ды электрычнасці. Вярнулася дамоў я са значна больш свежым і спакойным, чым да падарожжа, поглядам на свет.

Курс Віпасаны я прайшла на востраве Балі ў Інданезіі. На працягу 10 дзён трэба было знаходзіцца ў поўным маўчанні і гадзінамі навучацца мастацтву медытацыі. Гэтая практыка вучыць пераадольваць страхі. Спачатку мне здавалася, што столькі часу я не змагу адседзець не зварухнуўшыся. Затое напрыканцы курса разумееш, што нашы сілы бязмежныя і шмат магчымасцяў блакіруецца толькі праз тое, што мы не верым ва ўласныя сілы. Я працягваю практыкаваць Віпасану дома і адчуваю, што дзякуючы гэтаму стала спакайней і прасцей ставіцца да многіх рэчаў, якія раней маглі вывесці з сябе.

## Страціць квіток за $450, каб змяніць уласны лёс

***— Ці былі ў цябе, Наталля, спадарожнікі?***

— Менавіта ў горадзе Муйнэ напярэдадні адлёту пазнаёмілася з украінкай. З ёй мы і паехалі ў адваротны бок... Дарэчы, тут адбылося адно з самых моцных перажыванняў. Справа ў тым, што ў мяне быў даўно зарэзерваваны даволі дарагі квіток на самалёт, які каштаваў $450. Здаць яго за грошы было ўжо немагчыма. Вандраваць далей аўтастопам — гэта было рашэнне сэрца. А страта грошай — плата за тое, каб змяніць свой лёс. Гэта быў акурат той выпадак, калі чалавек прымае спантаннае рашэнне ў суладдзі з вібрацыямі свайго ўнутранага свету. І не пашкадавала, калі замест камфортнага самалёта выбрала зноў стаць на трасе з заплечнікам (і новай сяброўкай).

Падчас баўлення часу ў дарозе са сваёй новай сяброўкай з Украіны Наталля незаўважна перайшла на беларускую мову. І нядзіўна: украінская мова найбліжэйшая да нашай роднай.

**«Малая Азія запомнілася такой садавінай, як дурыян. Ён вельмі карысны, але мае надзвычай непрыемны пах, нібы штосьці пратухла. З гэтай прычыны існуе нават афіцыйная забарона на яго перавозку».**

***— Ці плануеш новае падарожжа?***

— Пакуль не. Адчуваю, што я павінна цяпер нешта зрабіць у сваёй краіне. Гэта зараз для мяне найважнейшая справа, важнейшая нават за само падарожжа.

***— А як бацькі адрэагавалі?***

— Я казала бацькам, што планую падарожжа. Але не казала, што аўтастопам. Даведаўшыся, яны былі не рады. Але, убачыўшы фотаздымкі, супакоіліся. Наогул, каб дасягнуць паразумення з бацькамі, галоўнае — трымаць з імі сувязь і раслумачыць ім ясна, навошта табе зараз патрэбна гэтая вандроўка. Пасля падарожжа сапраўды пачынаеш верыць у лёс і дабрыню людзей.

**Уладзімір ДРЫНДРОЖЫК.**




**«Застопілі» гарадскі аўтобус у Данангу, пазнаёміліся з мясцовымі бабулямі, спрабавалі выменяць у іх яблыкі на бананы.**

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 10 декабря 2015 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 20% после первых несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий, сооружений, передаточных устройств и оборудования, расположенных по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельхлебпром» на праве собственности**

**Лот №1**

| Наименование объекта | Адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|
| **Трансформаторная подстанция, инв. №330/С-21152** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74А | Назначение: сооружение специализированное энергетики. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 40,7 м.кв. | **12 756 293 760** | **300 000 000** |
| ***Земельный участок** на праве постоянного пользования площадью **0,0063 га** с кадастровым номером 323550100006000767. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |
| **Мазутонасосная, инв. №330/С-11451** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/2 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 100,4 м.кв. | | |
| **Помещение для соли, инв. №330/С-11450** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/1 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 74,6 м.кв. **Здание сдано в аренду сроком по 14.01.2017 г.** | | |
| **Здание склада инвентаря и оборудования, инв. №330/С-11449** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/6 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1985 г. постройки. Общая площадь 196,5 м.кв. *Составные части и принадлежности: тамбур* | | |
| **Сухарный цех с пристройкой и подсобным корпусом, инв. №330/С-11453** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/3 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1954 г. постройки. Общая площадь 925,1 м.кв. *Составные части и принадлежности: тамбур, пристройка к сухарному цеху, подсобный корпус, рампа с навесом, площадка с крыльцом, крыльцо, отмостка* | | |
| **Здание главного производственного корпуса, инв. №330/С-11447** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Трехэтажное строение, 1955 г. постройки. Общая площадь 2171,2 м.кв. **Части здания общей площадью 384,78 сданы в аренду максимальным сроком по 12.05.2017 г.** | | |
| **Сооружения** | Ворота выездные, две дымовые трубы, ворота на весовую, ворота аварийного выезда, ограждение, ограждение металлическое, площадка с ограждением для песка, бетонная площадка, благоустройство территории (асфальтированное покрытие) | | | |
| **Передаточные устройства** | Сети канализационные, инв. № 330/С-22386; наружные сети канализационные, инв. № 330/С-22383; наружные сети водопроводные, инв. № 330/С-22384; внеплощадочные сети вдопроводные, инв. № 330/С-22385; сеть наружного освещения, слаботочная электрическая сеть, низковольтная электрическая сеть | | | |
| ***Земельный участок** на праве постоянного пользования площадью **1,2982 га** с кадастровым номером 341500000006000008. На указанном земельном участке **расположено сооружение специализированное гражданской обороны с инв. № 330/-20619,** общей площадью **164,9 м.кв.,** находящееся в собственности Республики Беларусь. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |
| **Оборудование** | Силос для склада БХМ – 12 единиц, котлоагрегат Е-1/9 – 3 единицы, деаэрационный бак, деаэрационная колонна, весы автоматические. Электрические щиты и приборы: трансформатор ТМ400 – 2 единицы, ячейка КСО 366 – 2 единицы, регулятор реактивной мощности, теплосчетчик. | | | |
| Шаг аукциона – 5%. Цель использования Объектов – за исключением производства хлебобулочных и кондитерских изделий | | | | |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 09 декабря 2015 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **10 декабря 2015 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 28 ноября 2015 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 0,5% от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» № 203 от 21.10.2015 г.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гомельхлебпром», г. Гомель, ул. Интернациональная, 8. ☎ 8 (0232) 21-50-33; 21-50-34 •**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Барановичский завод станкопринадлежностей», Брестская область, г. Барановичи, ул. Пролетарская, 40** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Инвентарный номер | Общая площадь |
|---|---|---|---|
| Корпус вспомогательных цехов | Производственное помещение | 110/D-2757899 | 2938,6 кв.м |

В состав предмета аукциона входят **электрокран-балки** (4 шт.)

**Месторасположение предмета аукциона:** Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, 40-1

**Начальная цена с НДС 20% – 7 346 880 960 белорусских рублей (снижена на 20%)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 25.09.2015**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **11.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **10.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 4287676, 8686356, 0922651, 8681324, 8679387, 8684269, 0286142, 8672039, 8688112 и полис по добровольному страхованию от несчастных случаев (2РН, 2РП) серии НС № 0019761. УНП 100782388

---

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## (о проекте строительства многоэтажного жилого дома, не относящегося к жилым домам повышенной комфортности с помещениями общественного и административного назначения и подземной гараж-стоянкой в квартале ул. Лынькова – П. Глебки – проезд Масюковщина.)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «КварталМЗС-Строй», расположенное по адресу: г. Минск, пер. Козлова, д. 7 «Б», ком. 300, режим работы: понедельник –пятница – 9.00–18.00, обед – 13.00 – 14.00, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191702269 решением Мингорисполкома от 30.12.2011 г.

В течение последних трех лет застройщик не осуществлял строительство жилых домов.

**Информация об объекте строительства:**

Цель строительства – ввод в эксплуатацию объекта: «Многоэтажный жилой дом, не относящийся к жилым домам повышенной комфортности, с помещениями общественного и административного назначения и подземной гараж-стоянкой в квартале улиц Лынькова – П.Глебки – проезда Масюковщина».

**Этапы и сроки реализации строительства:**

Начало строительства жилого дома – **03 сентября 2014 г.**, нормативный срок строительства – **19 месяцев**.

**Государственная экспертиза проектной документации:**

экспертное заключение №166-8-2009, выданное 15.01.2009 г. и № 225-60/14, выданные 06.05.2014 г. Дочерним Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза по г. Минску».

**Местонахождение строящегося многоэтажного жилого дома:**

Местоположение объекта – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом в квартале улиц Лынькова – П.Глебки – проезда Масюковщина».

**Характеристика строящегося многоэтажного жилого дома:**

196-квартирный 15-этажный жилой дом, состоит из 2-х секций, с техподпольем и теплым техническим чердаком со встроенными помещениями товарищества собственников и помещениями общественного и административного назначения на 1-ом этаже. Кровля – рулонная с организованным внутренним водостоком. Отопление и горячее водоснабжение осуществляется от городских сетей. Система поквартирного отопления – горизонтальная двухтрубная. В качестве нагревательных приборов приняты стальные радиаторы. Регулировка теплоотдачи приборов осуществляется термостатическими вентилями с термостатическими головками. Коммерческий учет тепла осуществляется теплосчетчиком, установленным в узле ввода теходполья. Регулирование автоматического отпуска тепла осуществляется в тепловом пункте. Поквартирный учет тепла осуществляется индивидуальными счетчиками. Для поквартирного учета горячей и холодной воды предусмотрена установка индивидуальных счетчиков. На каждую квартиру предусмотрен электронный многотарифный электросчетчик. Окна в доме из ПВХ-профиля с двойными стеклопакетами. Остекление лоджий исполняется из ПВХ-профиля с одинарным остеклением. Для организации кабельного телевидения и сети интернет проектом предусматривается прокладка волоконно-оптического кабеля (ВОКС) от существующего телекоммуникационного шкафа Минских телевизионных информационных сетей, расположенного по улице Лынькова до жилого дома с установкой оптических узлов. Телефонная сеть организована путем прокладки волоконно-оптического кабеля (ВОКС) от АТС Минских городских телефонных сетей до оптического шкафа дома, далее прокладкой оптоволоконных распределительных кабелей в квартиры. Транспортное обслуживание жилого дома предусмотрено от существующей транспортной городской системы с ул. Лынькова. Для жилого дома предусматривается система дымоудаления из общих поэтажных коридоров жилого дома, системы подпора воздуха в лифтовые шахты при пожаре. В здании запроектирована кольцевая сеть водопровода с установкой пожарных кранов. Каждая секция дома оборудована 2-мя лифтовыми установками грузоподъемностью 400 кг, 630 кг. Жилой дом оборудован домофонной связью.

**Количество квартир в доме** – 196 шт.

Общее количество квартир в секции №1 – 98 квартир, из них:

- 28 – однокомнатных квартир площадью 50,27 м$^2$
- 56 – двухкомнатных, в том числе:
- 14 квартир по 63,24 м$^2$
- 14 квартир по 66,22 м$^2$
- 7 квартир по 67,91 м$^2$
- 1 квартира по 68,61 м$^2$
- 11 квартир по 70,05 м$^2$
- 2 квартиры по 70,55 м$^2$
- 4 квартиры по 71,52 м$^2$
- 3 квартиры по 71,85 м$^2$
- 14 – трехкомнатных квартир площадью 89,65 м$^2$.

Общее число квартир в секции №2 – 98 квартир, из них:

- 28 – однокомнатных квартир площадью 50,27 м$^2$
- 56 – двухкомнатных, в том числе:
- 14 квартир по 63,24 м$^2$
- 14 квартир по 66,22 м$^2$
- 7 квартир по 67,91 м$^2$
- 1 квартира по 68,61 м$^2$
- 11 квартир по 70,05 м$^2$
- 2 квартиры по 70,55 м$^2$
- 4 квартиры по71,52 м$^2$
- 3 квартиры по 71,85 м$^2$
- 14 – трехкомнатных квартир площадью 89,65 м$^2$.

На первом этаже дома располагаются помещения административного и общественного назначения в количестве 13 шт. и помещение товарищества собственников.

Согласно решению Мингорисполкома строительство жилых помещений будет осуществлено с привлечением граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий из расчета 5% от общей площади жилых помещений многоэтажного дома.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства:**

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается всего **116 (сто шестнадцать)** квартиры, из них:

- **35 однокомнатных** за №№ 17, 24, 31, 52, 53, 60, 66, 67, 73, 74, 81, 88, 94, 95, 102, 109, 110, 130, 131, 137, 138, 144, 145, 151, 152, 159, 165, 166, 172, 173, 180, 186, 187, 193 и 194 общей площадью 50,27 м$^2$ жилой площадью 18,93 м$^2$;
- **12 двухкомнатных** за №№ 33, 75, 82, 89, 96, 136, 157, 164, 171, 178, 185 и 192 общей площадью 63,24 м$^2$ жилой площадью 32,03 м$^2$;
- **18 двухкомнатных** за №№ 7, 14, 42, 70, 77, 84, 91, 98, 99, 127, 134, 141, 155, 162, 169, 176, 183 и 190 общей площадью 66,22 м$^2$ жилой площадью 31,73 м$^2$;
- **9 двухкомнатных** за №№ 51, 58, 65, 125, 132, 139, 146, 160 и 167 общей площадью 67,91 м$^2$ жилой площадью 35,14 м$^2$;
- **5 двухкомнатных** за № 79, 93, 181, 188 и 195 общей площадью 71,52 м$^2$ жилой площадью 35,14 м$^2$;
- **13 двухкомнатных** за №№ 13, 20, 34, 41, 48, 55, 69, 114, 121, 128, 149, 163 и 170, общей площадью 71,05 м$^2$ жилой площадью 38,31 м$^2$;
- **3 двухкомнатных** за №№ 72, 111 и 174 общей площадью 70,55 м$^2$ жилой площадью 35,14 м$^2$;
- **6 двухкомнатных** за №№ 83, 90, 97, 177, 184 и 191 общей площадью 71,85 м$^2$ жилой площадью 38,31 м$^2$;
- **1 двухкомнатная** за № 118 общей площадью 68,61 м$^2$ жилой площадью 35,14 м$^2$;
- **14 трехкомнатных** за №№ 36, 43, 50, 71, 78, 85, 92, 140, 147, 154, 175, 182, 189 и 196 общей площадью 89,65 м$^2$ жилой площадью 51,60 м$^2$.

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость одного квадратного метра общей площади жилого помещения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий с учетом всех затрат и вознаграждения застройщика, составляет:

Для однокомнатных квартир – **1300** долларов США;

Для двухкомнатных квартир – **1200** долларов США;

Для трехкомнатных квартир – **1150** долларов США.

Действует система скидок. Первый взнос составляет 20 – 30% от общей стоимости квартиры и вносится в течение 10 (десяти) банковских дней с момента регистрации договора.

Оставшаяся сумма денежных средств вносится по согласованному сторонами графику.

Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра жилого помещения в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора.

Изменение цены объекта долевого строительства производится в одностороннем порядке по инициативе Застройщика в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» если установленная договором площадь объекта долевого строительства увеличится или уменьшится на 1 (один) процент и более.

Цена, определенная настоящей проектной декларацией на указанные в ней объекты долевого строительства, считается действительной по ним до момента опубликования новой декларации.

**Права застройщика на земельный участок:**

решение Минского районного исполнительного комитета (Минский райисполком) от 02 апреля 2015 г. №334 «О предоставлении в постоянное пользование земельного участка общей площадью 0,2445 га., и во временное пользование земельного участка общей площадью 0,4863 га. для строительства и обслуживания многоэтажного жилого дома, не относящегося к жилым домам повышенной комфортности, с помещениями общественного и административного назначения и подземной гараж-стоянкой в квартале улиц Лынькова – П.Глебки – проезда Масюковщина», а также земельного участка в постоянное пользование общей площадью 0,0680 га для строительства гараж-стоянки; свидетельство о государственной регистрации прав на земельный участок №500/1572-2670, №500/1572-2672 и №500/1572-2669 от 14 мая 2015 г.

**Элементы благоустройства:**

Территория проектируемого объекта обеспечена непрерывной сетью благоустроенных пешеходных путей и зон, которая включает тротуары по основным направлениям движения пешеходных потоков. В местах пересечения пешеходных путей с проезжей частью устроены участки с пониженным бортом высотой не более 0,02 м для безбарьерного передвижения инвалидов, лиц, пользующихся креслами-колясками, престарелых и взрослых с детскими колясками. Предусмотрены парковки в количестве 2-х машиномест для спецавтотранспорта для инвалидов с нарушением функций опорно-двигательного аппарата, включая передвигающихся на креслах – колясках. Для маломобильных групп населения запроектированы пандусы и электромеханические подъемные платформы типа ПВ 450 («Гомельлифт», РБ).

Проектом предусмотрено полное благоустройство территории с организацией подъезда, парковками общей вместительности на 39 машино-мест, подземной гараж-стояной на 16 машино-мест, тротуаром для пешеходов, дорожки и площадки к жилому дому из бетонной плитки. На территории строительства жилого дома запроектирована площадка для чистки вещей, площадка для крупно-габаритного мусора. Детская игровая площадка располагается на близлежащей территории. Территория оборудуется малыми формами архитектуры.

**Имущество, передаваемое застройщиком дольщикам после ввода жилого дома в эксплуатацию:**

помещение товарищества собственников, техподполье дома предназначено для размещения инженерных сетей, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

**Предполагаемый срок ввода многоэтажного жилого дома в эксплуатацию:**

28 февраля 2016 года.

**Договор строительного подряда:**

договор строительного генподряда №17-03/14 от 17.03.2014 г., заключен Застройщиком с обществом с ограниченной ответственностью «ИСМД-СтройСервис».

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**

Прием заявлений от граждан и юридических лиц осуществляется по месту нахождения ООО «КварталМЗС-Строй», г. Минск, пер. Козлова, д. 7 «Б», комн. 300, понедельник – четверг с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Время приема предварительно согласовывается по телефонам: велком 8029-171-02-40; гор. 299-55-28.

Застройщиком заключены договора на оказание риэлтерских услуг (поиск дольщиков и заключение договоров долевого строительства):

№11/2 от 30.01.2015 г. с ОДО «Твоя столицаконсалт», которое расположено по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 68 – 127. Прием заявлений от граждан осуществляется по месту нахождения ОДО «Твоя столицаконсалт»: понедельник – пятница с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней, тел. 215-00-31.

№159/2 от 16.04.2015 г. с ООО «Дианэст-Стройинвест», которое расположено по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д.1, офис 1327-1328. Прием заявлений от граждан осуществляется по месту нахождения ООО «Дианэст-Стройинвест»: понедельник – пятница с 9.00. до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней, тел. 268-44-13.

№143/3 от 15.04.2015 г. с ЧУП «Дианэст», которое расположено по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, к. 2402. Прием заявлений от граждан осуществляется по месту нахождения ЧУП «Дианэст»: понедельник – пятница с 9.00 до 13.00 и с 14.00. до 17.00, кроме выходных и праздничных дней, тел. 256-17-94.

№38/4 от 31.03.2015 г. с ООО «РиэлтХаус», которое расположено по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, д. 8А, пом. 1п. Прием заявлений от граждан осуществляется по месту нахождения ООО «РиэлтХаус»: понедельник – пятница с 9.00. до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней, тел. 203-69-01.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ООО «КварталМЗС-Строй» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:**

Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе ОДО «Твоя столицаконсалт», г. Минск, пр-т Независимости, 68 – 127, тел. 215-00-31, а также в офисе застройщика – ООО «КварталМЗС-Строй», г. Минск, пер. Козлова, д. 7 «Б», комн. 300, время приема предварительно согласовывается по телефонам: велком 8029-171-02-40; гор. 299-55-28.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ
№ 11 (19)









Фота Надзеі БУЖАН.

# «СЯМЕЙНЫ ГВАЛТ — ПРАБЛЕМА АГУЛЬНАЯ»

## За дзесяць месяцаў бягучага года ад сямейнага гвалту ў нашай краіне загінулі 96 чалавек

Такая статыстыка. Але за кожнай лічбай стаіць чалавечы лёс, перарванае жыццё, мары і спадзяванні на будучыню, якія так раптоўна абарваліся, а ўсё магло быць інакш...

— У нас многія і дагэтуль жывуць паводле старых правілаў накшталт «б'е — значыць любіць», «хто каго любіць, той таго і чубіць», а завяршаецца ўсё тым, што «не трэба выносіць смецце з хаты», — адзначае **Алег КАРАЗЕЙ, начальнік упраўлення прафілактыкі Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Беларусі.** — Аднак лік ахвяр ідзе на дзясяткі. У 2015 годзе зарэгістравана 2100 хатніх злачынстваў. Да адміністацыйнай адказнасці прыцягнулі 42 тысячы чалавек. У палове з агульнай колькасці выклікаў, якія паступілі да нас, пацярпелая ў выніку даруе свайму крыўдзіцелю. Жанчыны такім чынам спрабуюць выратаваць сям'ю, думаюць пра дзяцей, а мы заклікаем найперш падумаць пра сітуацыю, у якой яны апынуліся. Ужо даказана, што гвалт у сям'і з'яўляецца цыклічным. Так, у першы час пасля канфлікту агрэсар будзе адчуваць сваю віну, выбачацца. Яму сорамна. Многія падобнае бачаць, пасля даруюць, і палова спраў спыняецца. Але калі чалавек не зробіць правільных высноў, ёсць гарантыя, што ён ударыць яшчэ раз.

У агульнай карціне злачынстваў жанчыны вінаваты толькі ў пяці працэнтах выпадкаў. У праваахоўным ведамстве лічаць, што паказчык невялікі. Праўда, калі гутарка заходзіць аб забойствах, статыстыка адразу мяняецца. Жанчыны, пераважна адчуваючы пагрозу жыццю, магчымыя цялесныя пабоі, здзяйсняюць кожнае трэцяе забойства.

Каб ізаляваць хатніх агрэсараў ад сям'і, мінімізаваць пагрозу, дзяржава летась зацвердзіла так званае абаронае прадпісанне, дадатковую меру па барацьбе з гвалтам у сям'і. Падобны дакумент ад 3 да 30 сутак можа забараніць агрэсару не проста знаходзіцца з пацярпелымі ў адной кватэры, але і кантактаваць з імі праз тэлефон і інтэрнэт. Як відаць, падобная мера сярод дэбашыраў карыстаецца попытам. Сёлета за дзесяць месяцаў у дачыненні да тых, хто зняважыў блізкіх, прымянілі 1128 абаронных прадпісанняў. У тым ліку 919 з опцыяй «пакінуць агульную жылую плошчу».

Сексуальныя злачынствы ў сям'і ў дачыненні да няпоўнагадовых прагназуюць заставацца латэнтнымі. І яны складаюць трацiну ад усіх спраў. Як заўважыў Алег Каразей, выпадкі сведчаць, што мэтанакіравана, цягам 2-3 гадоў дзяцей гвалцяць, здзекуюцца з іх, часцяком не кроўныя бацькі, а айчымы, сужыцелі маці, прыёмныя.

— Мы заклікаем усіх, хто становіцца сведкам хатняга гвалту ў сем'ях сваякоў, сяброў, знаёмых, не замоўчваць падобныя факты, а паведамляць пра іх, не лічыць, што гэта справа толькі сям'і, — прапаноўвае Алег Каразей. — Гэта агульная праблема грамадства. І звяртацца трэба па дапамогу.

**Алена КОМЛІК, галоўны спецыяліст аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны,** паведаміла, што абарону пацярпелым ад сямейнага гвалту аказваюць у тым ліку ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Іх у нас — 148. У тым ліку дзейнічаюць два гарадскія цэнтры сацыяльнай дапамогі сям'і і дзецям, у структуру якіх уваходзяць аддзяленні сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі, «крызісныя пакоі».

— Калі 20 гадоў таму мы актыўна казалі аб неабходнасці стварэння першай сістэмы аказання дапамогі ў выпадках гвалту ў сям'і, сёння мы робім акцэнт на паляпшэнні якасці прадастаўленых паслуг, — лічыць **Вольга ЯНЧУК, генеральны сакратар Беларускай асацыяцыі маладых хрысціянскіх жанчын.** — На гэты момант у Беларусі на базе грамадскіх і дзяржаўных арганізацый аказваецца шырокі спектр паслуг на прадухіленні хатняга гвалту. Адпрацоўваюцца міжведамасныя механізмы комплекснага рэагавання на такія выпадкі, аднак гэтая работа носіць несістэмны характар, і часцяком пакутуе яе якасць праз адсутнасць адпаведнага навучання спецыялістаў, прадастаўленне некаторых паслуг выключна ў працоўны час.

Тым часам у Беларусі ўжо стартавала «аранжавая» кампанія па прадухіленні гвалту ў адносінах да жанчын. Яна працягнецца да 10 снежня. **Агнія АСАНОВІЧ, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю фонду ААН у галіне народанасельніцтва,** паведаміла, што ў нашай краіне пройдзе цэлы комплекс тэматычных мерапрыемстваў. Вадзіцелям у Мінску, Брэсце, Барысаве, Гродне, Смаргоні супрацоўнікі ДАІ ўжо раздаюць аранжавыя стужачкі — сімвал акцыі, а 4 снежня Нацыянальная бібліятэка ў знак барацьбы з гвалтам загарыцца аранжавым колерам. На 8 снежня ў рамках кінафестывалю, прысвечанага правам чалавека, у кінатэатры «Перамога» запланаваны паказ фільма «Чужая», па тэме гвалту над жанчынамі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

### Куды званіць, калі адчуў праблему?

8 801 100 8 801 — агульнанацыянальная лінія для пацярпелых ад хатняга гвалту. Са стацыянарнага тэлефона званок бясплатны, з мабільнага — па тарыфах аператара.

■ Спецыяльны рэпартаж

# ЭКСПЕРЫМЕНТ НА ДОБРАСУМЛЕННАСЦЬ

## Карэспандэнты «Звязды» разам з супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі праверылі, як беларускія аўтамабілісты падрыхтаваліся да зімы



Снежань сустракае нас не толькі халодным надвор'ем, але і абмежаваннямі для вадзіцеляў. З 1 снежня ўступаюць у сілу меры, якія прадугледжваюць абавязковае абсталяванне аўтамабіляў зімовымі шынамі. У іншым выпадку вадзіцелю давядзецца заплаціць штраф.

— Меры, прынятыя год таму, сапраўды дзейсныя, — кажа **Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС.** — Раней была цэлая праблема. Як толькі надыходзіў «дзень бляхара», мы фіксавалі аварыю за аварыяй. І пры складанні пратаколаў дарожна-транспартнага здарэння адсутнасць зімовых шын на колах адлюстроўвалася ў дакуменце як абцяжваючая віну акалічнасць. Ну а зараз людзі ўжо праінфармаваны. Многія «пераабуваюць» машыны загадзя. Мой муж гэта зрабіў яшчэ ў сярэдзіне кастрычніка. Варта дадаць, што зараз на тэрыторыі Беларусі праводзіцца акцыя «Жыццё даражэйшае, чым шыны». Сэнс яе ў тым, што да першага чысла мы распавядаем пра неабходнасць выкарыстання зімовых шын, а з першага па чацвёртае снежня будзем актыўна штрафаваць нядобрасумленных аўтамабілістаў.

Шыны мусяць быць абазначаны значком у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і сняжынкай у сярэдзіне альбо знакамі «M+S», «M&S», «M.S», «M S» ці «All seasons».

Ганна Банадык напярэдадні снежня настойліва раіць не толькі «пераапрануць» колы, але і праверыць гатоўнасць аўто да зімы.

— Абавязкова праверце тармазную сістэму, акумулятар, — раіць суразмоўніца. — Звярніце ўвагу на спраўнасць сістэмы ацяплення, запоўніце бачок абмывальніка лабавога шкла незамярзаючай вадкасцю. Пры магчымасці ўсталявіце новыя шклоачышчальнікі, каб агляд быў нармальны. І, безумоўна, па слізкай дарозе рухайцеся з невялікай хуткасцю без рэзкіх манеўраў і тармажэнняў. Ну, а галоўнае — сумленнае кіраванне і выкананне правіл дарожнага руху. Адна замена шын ад дарожна-транспартных здарэнняў не выратуе.



...Траса Гродна — Мінск, паваротка на вёску Аксакаўшчына. Старшыя інспектары спецпадраздзялення ДПС «Страла» МУС Іван Казлоў і Вадзім Базылеў кантралююць хуткасць дарожнага руху. Разпораз спыняюць тых, хто перавысіў яе, выпісваюць штраф і па нашай просьбе правяраюць, ці «пераабулі» аўтамабілісты свой транспарт.

— Я мяркую, што на трасе большасць машын будзе ўжо ўкамплектавана зімовымі шынамі, — кажа старшы інспектар Іван Казлоў. — Падобная праблема больш характэрна для глыбінкі, невялічкіх населеных пунктаў, дзе людзі выкарыстоўваюць аўтамабіль, каб з'ездзіць у краму і вярнуцца дадому.

Прадказанне інспектара спраўдзілася на ўсе сто працэнтаў! Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі спынілі больш за 10 аўтамабіляў, і ўсе яны былі «пераабуты».

— Я яшчэ месяц таму «гуму» памяняла, — кажа Вераніка, уладальніца серабрыстага «Опеля». — Ведала пра ўступленне ў сілу закона, але зрабіла гэта толькі з прычыны ўласнай бяспекі.

— Як толькі тэмпература стала ніжэйшай за пяць градусаў, адразу памяняў шыны, — адзначае яшчэ адзін добрасумленны аўтамабіліст.

Мы ўжо амаль страцілі надзею сустрэць на дарозе безадказнага кіроўцу, як у агарадку Наваселле ўбачылі машыну з транзітнымі нумарамі на летніх шынах. Аднак уладальнік аўто запэўніў, што на заўтра запланаваў «пераабуць» свой транспартны сродак. Каб яшчэ раз пераканацца ў адказнасці нашых аўтамабілістаў, мы на адваротным кірунку выйшлі на стаянцы ў раёне Каменнай Горкі і агледзелі яшчэ тузін прыпаркаваных машын. І толькі дзве з іх былі на летняй гуме. Шчыра кажучы, прыемна адчуваць, што большасць з нашых суайчыннікаў вырашыла паклапаціцца пра сваё аўто загадзя. Ну а тым, хто яшчэ шыны не памяняў, нагадаем: варта зрабіць гэта як мага хутчэй. Да пачатку снежня застаецца ўсяго два дні.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

## Новая зала для гісторыі міліцыі

**Добры падарунак атрымала магілёўская міліцыя напярэдадні Дня ўшанавання ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь. Адбылося ўрачыстае адкрыццё абноўленай залы гісторыі магілёўскай міліцыі, рэканструяванай спецыялістамі таварыства «Будпраектінвест».**

— Магілёўскі абласны савет ветэранаў актыўна займаецца захаваннем гісторыі міліцыі і аднаўленнем светлай памяці супрацоўнікаў, якія загінулі пры абароне нашай Радзімы ў гады вайны і ў мірны час, — адзначыў у сваёй прамове **першы намеснік начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама, начальнік крымінальнай міліцыі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ.** — Летась была адкрыта галерэя партрэтаў начальнікаў УУС Магілёўскага аблвыканкама, сёлета ў маі абноўлены памятны знак з імёнамі загінулых пры выкананні службовага і воінскага доўгу. А сёння мы адкрываем залу гісторыі магілёўскай міліцыі, экспанаты якой напоўнены прыкладамі мужнасці і самаахвярнай адданасці справе, гераізму і адвагі.

У святочным мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі міліцыі з усёй вобласці, вайскоўцы тэрміновай службы в/ч 6713. Ветэраны атрымалі ўзнагароды МУС, а маладыя прадаўжальнікі іх справы першыя афіцэрскія пагоны з рук ветэрана — генерал-маёра міліцыі Барыса Алданава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Ведай нашых!

# З ІНСПЕКТАРАМ... ПА ДУШАХ

**У Магілёве адзначылі найбольш актыўных у сваёй справе ўчастковых.**

— Сёння, калі тэрарызм пагражае спакою мірных людзей, нам даводзіцца быць асабліва пільнымі і асцярожнымі, — падкрэсліў **намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі ГУАПП МУС Рэспублікі Беларусь палкоўнік міліцыі Сяргей КРАСУЦКІ.** — Не трэба стаяць на месцы, мы павінны займацца ўдасканаленнем нашай працы. Прыярытэтным кірункам павінна стаць супрацоўніцтва з людзьмі, якія маюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Трэба працаваць на апераджэнне злачынства.

Прыемна, што ўклад «Звязды» ў агульную справу таксама быў адзначаны. У конкурсе на найлепшую публікацыю аб дзейнасці ўчастковых інспектараў міліцыі і ўчастковых інспектараў па справах непаўналетніх дыпломам першай ступені Міністэрства ўнутраных спраў адзначана спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» па Магілёўскай вобласці Нэлі Зігуля. Найлепшым прызнаны матэрыял пра аднаго з вопытных прафесіяналаў сваёй справы старшага ўчастковага Магілёўскага РАУС Аляксандра Радкевіча «Размова з інспектарам... па душах», які быў апублікаваны на старонках газеты 25 мая.

**Ул. Інф**



Фота Алены ІГНАТАВАЙ.

**Сяргей Красуцкі ўручае дыплом намесніку начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Магілёўскага аблвыканкама маёру міліцыі Алене Бегуновай.**

■ Навіны 102

## АД ВІСКІ ДА ЦЫГАРЭТ

**Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі канфіскавалі ў жыхара сталіцы тавары на суму звыш 400 мільёнаў рублёў.**

Як паведаміла Вераніка Пасмеццева, старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС, алкаголь (аб'ём 398 літраў) захоўваўся без кантрольных ідэнтыфікацыйных знакаў РБ і вызначаных заканадаўствам суправаджальных дакументаў. У правапарушальніка таксама канфіскавалі 79 флаконаў туалетнай вады, 428 пачак цыгарэт. Падчас рэйду было высветлена, што мінчанін рэалізоўваў і захоўваў алкагольныя напоі ў аўтамабілі і кватэры. У дачыненні да яго склалі пратакол за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Правапарушальніку пагражае штраф памерам да 100 базавых велічынь.

## ПАСЛЯ ЗГВАЛТАВАННЯ КРАЎ ЗОЛАТА І ГРОШЫ

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў затрымалі падазраванага ў серыі гвалтаванняў і іншых злачынстваў у дачыненні да жанчын.**

Як паведамілі ў МУС, яны маглі быць здзейснены на працягу 20 гадоў (з 1994-га па 2015-ы), як правіла, уздоўж чыгуначных пуцей і аўтамабільных дарог. У некаторых выпадках мужчына пагражаў нажом і пасля гвалту краў у ахвяр залатыя ўпрыгажэнні і грошы.

На пэўны час гвалтаванні спыніліся, але ў кастрычніку 2014 года ў Брэсцкай вобласці зноў згвалтавалі жанчыну. Раскрыццё злачынстваў узялі на кантроль у МУС. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку разам з калегамі са Следчага камітэта правялі вялікую работу. Паралельна ад праваахоўнікаў з Расіі паступіла інфармацыя, што ў Санкт-Пецярбургу выявілі аналагічнае з беларускімі злачынства, да якіх можа мець дачыненне гвалтаўнік з Беларусі. І ў выніку аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў 1 лістапада ў Брэсцкай вобласці затрымалі падазраванага. Ім аказаўся 44-гадовы грамадзянін Расіі, які ў апошні час жыў у Санкт-Пецярбургу і працаваў вадзіцелем. Як аказалася, ён проста прыязджаў у Беларусь на пабыўку да сваякоў і ўчыняў гвалт.

Характэрная прыкмета затрыманага — штучны зуб з металу ў верхняй сківіцы. Часам насіў заручальны пярсцёнак або пячатку. Мог казаць, што яго завуць Сяргей. Не ўсе пацярпелыя звярталіся да праваахоўнікаў. І міліцыя просіць ахвяр, іншых людзей, якія валодаюць якой-небудзь інфармацыяй аб злачыннай дзейнасці грамадзяніна, адлюстраванага *на фота*, паведаміць аб гэтым па тэлефонах: (017) 218 52 75 ці (029) 391 11 15. Ананімнасць гарантуецца.



Матэрыялы выпуску падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■ Асоба

# «МІЛІЦЫЯНЕР ПАВІНЕН БЫЦЬ ДОБРЫМ ПСІХОЛАГАМ»

**Аляксандр АЛЯКСАНДРАЎ — асоба для сталічнай міліцыі значная. Амаль усё сваё жыццё ён прысвяціў крымінальнаму вышуку. Не цураўся самых складаных спраў і за сваю прафесійную дзейнасць быў узнагароджаны медалямі, нагруднымі знакамі. Такім людзям на інтэрв'ю спецыяльна рыхтавацца не трэба. Іх насычанае жыццё літаральна знітавана цікавымі гісторыямі. Вось з такіх аповедаў і склалася наша размова з Аляксандрам Георгіевічам.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### «У дзяцінстве абясшкодзіў дзве супрацьтанкавыя міны»

***— Растлумачце мне для пачатку вось якую рэч. Як у вас атрымалася са свідравальшчыка аднаго з заводаў перакваліфікавацца ў міліцыянера?***

— Найперш дзякуючы таму, што гэта была мая мара. На завод пайшоў, як мне падаецца, з прычыны таго, што ў школе на класнай гадзіне добра маляваў фантастычныя машынкі. Усе з зацікаўленасцю глядзелі на падобнае дзіва. Тэхніка мяне цікавіла, але я гуманітарый, з дакладнымі навукамі праблем у мяне хапала. Ужо тады я хацеў насіць пагоны. У дзяцінстве нядрэнна выразаў пісталеты, аўтаматы з дрэва. Акрамя таго, у пасляваенныя гады мы шмат знаходзілі зброі, здавалі ў вайсковую часць гранаты. Я нават навучыўся размініраваць міны і дзве супрацьтанкавыя ў шостым класе абясшкодзіў самастойна. У 1967-м паступіў на юрыдычны факультэт БДУ. Але працаваць якім-небудзь юрысконсультам мне было не надта цікава, і я замучыў бацьку, які працаваў выкладчыкам у школе міліцыі, пытаннем, як стаць праваахоўнікам. У рэшце рэшт апынуўся ў школе міліцыі імя Фрунзэ, якую скончыў у 1971 годзе, а ўніверсітэт — праз два гады. Пасля завяршэння вучобы ў міліцэйскай школе мяне і размеркавалі на працу ў крымінальны вышук упраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама — і мая мара здзейснілася. У 22 гады я стаў самым маладым лейтэнантам Беларусі. У міліцыі адпрацаваў да 1994-га, сышоў на пенсію ў званні падпалкоўніка, а зараз з'яўляюся намеснікам старшыні гарадской арганізацыі ветэранаў органаў унутраных спраў.

***— Ці памятаеце сваю першую справу?***

— Помню першае затрыманне злачынцы. Гэта здарылася, калі я быў яшчэ курсантам. У фае Палаца спорту часта ладзілі танцы, і нас туды накіравалі на стажыроўку да ўчастковага. Танцавальная праграма ўжо завяршылася. Людзі разыходзіліся. І тут бачым, як група людзей сутыкнулася з хлопцам, адбылася замінка. Тыя далей пайшлі, а гэты застаўся стаяць разгубленым — абрабавалі. Ну, мы адразу кінуліся за імі. Затрымалі якраз на той пляцоўцы, дзе зараз ладзяць кірмашы. Што да крымінальнага вышуку, я напачатку самастойна справы весці не мог: выконваў разнастайныя даручэнні. Напрыклад, у аэрапорце «Мінск-1» тры дні запар перабіраў карашкі білетаў, шукаў неабходнае прозвішча. Вы ўявіце, што гэта такое! У той час усе самалёты ляталі з «Мінск-1». І не толькі ў іншыя рэспублікі Савецкага Саюза, але і ў абласныя цэнтры Беларусі. І гэтых карашкоў былі тысячы, але патрэбны я ўсё роўна знайшоў. Праз нейкі час апынуўся ў аддзяленні спецслужбы Упраўлення ўнутраных спраў па барацьбе са злачынствамі замежнікаў і супраць замежнікаў. Фарцоўка, наркотыкі, валютныя аперацыі, прастытуцыя — з усім гэтым я працаваў.

***— Гасцініца «Юбілейная», напэўна, тады «гудзела».***

— Так, менавіта большасць валютных прастытутак і фарцоўшчыкаў былі каля гэтай гасцініцы, яшчэ каля крамы «Алеся», пры цырульнях, рэстаранах. Чым больш у нас з'яўлялася замежнікаў, тым большым да іх быў інтарэс. Прастытуцыяй і фарцой займаліся адначасова. Жанчыны лёгкіх паводзінаў набывалі ў іншаземцаў валюту і адзенне. Памятаю, як у гасцініцу «Турыст» засялілі палякаў. У іх была добра наладжаная сістэма. Яны з'язджалі на экскурсію і на ложках пакідалі вопратку з пазначанымі коштамі. У нумары прыходзілі прыбіральшчыцы, выбіралі неабходныя рэчы, пакідалі грошы і сыходзілі. Зараз па-чалавечы ўсё гэта разумееш. Дзе мы маглі тады купіць джынсы? Тым больш па зніжаным кошце. Але закон ёсць закон, і яго трэба было выконваць.

***— Але фарцавалі тады наогул многія?***

— Вось вам адзін прыклад. У Раўбічах праходзіў чэмпіянат свету па біятлоне. І вядомы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Ціханаў набыў падчас спаборніцтваў у кагосьці з фінаў лыжы. Нам давялося іх канфіскаваць, а біятланіста аштрафаваць. Усе былі разлаваны, маўляў, як можна ў спартсмена забіраць інвентар, аднак гэта была фарцоўка, і закона трэба было прытрымлівацца. У выніку гэтыя лыжы трапілі ў камісійную краму, дзе іх і прадалі. Мы, між іншым, цэлымі пачкамі канфіскоўвалі «жуйкі». Праўда, што пасля з імі рабіць, не ведалі.

***— А з прастытуткамі як змагаліся?***

— Быў вось такі выпадак. Я неяк на тэлебачанні гартаў сваю картатэку прастытутак і на камеру сказаў: «А вось перад вамі валютная прастытутка па мянушцы «Пацучыха», «працуе» яна ў гасцініцы «Юбілейная». На наступны дзень мне пазванілі. Зняў слухаўку і пачуў: «Навошта вы ўсё расказалі на тэлебачанні! Цяпер мая дачка не можа выйсці з кватэры — на яе ўсе пальцам паказваюць!».

### «Мы амаль не ведалі, што такое наркотыкі»

***— Наркагандляроў было, відаць, на парадак менш, чым зараз?***

— Мы амаль не ведалі, што такое наркотыкі. Затрымлівалі наркаманаў не толькі з каноплямі, але і з опіумам, прамедолам, афінам. Дарэчы, першая рэзанансная справа ў Мінску, звязаная з наркотыкамі, — крадзеж прамедолу на заводзе эндакрынных прэпаратаў. Крымінальную справу заводзіў я, хаця ў крымінальным вышуку рабіць падобнае не прынята. Наша справа трапіла ва ўсесаюзны агляд для службовага карыстання ў Маскве як прыклад эфектыўнай барацьбы з наркаманіяй.

***— У вашай практыцы вам даводзілася працаваць з самымі нізамі крымінальнага свету: гвалтаўнікамі, вычварэнцамі, забойцамі. Псіхалагічна не было складана?***

— Усе, хто працуе з людзьмі, мусяць ведаць псіхалогію. Асабліва міліцыянер, сышчык. Груба я ніколі з падазраванымі не размаўляў. Я цярпець не мог, калі чалавека абражалі. Нават калі ён забойца, хуліган, гвалтаўнік, з ім трэба размаўляць нармальна, па-чалавечы. У звычайным жыцці я эмацыйны чалавек, але на працы мае эмоцыі знаходзяцца дзесьці на водшыбе. Чаму? Яны перашкаджаюць быць аб'ектыўным. А супрацоўніку міліцыі быць неаб'ектыўным — недаравальная раскоша. Заўжды кажу, што супрацоўнік крымінальнага вышуку — гэта проста пасада. Для таго, каб стаць сышчыкам, трэба 5-10 гадоў практыкі. Што тычыцца маёй непасрэднай працы са злачынцамі, я пачуваўся спакойна. Але быў выпадак, які запомніў на ўсё жыццё. У адзін дзень у басейне патануў маленькі хлопчык, а каля Усходняга аўтавакзала знайшлі раздзеленае цела. Калі я трапіў у морг, пабачыў перад сабой парэзаны труп, а ў куце на такім жа стале ляжаў хлопчык. Убачанае мяне вельмі ўразіла. Калі я зараз узгадваю той момант, мяне нібыта токам працінае.

У маёй практыцы ёсць цікавы момант, звязаны з маньякам. Справа ў тым, што не ахвяры давялося апазнаваць злачынцу, а наадварот, гэта даволі нехарактэрная з'ява для нашай працы. У адным з мінскіх пад'ездаў згвалцілі непаўнагадовую дзяўчынку. У памяшканні было цёмна, яна спужалася, ніякіх прыкмет не запомніла. Прыкладна ў тыя ж дні ў горадзе здзейснілі яшчэ некалькі нападаў на жанчын, але беспаспяховых. Як стала вядома пазней, гэта быў адзін і той жа чалавек. Аднак ён адмаўляўся, што згвалціў школьніцу, хоць і паказаў на месца злачынства. Доказы былі непераканаўчыя. Тады я і прапанаваў яму апазнаць ахвяру. Закону гэта не супярэчыць. І калі для апазнання прывялі школьніц, ён усё ж такі пазнаў дзяўчынку і сам ахарактарызаваў сябе: «Свалата, што я нарабіў! Яна ж яшчэ дзіця, а думаў, што дарослая...»

***— Гісторыі з вашай практыкі можна лёгка экранізаваць. Дарэчы, ці глядзіце кіно пра сышчыкаў?***

— Калі па тэлебачанні толькі пачалі паказваць серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў», усе сышчыкі глядзелі яго з вялікім інтарэсам. Праўда, якасць сталанавілася ўсё горшай. І зараз серыялы не адпавядаюць рэчаіснасці. Усе сышчыкі-героі з гэтых фільмаў альбо самі павінны ў турму сесці, альбо быць забітымі ці звольненымі. Артыстаў, якія іграюць гэтых персанажаў, паважаю, аднак сцэнарыі вельмі слабыя. Калі ў Савецкім Саюзе здымалі кіно пра маракоў, кансультантамі былі адміралы. Іх запрашалі, каб фільмы былі праўдзівымі.

***— А вы былі б не супраць папрацаваць кансультантам для беларускага фільма пра міліцыю?***

— З задавальненнем пагадзіўся б на такую прапанову. Практыка ў мяне багатая. І я не магу цярпець хлусні. Мне падаецца, я б здолеў дапамагчы

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»**, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| Продавец | **ОАО «Плещеницлес»**, Минская обл., Логойский р-н, г.п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Тип ТС | Регистрационный знак | Год выпуска | Двигатель (тип) |
|---|---|---|---|---|
| **лесовоз на базе шасси Камаз с гидроманипулятором Fiskars 65** | **грузовой специальный лесовоз** | **2502 АМ-5** | **1990** | **дизель** |

**Начальная цена с НДС 20% – 60 782 400 белорусских рублей (снижена на 50%)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 30.10.2015**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **10.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Дата и время окончания приема документов | **09.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактная информация | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. www.cpo.by E-mail: auction@cpo.by** |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

**Наименование (описание) имущества и его стоимость**

**ЛОТ №1.**
Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29228, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Криничная, д. 4, площадь – 366,6 кв.м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, здание лесопильного цеха, начальная стоимость лота 436.000.000 белорусских рублей (Залог ОАО «Белвнешэкономбанк»).

**ЛОТ №2**
Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 250/С-26420, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Гагарина, д. 36, площадь – 587,9 кв.м, назначение – административно-бытовой корпус, начальная стоимость лота 1.237.332.773 белорусских рубля. (Залог ОАО «Белвнешэкономбанк»).

**ЛОТ №3**
Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29230, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Криничная, д. 4, площадь – 32,8 кв.м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, здание лесосушилки, начальная стоимость лота 51.900.000 белорусских рублей (Обременений нет).

**ЛОТ №4**
Автотранспорт – Бетоносмеситель с самозагрузкой Fiori DB 260 SL, желтого цвета, 2008 г.в., регистрационный знак ВА 2 6705, начальная стоимость лота 220.338.983 белорусских рубля (Залог ОАО «Белагропромбанк»).

**ЛОТ №5**
Автотранспорт – Автомобиль ГАЗ 32213, синего цвета, 2007 г.в., регистрационный знак АЕ 5758-2, инвентарный № 50503, начальная стоимость лота 43.586.704 белорусских рубля (Залог ОАО «Белагропромбанк»).

**ЛОТ №6**
Автотранспорт – Автомобиль МАЗ 5432 А5, белого цвета, 2008 г.в., регистрационный знак АВ 4579-2, инвентарный № 10089, начальная стоимость лота 181.442.417 белорусских рублей (Залог ОАО «Белагропромбанк»).

**ЛОТ №7**
Автотранспорт – Фронтальный погрузчик LIUGONG CLG 835, желтого цвета, 2008 г.в., регистрационный знак ВА 2 6704, инвентарный № 658, начальная стоимость лота 111.440.678 белорусских рублей (Залог ОАО «Белагропромбанк»).

**ЛОТ №8**
Автотранспорт – Автомобиль КАМАЗ 65115 62, оранжевого цвета, 2008 г.в., регистрационный знак АВ 7457-2, инвентарный № 10027, начальная стоимость лота 438.114.872 белорусских рубля (Залог ОАО «Белагропромбанк»).

**ЛОТ №9**
Автотранспорт – Автомобиль КАМАЗ 65116 020-62, оранжевого цвета, 2008 г.в., регистрационный знак АЕ 9055-2, начальная стоимость лота 199.655.736 белорусских рублей (Залог ОАО «Белвнешэкономбанк»).

**ЛОТ №10**
Автотранспорт – Автомобиль МАЗ 5551А2 320, белого цвета, 2008 г.в., регистрационный знак АВ 4998-2, инвентарный № 10093, начальная стоимость лота 137.386.268 белорусских рублей (Залог ОАО «Белагропромбанк»).

| | |
|---|---|
| **Собственник (владелец) имущества** | Витебская область. Право хозяйственного ведения, правообладатель: Дочернее коммунальное строительное унитарное предприятие «Полоцкая СПМК-36», УНП 300075137, юридический адрес: Витебская область, г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 52 |
| **Местонахождение имущества** | г. Полоцк. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ДКСУП «Полоцкая СПМК-36» Кандыбо Владимир Степанович (раб. тел. 80214-42-22-66, т.м. 8029-713-66-35) |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белвнешэкономбанк», залог ОАО «Белагропромбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. «Правды», 32 18 декабря 2015 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316 Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 60 00 92, т.м. 375-33-687-91-20. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 17 декабря 2015 года.**<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукционов: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000003009127, площадью 0,1083 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 5 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 139 702 280 бел. руб. **Размер задатка:** 10 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 15.12.2015 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 30.11.2015 с 8.30 по 14.12.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр.лица Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешения на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 6 месяцев (для юр.лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем.участка. Извещение опубликовано в газете «Звязда» 28.08.2015. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл.управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288108101000307, площадью 0,1456 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 11А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 63 261 400 бел. руб. **Размер задатка:** 6 326 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221288108101000306, площадью 0,1476 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 13А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 64 130 500 бел. руб. **Размер задатка:** 6 413 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 24.12.2015 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 30.11.2015 с 8.30 по 23.12.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона: возместить убытки, причиняемые нарушением функционирования мелиоративных сооружений: по лоту №1 в сумме 12 870 150 бел. руб., по лоту №2 в сумме 13 046 950 бел. руб.; получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем.участка (начать строительство) не позднее 1 года со дня проведения аукциона; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Извещение опубликовано в газете «Звязда» 23.05.2015. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314110126 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа – Октябрьский сельисполком. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221882201901000047, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д.Большое Лосвидо, ул. Центральная, 22Б для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (озеро Лосвидо); охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 12 522 600 бел. руб. **Размер задатка:** 1 252 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 29.12.2015 в 15.00 по адресу: г. Городок, ул. Пролетарская, 2 в Городокском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 30.11.2015 с 8.30 по 28.12.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешения на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем.участка. Извещение опубликовано в газете «Звязда» 15.07.2015. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600316027002 в ЦБУ № 207 филиала № 200 Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300066953, код платежа: 4901, получатель платежа: Вайханский сельисполком |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). **Для участия в аукционе** гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр.лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем.участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## ОСИПОВИЧСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ И ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. ОСИПОВИЧИ И ОСИПОВИЧСКОМ РАЙОНЕ

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462

| Номер лота по порядку | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы по подготовке документации (руб.) | Инженерная инфраструктура * | Ограничения (обременения) прав на земельный участок | Кадастровый номер и характеристика земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. г. Осиповичи, ул. Короткая (автобусная остановка «Микрорайон ж.д.») | для установки и обслуживания остановочного комплекса с двумя встроенными торговыми павильонами модульного типа (земельный участок для размещения объектов иного назначения) | 3 867 724 | 580 159 | - | газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение, транспортная инфраструктура | | 724850100001002603 Площадь земельного участка 0,0054 гектара. Срок аренды 15 лет |
| 2. д. Гродзянка, ул. Советская | для установки и обслуживания павильона модульного типа (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 72 888 | 10 933 | - | водоснабжение, транспортная инфраструктура | | 724880601601000384 Площадь земельного участка 0,0100 гектара. Срок аренды 15 лет |
| 3. г. Осиповичи, ул. Дружная, д. 47 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | 71 501 798 | 7 150 180 | 16 849 186 | газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура | охранная зона линии электропередач до 1000 В | 7248501000010003895 Площадь земельного участка 0,0939 гектара. Частная собственность |
| 4. г. Осиповичи, ул. Бобруйская, д. 41 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | 93 529 215 | 9 352 922 | 17 080 592 | газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура | | 7248501000010003896 Площадь земельного участка 0,0780 гектара. Частная собственность |
| 5. г. Осиповичи, ул. Вишневая, 24 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | 76 361 161 | 7 696 116 | 17 619 457 | газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура | охранные зоны: линии электропередач до 1000 В; сетей и сооружений водоснабжения; сетей и сооружений канализации | 7248501000010003894 Площадь земельного участка 0,0989 гектара. Частная собственность |
| 6. г. Осиповичи, ул. Рябиновая, 13 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | 72 679 643 | 7 267 964 | 17 710 781 | газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура | охранная зона линии электропередач до 1000 В | 7248501000010003897 Площадь земельного участка 0,0932 гектара. Частная собственность |
| 7. г. Осиповичи, ул. Рябиновая, 15 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)) | 76 656 748 | 7 665 675 | 17 011 788 | газоснабжение, водоснабжение, водоотведение, электроснабжение, транспортная инфраструктура | охранная зона линии электропередач до 1000 В | 7248501000010003893 Площадь земельного участка 0,0983 гектара. Частная собственность |

** «Инженерная инфраструктура» – подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится **29 декабря 2015 года** в **10.00** по адресу: г. Осиповичи, ул. Сумченко, д. 30, корп. 1, 2-й этаж, кабинет №29. Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Осиповичи, ул. Ленинская, 86, 2-й этаж, кабинет 20 (тел. 74 877) в рабочие дни с 14.00 до 17.00 с первого дня после публикации извещения в СМИ. Прием заявлений заканчивается – **23 декабря 2015 года в 17.00**.

1. При подаче заявления для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляет в установленный в извещении о проведении аукциона срок:

а) документ, подтверждающий **внесение суммы задатка (задатков)** на расчетный счет Осиповичского райисполкома **№3641116510005** в ЦБУ 722 филиала №703 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Осиповичи, УНП 700023235, МФО 153801760, ОКПО 04065054 (разовый платеж), с отметкой банка;

б) документ, удостоверяющий личность (**паспорт и его копию**) покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **нотариально удостоверенная доверенность** (паспорт предъявляется лично, фамилия представителя сообщается заранее) и копия паспорта;

в) представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе на основании Указа Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» организатором аукциона с участниками заключаются соглашения, в которых предусматриваются права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, в том числе размер штрафа, в предусмотренных указом случаях.

2. Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Земельный участок снимается с аукциона по решению комиссии до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на земельный участок претендует только один участник аукциона.

3. Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

4. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка, обязан в течение **10 рабочих дней** со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо о признании аукциона несостоявшимся внести **плату за земельный участок** (часть платы – в случае предоставления рассрочки) (задаток засчитывается при внесении платы), **возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах аукциона, либо о признании аукциона не состоявшимся.

После совершения победителем аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо о признании аукциона несостоявшимся.

5. Победителю аукциона решением райисполкома может быть предоставлена рассрочка платы за предмет аукциона на срок, не превышающий 5 лет, когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность, в том числе по результатам аукционов, превышает:

для граждан 300 базовых величин;

для индивидуальных предпринимателей 500 базовых величин;

для юридических лиц 800 базовых величин.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка, с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, обязан:

не позднее двух рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (части платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения), возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, заключить договор аренды земельного участка с Осиповичским районным исполнительным комитетом (при предоставлении земельного участка в аренду);

в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка (при предоставлении земельного участка в частную собственность – со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона) в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок, ограничений (обременений) прав на него в РУП в Осиповичское бюро Бобруйского филиала республиканского унитарного предприятия «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Осиповичи, ул. Ленинская, 86);

в двухмесячный срок со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и в срок, не превышающий 2 года, разработать строительный проект;

до занятия земельного участка осуществлять работы по наведению порядка на предоставленном земельном участке и его благоустройству в соответствии с требованиями земельного законодательства;

приступить к занятию земельного участка не позднее шести месяцев для юридических лиц, индивидуальных предпринимателей и одного года для граждан, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта (в случае невыполнения данного требования, право аренды земельного участка прекращается в установленном порядке);

перед началом строительства объекта снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно строительному проекту.

# «НА МОВЕ Я МАГУ ТОЛЬКІ СПЯВАЦЬ»

## Дзякуючы Мулявіну беларускія песні загучалі на розных кантынентах

**Пяцьдзясят шэсць краін апладзіравалі ансамблю «Песняры», які заснаваў і якім на працягу трыццаці гадоў кіраваў Уладзімір Мулявін. 12 студзеня 2016 года яму магло б споўніцца 75, але ўмоўны лад у гэтым выпадку можна разглядаць таксама ўмоўна — фізічна б споўнілася, а насамрэч Мулявін для нас — жывейшы за ўсіх жывых. Феномен асобы музыканта патлумачыць складана, як і ахапіць спадчыну і значэнне яго творчасці для беларускай культуры. Як і джазавы аркестр Эдзі Рознэра некалі, Уладзімір Мулявін з ансамблем «Песняры» ў свой час вярнулі ўвагу беларускай музыкі да вытокаў, да фальклору, да культуры беларускага этнасу. Асоба Уладзіміра Мулявіна пацвярджае таксама дзіўную тэндэнцыю: сапраўднымі патрыётамі беларускага краю часта становяцца якраз прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў.**

Мулявін нарадзіўся ў Свярдлоўску і трапіў у Беларусь, можна сказаць, выпадкова, але шчыра палюбіў і краіну, і мову. Удава Песняра, дырэктар прысвечанага яму музея Святлана Пенкіна, расказала, што ў яе мужа пыталіся, чаму ён, маўляў, у жыцці не выкарыстоўвае беларускую мову, на што той адказваў: «Мова настолькі прыгожая, што на ёй я магу толькі спяваць».

75-годдзе выдатнага кампазітара і музыканта, які так шчыра маліўся небу, зямлі, прасторы і магутнаму Богу за родны народ Беларусі, не пройдзе незаўважным. Цэлы год Уладзімір Мулявін, імя і творчасць якога і без таго актыўна выкарыстоўваецца ў сучаснай культуры, будзе займаць яшчэ больш заслужанага месца ў нашай прасторы.

Паплечніца Уладзіміра Мулявіна Святлана Пенкіна сказала, што, нягледзячы на тое, што афіцыйна спадчына кампазітара ацэньваецца ў 236 аўтарскіх песень, насамрэч гэтая лічба перавышае чатырыста: «Калі было цяжка, Уладзімір Георгіевіч мог атрымаць натхненне ад томіка Янкі Купалы. Ён адкрываў кнігу і казаў: «Нічога ж не трэба пісаць, уся музыка ўжо ёсць у вершах». Тады ён пачынаў працаваць і дадаваў: «Вось бачыш, значыць, я магу пісаць». А потым мог брацца за складаныя, спрэчныя праграмы на вершы Маякоўскага. Цэлы год ішоў на тое, каб вывучыць, падабраць вершы і канцэптуальнае рашэнне».

Народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, узгадаў, як ён з Уладзімірам Мулявіным у адзін час служыў у арміі: «Я быў у ваенным аркестры, а ён у ваенным ансамблі. Аднойчы я ўбачыў, як на канцэрце салдацкай самадзейнасці адзін хлопец пяе песню «А я шагаю по Москве» выдатнага кампазітара Андрэя Пятрова. Гэта быў Мулявін. Я не пасаромеўся і падышоў да яго, хоць не ведаў, што яму сказаць. Яшчэ тады я адчуў, што гэта асаблівы чалавек, ён вылучаўся сваёй сціпласцю, яго вочы гарэлі, і здавалася, што ён дасць музыцы вельмі шмат. Так і атрымалася... Доказам гэтаму стаў наш апошні канцэрт пры закладцы яго зоркі ў Маскве. Калі Уладзімір выйшаў на сцэну і вядучая назвала яго імя, уся зала ўстала. Ён вельмі шчыра палюбіў Беларусь і беларускую мову. Калі вы паслухаеце ўважліва яго творы — музыка можа ўспрымацца асобна, а словы асобна. Да паэзіі ён падыходзіў вельмі сур'ёзна, таму большасць яго сачыненняў зроблена на класічную паэзію. Хаця калі вы помніце, пачынаў ён з замежных песень. Мулявін дзіўным чынам адчуваў драматургію канцэрта, усё стаяла на патрэбным месцы. Складана ўявіць, як бы мы цяпер жылі без яго спадчыны. Для сваіх выступленняў можна ўзяць любую песню з яго рэпертуару і быць упэўненым, што яна будзе мець поспех. Некалі я прыехаў на гастролі ў далёкі горад Чалябінск і ў тамтэйшым рэстаране пачуў тры песні «Песняроў». Хто б мог уявіць, што ў тыя гады, пад канец існавання Савецкага Саюза, так далёка можна пачуць песні на беларускай мове».

Міністэрства культуры прапанавала шэраг разнапланавых мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню юбілею песняра, якія будуць праходзіць на працягу ўсяго года. Праўда, можна сказаць, цыкл ужо распачаўся ў мінулым годзе — прэм'ерай спектакля «Пясняр» па п'есе маладога драматурга Васіля Дранько-Майсюка ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага.

Рэжысёр Валянціна Еранькова сказала, што за той год, які «Пясняр» не сходзіць з пляцоўкі тэатра, ён не проста знайшоў свайго гледача, але і атрымаў водгук: «Наш спектакль пабудаваны на творчым лёсе музыканта, і побач з галоўным героем на працягу дзвюх гадзін жывуць тыя ж асобы, з якімі ён сам пражыў сваё жыццё — гэта і Якуб Колас, і Янка Купала, і Максім Багдановіч, і Цётка. Мне даводзіцца чуць, асабліва ад моладзі, што пасля спектакля хочацца вярнуцца дадому, знайсці і паслухаць музыку Мулявіна, адкрыць і пачытаць Коласа ці Цётку. Гэта наша вялікая культура, і прэм'ера спектакля стала для нас падзеяй. Пра гэта сведчыць ужо тое, што акцёры, наколькі б занятымі ні былі, заўсёды перад спектаклем знаходзяць час, каб сустрэцца з музычным кіраўніком і прайсці музычны цыкл, які на сцэне выконваецца ўжывую».

> **«Яшчэ тады я адчуў, што гэта асаблівы чалавек, ён вылучаўся сваёй сціпласцю, яго вочы гарэлі і здавалася, што ён дасць музыцы вельмі шмат».**



У юбілейны год Уладзіміра Мулявіна ў чэрвені–ліпені тэатр будзе ўздзельнічаць у турах з дзесяцi спектакляў па гарадах краіны — Гродна, Брэсце, Магілёве, Гомелі і Віцебску. Валянціна Еранькова марыць таксама аб тым, каб паказаць «Песняра» на радзіме Уладзіміра Мулявіна.

Да святкавання 75-годдзя з дня нараджэння вялікага музыканта далучацца, вядома ж, калектывы Дзяржаўнай філармоніі — Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя Жыновіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца, Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга і, зразумела, сам ансамбль «Песняры». Рэпертуар Уладзіміра Мулявіна ў сваёй дзейнасці будуць выкарыстоўваць ансамбль народнай музыкі «Свята», Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь, ансамбль салістаў «Класік-авангард», вакальны ансамбль «Камерата».

Менавіта 12 студзеня ў філармоніі адбудзецца «Канцэрт у дзень нараджэння» з удзелам вядучых калектываў і выканальнікаў Беларусі і Расіі, якія, дарэчы, стаў своеасаблівай традыцыяй і данінай творчасці таленавітага музыканта. Шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею, пройдзе таксама падчас фестывалю песні і паэзіі ў Маладзечне і «Славянскага базару» ў Віцебску. Нацыянальны акадэмічны аркестр імя Жыновіча выканае рок-оперу «Песня пра долю» ў розных гарадах краіны, а таксама ў Беластоку. Будзе арганізавана фотавыстава са здымкаў Юрыя Іванова, Яўгена Коктыша і з сямейнага архіва; пэўныя змены пройдуць у экспазіцыі музея Мулявіна; прадугледжваецца стварэнне дакументальнага фільма пра жыццё музыканта.

Сённяшні дзяржаўны ансамбль «Песняры», як паведаміў яго дырэктар — мастацкі кіраўнік Вячаслаў Шарапаў, плануе канцэртны тур па гарадах Беларусі з вядомымі песнямі з рэпертуару Уладзіміра Мулявіна, якія публіка часта падхоплівае і пяе самастойна, вядзе перамовы аб шэрагу выступаў у Расіі, а таксама прапануе сваю кандыдатуру да ўдзелу ў конкурсе «Еўрабачанне-2016» з тым, каб упершыню тут прагучала песня на беларускай мове.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

---

■ Ведай нашых!

# НЯХАЙ УБАЧЫЦЬ ПАРЫЖ

## Упершыню сучасныя беларускія мастакі і скульптары прадстаўлены ў «Гранд Пале»



Карціна Валянціны Шобы на выставе Art Capital.

**У вялікім палацы на Елісейскіх палях у рамках буйной міжнароднай выставы Art Capital працуе павільён з работамі сучасных айчынных творцаў. Выстава адкрылася 24 лістапада, і ў самы першы дзень беларускі павільён наведалі каля 500 гасцей, пра што паведамілі ў Беларускім пасольстве ў Францыі.**

Прадстаўляюць Беларусь на выставе ў Францыі 11 мастакоў як са сталіцы, так і з розных рэгіёнаў нашай краіны: Віктар Альшэўскі, Юрый Анушка, Ганна Белавусава, Алена Вентрыён-Макарэвіч, Ларыса Журавовіч, Максім Петруль, Сяргей Парцянкоў, Павел Семчанка, Аляксандр Слепаў, Алесь Фалей, Валянціна Шоба. Творы розных жанраў і відаў выяўленчага мастацтва абраны для таго, каб даць уяўленне пра стан сучаснага беларускага мастацтва. Адметна, што ёсць магчымасць знаёміць з ім менавіта Францыю, Парыж, куды імкнуліся многія нашы творцы-землякі. Там у XIX стагоддзі знайшоў спачын рамантык Валенцій Ваньковіч, а на пачатку мінулага стагоддзя працавалі выхадцы з Беларусі Марк Шагал, Хаім Суцін, Надзея Хадасевіч-Лежэ, Леў Бакст і іншыя.

Арганізацыю беларускага павільёна ўзялі на сябе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Францыі пры супрацоўніцтве з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь, Культурны цэнтр Беларусі ў Францыі, Аркадзь Валадось, наш суайчыннік, які жыве ў гэтай краіне. Акрамя таго, падтрымаў задуму Прыёрбанк.

На думку пасла Беларусі ў Францыі Паўла Латушкі, беларускае мастацтва мае глыбокія карані і свае традыцыі, яму ёсць кім ганарыцца: Іван Хруцкі і Марк Шагал, Міхаіл Савіцкі, Заір Азгур, Андрэй Бембель і іншыя. Але цяпер французская публіка можа адкрываць для сябе багацце сучаснага выяўленчага мастацтва нашай краіны. Беларускі павільён на Art Capital — гэта выдатная магчымасць прадставіць наша мастацтва на адной з прэстыжных выставачных пляцовак свету.

Сапраўды, прэстыж пацверджаны ўвагай, якая надаецца выставе з боку дзяржавы: яна праводзіцца вось ужо 60 гадоў пад патранатам прэзідэнта Францыі і Міністэрства культуры гэтай краіны. Месца правядзення «Гранд Пале» — «Вялікі Палац вытанчаных мастацтваў», пабудаваны ў 1897 годзе для Сусветнай выставы, якая праходзіла ў Парыжы ў 1900-м. У выставе Art Capital сёлета бяруць удзел больш за 2000 мастакоў і скульптараў з больш чым 40 краін свету. Свае павільёны прадставілі Іспанія, Швецыя, Канада, Кітай, Японія, Паўночная Карэя (галоўны госць выставы). Беларусі дэбют каштоўны тым, што адкрывае новыя магчымасці для нашых мастакоў і скульптараў: Францыя — гэта яшчэ і радзіма знакамітага «Восеньскага салона». Чаму б і не?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*

■

**P.S.**

**У рамках выставы Art Capital у Парыжы мастачка з Гродна Валянціна Шоба і скульптар з Гомеля Сяргей Парцянкоў адзначаны прэміяй Тэйлара. Асацыяцыя імя барона Тэйлара, якая працуе з 1844 года, мэтай сваёй працы бачыць падтрымку мастакоў і стымуляванне развіцця мастацтва. Штогод гэтая прэмія прысуджаецца мастаку і скульптару. Лаўрэатаў вызначаюць шляхам галасавання. Упершыню прэміяй адзначаны беларускія творцы. Прычым праца Сяргея Парцянкова прыехала ў Парыж літаральна ў апошні дзень перад адкрыццём...**



Скульптура Сяргея Парцянкова на выставе Art Capital.

■ Прэм'ера

# Ноч, калі магчыма ўсё

## Навошта жанчыне ператварацца ў мужчыну? Версія Шэкспіра

**Страсць, дзеля якой можна гадамі чакаць спагады, а можна наогул забыць сябе і радавацца імгненню, калі знаходзішся побач... Альбо кінуцца насустрач новаму пачуццю, не надта разабраўшыся, да каго яно... Шэкспір — майстар інтрыг, у якіх за пачуццёвым так ці інакш праглядае чалавечае. Вось як у п'есе «Дванаццатая ноч». Спектакль з'явіўся ў афішы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага. Напярэдадні Каляд: менавіта напрыканцы гэтых свят у Англіі была такая дзіўная ноч, калі людзі маглі дазволіць сабе нейкія такія вольнасці...**



Жанчына тут перапранаецца ў мужчыну — у памяць пра брата-блізнюка, якога лічыць загінулым. Гаспадар, якому яна служыць, і не здагадваецца пра тое, што сабой уяўляе гэты «юнак». Тым больш пра яе пачуцці да сябе. У той жа час да яго (яе) пачынае заляцацца прыгожая гаспадыня, рукі якой дабіваецца гаспадар. І гэта пакуль не з'явіўся той самы брат, які насамрэч не загінуў... Тут і сучаснаму чалавеку — разбэшчанаму магчымасцямі розных цялесных трансфармацый — не проста было б разруліць сітуацыю, каб у выніку задаволенымі аказаліся ўсе. Але не быў бы гэта Шэкспір, які жыў у цудоўную эпоху Адраджэння з яе верай у магчымасці чалавека. Магчыма, каб «уваскрэс» той, каго аплаквалі. І таму не здараецца нейкіх пікантных сітуацый, якія ўжо нібыта наспявалі з-за гатоўнасці надта гарачых істот кінуцца ў вір з галавою, усё становіцца на свае месцы: каханне — гэта калі ёсць мужчына і жанчына. О, Шэкспір, чаму ж ты не дажыў да нашага часу? Было б пра што пісаць!..

**Каханне «працуе», і калі яно ёсць, то ці ідзі напрасткі, ці «шыфруйся» і ціха пакутуй, але чакай свайго, не адступай — і ўсё павінна быць добра. Як жа людзям гэтае «ўсё добра» патрэбна, у любыя часы.**

Але напісана столькі і такога, што пасля славутага лонданскага «Глобуса» ставяць тэатры па ўсім свеце ўжо больш за пяць стагоддзяў. Вось і ў Беларусі «Уільяма нашага Шэкспіра» любілі рэжысёры. І любяць — другая прэм'ера за паўгода ў мінскіх тэатрах. Здаецца, бяспройгрышны варыянт, каб запаўняць залы: закручаны сюжэт, лёгкі стыль, гумар і тое самае вечнае. Мастацкі кіраўнік тэатра імя Горкага і рэжысёр пастаноўкі Сяргей Кавальчык аддаў перавагу не трагедыям, а камедыі — «Дванаццатая ноч», бадай, самая вядомая. Шэкспір наогул такі «раскручаны», што калі ставяць яго п'есу, то важна не тое, якую і пра што (гэта ж даўно вядома), а тое, як рэжысёр інтэрпрэтаваў класіка, які адметны падыход знайшоў у пастаноўцы.

У спектаклі Сяргея Кавальчыка арыгінальнасць рашэння — у вонкавым вобразе з рухомымі дэкарацыямі: іх замяняюць фактычна толькі вешалкі са строямі, якія трансфармуюць прастору, дазваляюць умоўна абазначыць розныя памяшканні, аддзяліць розныя дзеі, якія адбываюцца паміж людзьмі (мастак-пастаноўшчык Алеся Сарокіна). Гэтага хапіла б і для таго, каб абстрагавацца ад шэкспіраўскага часу, прыблізіць падзеі да гледача, бо ўсё ж сучасны тэатр існуе для людзей, якія жывуць цяпер. Але з'яўляюцца галоўныя героі, а разам з імі... прывід Шэкспіра. Не, ён з'яўляецца ў маёй галаве разам з персанажамі ў пышных касцюмах, якія адразу вяртаюць да былых часоў (над эскізамі працавала Марыя Герасімовіч). Арсіна — дакладна не просты чалавек, а герцаг (артыст Сяргей Чакярэс), і не трэба глядзець у праграмку, каб гэта зразумець, таму што відавочна. Дачка графа Алівія (Аксана Лясная), пра якую ўсе яго думкі, — паненка няпростая (такія капялюшыкі ды сукенкі не любая дама можа сабе дазволіць). Ох, і Віёла (Вольга Яравенка-Карпава) пра сукенкі марыць, але ходзіць у мужчынскім строі. Авантурнасць яе натуры, што Шэкспір падкрэсліваў пераапрананнем, цяпер не зусім адчуваецца — у сувязі з тым, што сучасныя жанчыны такі прадмет мужчынскага гардэроба, як нагавіцы, лічаць звычайным (можа, таму патрэбны гэтыя прыгожыя сукенкі, тканіна якіх іграе ў пэўным асвятленні?).

У нашым варыянце камедыя застаецца камедыяй, з акцэнтам на камедыйных момантах, драбніцах і персанажах — яны на месцы: і дзядзька графіні інтрыган сэр Тобі (Аляксандр Вергуноў), і няўдачлівы жаніх Эндру (Аляксандр Ждановіч). І яшчэ падумаць, хто тут больш камічны — яны ці блазен Фесце (Уладзімір Глотаў). Падобна, што на жартачкі гэтых асоб публіка рэагавала асабліва чуйна: шатландская спадніца Эндру для нас — ужо «прыкол», таксама як і Аляксандр Вергуноў на сцэне вельмі стараецца працаваць у адпаведнасці з жанрам. Хохма з дварэцкім Алівіі і яго сексуальным пераапрананнем — яшчэ адзін трук для публікі, якая прыйшла разнявольвацца. Тэатр стараецца яе не расчараваць: тут і танцы, і песні, і музыка (яе для спектакля стварыў Цімур Каліноўскі), іграюць музыканты скрыпічнага квартэта тэатра.

**Жанчыны — тая сіла, якая здольная рабіць гэты свет шчаслівым. Атрымліваецца, што менавіта яны «робяць» свет.**

Праўда, праглядае жаданне надаць дзеі філасафічнасці, падкрэсліць вечнае, чаму падпарадкаваныя ўсе сітуацыі, якія здараюцца з людзьмі ў жыцці, як добрыя, так і трагічныя ці дзіўныя — цудоўныя.

Брат Себасцьян жывы, але яго з'яўленне яшчэ больш усё заблытвае ў адносінах паміж героямі. Іншая справа, што ў кожным з персанажаў мы бачым абсалютна розныя разуменні кахання, праз якое праглядае індывідуальнасць, таму што праз гэтае пачуццё выяўляюцца самыя лепшыя якасці людзей. За што, відаць, і любяць гэтага драматурга дагэтуль. Усе перашкоды паміж тымі, хто сапраўды закаханы, аказваюцца ілюзіямі. Герцаг Арсіна, які спачатку чакае Алівію, адчувае вялікую патрэбу ў каханні, і калі для гэтага знаходзіцца сапраўды блізкі і шчыры чалавек, то ён вельмі хутка (нават так хутка, што не верыцца, ці надоўга) пераключае сваю ўвагу на Віёлу. Алівія, якая напачатку гаворыць пра забарону для самой сабе пачуццяў у сувязі з жалобай, дзейнічае рашуча, калі ў сэрцы запалілася іскрынка. І яна дасягае сваёй мэты хутчэй за іншых — Себасцьян, можа, і не зусім зразумеў, што адбылося. Віёле прыйшлося складаней за іншых, нават праз дуэль прайсці (захацелася пабываць у мужчынскай скуры — атрымай усе прыемнасці іх ладу жыцця на той час). Наогул, галоўныя гераіні гэтай п'есы, як і спектакля, — жанчыны. Мужчыны ад іх залежаць. Яны падпарадкаваныя, проста «плывуць» услед за падзеямі. Доказ — амаль раптоўная перамена дамы сэрца ў Арсіна. Жанчыны — тая сіла, якая здольная рабіць гэты свет шчаслівым. Атрымліваецца, што менавіта яны «робяць» свет. У канкрэтным свеце спектакля ўсё закручваюць жанчыны, усё зблытваюць, але дасягаюць свайго, хоць і рознымі метадамі. Каханне «працуе», і калі яно ёсць, то ці ідзі напрасткі, ці «шыфруйся» і ціха пакутуй, але чакай свайго, не адступай — і ўсё павінна быць добра. Як жа людзям гэтае «ўсё добра» патрэбна, у любыя часы.

Сонца і Месяц круцяць гэты шарык, на якім людзі сустракаюцца, губляюць адно аднаго, знаходзяць, кахаюць. І гэта галоўная мэта, дзеля якой варта жыць, нешта рабіць. Сонца і Месяц з'яўляюцца як персанажы маўклівыя, але шэкспіраўскія — нават вонкава. Нібыта жывыя скульптуры. (Так і ёсць! Удзельнічае студыя жывых статуй «Залаты рэжысёр» Аляксея Стукіна, «Чердачный театр» Кацярыны Чакатавай.) Статуі сустракалі гасцей яшчэ перад пачаткам прэм'еры ў фае, а потым запаўнялі паўзу антракта — было адчуванне суцэльнага, бесперапыннага дзеяння. А нехта, можа, зразумеў: тэатр — гэта свята, якое рассоўвае нават межы паміж эпохамі. У ім ёсць інтрыга заўсёды, незалежна ад інтрыг у п'есе. Таму людзі ў нас ходзяць у тэатры: чакаюць узрушэння. Сыходзілі вясёлыя: забаўна. Шэкспір як Шэкспір.



Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Формула ўдачы

# «БРОНЗАВЫ» «ГАМЛЕТ»

## Маладыя беларускі тэатр: энергія перамог

**Талент ёсць, сілы ёсць, асобы ёсць — такі вынік для Беларусі II Маладзёжнага тэатральнага форуму краін Садружнасці, Балтыі і Грузіі, які прайшоў у Мінску. Наша пастаноўка зноў у ліку найлепшых — адзначаны Магілёўскі абласны тэатр лялек і рэжысёр Ігар Казакоў, які паставіў «Гамлета».**

Але перамогу сёлета атрымаў усё ж эстонскі спектакль «Чысты розум/Укусі мяне» (аўтар Рэнатэ Кеэрд) кампаніі Nii і Новага тэатра г. Тарту. А вось далей — вельмі цікава. Таму што другая прэмія хоць і паедзе ў Кіеў, аснова ў яе беларуская — п'еса Дзмітрыя Багаслаўскага «Любоў людзей», спектакль паводле яе паставіў Станіслаў Жыркоў у Кіеўскім акадэмічным «Маладым тэатры».

Сам Дзмітрый Багаслаўскі адзначаны спецыяльным прызам за рознабаковую тэатральную адоранасць. У форуме ён удзельнічаў не толькі як драматург, але і як акцёр Маладзёжнага тэатра (Мінск), дзе працуе. Але з дзвюх беларускіх пастановак вылучылі «Гамлета» Магілёўскага абласнога тэатра лялек. Ігар Казакоў, які прапанаваў незвычайнае прачытанне Шэкспіра, даў зразумець, што спыняцца ў творчасці не будзе. Галоўнае, каб гэтай творчасці спрыялі абставіны. І разуменне публікі: у беларускім тэатры ёсць сілы, якія ўзраслі і чакаюць свайго гледача — такога ж маладога, здольнага разумець нестандартныя павароты і думаць над тым, што бачыць.

Ларыса ЦІМОШЫК. tsimoshyk@zviazda.by

■ Contemporary art

# ЦІ ПРЫВЯЗУЦЬ У МІНСК ТВОРЫ КАЗІМІРА МАЛЕВІЧА?

**Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў ужо некалькі гадоў працуе ў будынку па вуліцы Някрасава, але афіцыйнай датай заснавання дзяржаўнай установы культуры змешанага тыпу цяпер будзе лічыцца 1 кастрычніка гэтага года. У лістападзе прадстаўнікі Міністэрства культуры, самога цэнтра і іншых аб'яднанняў адпаведнай сферы сабраліся, каб абвясціць свае планы на будучыню.**

І самае цікавае з гэтых планаў звязана са святкаваннем у 2020-м стагоддзя віцебскага аб'яднання УНАВІС («Утвердители Нового Искусства»), аўтараў якога можна назваць піянерамі не проста авангарднага мастацтва Беларусі, а паняцця «сучаснае мастацтва» ўвогуле. Віцебская школа, імёны Казіміра Малевіча і Марка Шагала, гарадское вулічнае мастацтва дазваляюць лічыць Беларусь адной з роданачальніц авангарду. Сучаснае мастацтва — натуральнае для нас, і таму стварэнне цэнтра, прызначанага збіраць у сваіх праектах розныя напрамкі сучаснага беларускага мастацтва, невыпадковае.

На тэрмін з 2015 да 2020 года створана вялікая праграма мерапрыемстваў, прымеркаваная да юбілею УНАВІСа: на 2017 год запланавана выстава маладых аўтараў, а сам юбілейны год будзе адзначаны экспазіцыяй Казіміра Малевіча, творы якога ў Беларусі адсутнічаюць увогуле.

Каб адзначыць піянераў авангарду, зразумела, трэба працягваць іх справу, таму дзейнасць НЦСМ і накіравана на шуканне і падтрымку новых, эксперыментальных, часам нечаканых тэндэнцый у сучасным мастацтве, адкрыццё імёнаў сярод маладых таленавітых аўтараў, якія прагнуць выказацца. «Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў павінен стаць пляцоўкай для праяўлення талентаў і здольнасцяў творчай моладзі», — кажа **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА**.

На сёння цэнтр, што займаецца не толькі выяўленчым, але і музычным, тэатральным сучасным мастацтвам, ужо адзначыўся каштоўнымі праектамі, якія сталі добра вядомымі мінчанам і гасцям сталіцы — гэта, напрыклад, фестываль вулічных тэатраў ці скульптуры пэўнага фармату ў гарадской прасторы «Арт-астравы», што былі прадстаўлены на адным з астравоў Камсамольскага возера. «Тэатральныя, музычныя фестывалі, перформансы, пластычныя, вулічныя тэатры — гэта нармальна, гэта еўрапейскасць, гэта выклікае спрэчкі, кранае за жывое — усё гэта існуе ў нашым культурным асяроддзі, — каментуе **дырэктар НЦСМ Наталля ШАРАНГОВІЧ**. — Новае мастацтва адрозніваецца ад ранейшага, ва ўсе часы моладзі хацелася праявіць сябе па-свойму. Калі ў грамадства ёсць цікавасць да гэтага, чаму б не даць магчымасць маладым выказацца?»

Цэнтр плануе пашыраць і насычаць новымі творамі ўласную музейную калекцыю, а выставачная дзейнасць установы актуальная не толькі ў межах Беларусі, але і іншых краін. Тыя ж праекты, што некаторы час можна было лічыць эксперыментальнымі, будуць развівацца і набываць новыя рысы і новых, замежных, удзельнікаў. На свае плечы НЦСМ узяў складаную задачу не толькі адшукання і адбору найлепшых сучасных твораў краіны, але і прасоўванне іх на замежных пляцоўках.

І так, Цэнтр сучаснага мастацтва нарадзіўся не толькі фактычна, але і афіцыйна. Абяцанне выставы Казіміра Малевіча дарагога вартае, але звярніце ўвагу — магчыма, на гэтых пляцоўках сёння нараджаецца таксама нешта ўнікальнае, бо мастацтва развіваецца цыклічна. А значыць, надыходзіць наш час.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. katsyalovich@zviazda.by

■ Чалавек-машына

# КІБАРГІ ЎЖО СЯРОД НАС



**Калі мы гаворым пра кібаргаў, у свядомасці аўтаматычна ўсплываюць сцэны з навукова-фантастычных фільмаў кшталту «Тэрмінатара» ці «Рабакопа». Аднак у поўным сэнсе яны існуюць ужо цяпер. Напрыклад, да гэтай катэгорыі можна аднесці людзей са стымулятарамі сэрца або вушнымі імплантатамі. У іх целах суіснуюць арганічныя, біямеханічныя і электронныя кампаненты. Калі ж гэта здаецца для вас занадта простым, прапануем вам даведацца пра людзей, у арганізмах якіх — куды больш прасунутыя тэхналагічныя прылады.**



## ДЖЭРЫ ДЖАЛАВА

Сутыкненне з аленем у прыгарадзе Хельсінкі ў маі 2008 года каштавала маладому праграмісту Джэры Джалаве пальца. Пасля падзення з матацыкла юнак быў дастаўлены ў шпіталь, дзе лекары не змаглі выратаваць безыменны палец на яго левай руцэ. Пасля аперацыі Джалава вырашыў яшчэ раз наведаць шпіталь, каб атрымаць пратэз. Урачы прапанавалі яму абсталяваць пратэз USB-накапляльнікам аб'ёмам у 2 Гб. Узрадаваны пацыент адразу пагадзіўся, асвоіў біянічны палец дома і паспяхова з ім працуе. Імплантаваны USB-накапляльнік скрыты пад пратэзам, які мацуецца да непашкоджанай часткі пальца. Калі Джэры трэба выкарыстоўваць сваю «флэшку», ён проста здымае яго і ўключае носьбіт у порт камп'ютара. Чытачы нямецкага выдання Die Welt упэўнены, што Джалаву можна з поўным правам называць першым у свеце кібаргам.



## ЦІМ КЭНАН

Цім Кэнан называе сябе «біяхакерам» дзякуючы ўшытаму ў руку чыпу. Прылада (як відаць, досыць вялікая) абаронена плёнкай, абсталявана акумулятарам з бесправаднай зарадкай. Асноўнае прызначэнне чыпа — збор біяметрычных звестак уладальніка. Ён атрымаў назву Circadia 1.0 і можа падключацца да любой Android-прылады для перадачы інфармацыі — сёння гэта паказчыкі тэмпературы носьбіта. Паводле слоў уладальніка «цуда-чыпа», адной з праблем было ўжывіць агрэгат — для гэтага ён скарыстаўся дапамогай прыяцеля, які не мае медыцынскай адукацыі. Распрацоўкай чыпа займалася кампанія Grindhouse Wetware. На працягу некалькіх месяцаў плануецца пачаць выпуск такіх чыпаў па цане $500 (без кошту імплантацыі). Будучая мадэль зможа фіксаваць пульс уладальніка і стане меншай па памерах.



## РОБ СПЕНС

Канадскі рэжысёр Роб Спенс ва ўзросце 9 гадоў застаўся без правага вока пасля няўдалага стрэлу з ружжа. Ён вырашыў замяніць прымітыўны шкляны імплант малюсенькай відэакамерай, якая працуе на батарэйках. На працягу многіх месяцаў над прататыпам працавала цэлая каманда інжынераў і навукоўцаў. Нарэшце, задумка была рэалізавана і ўжыўлена Спенсу. Праект атрымаў назву Eyeborg Project («айбарг», як няцяжка здагадацца — камбінацыя англійскіх слоў «вока» і «кібарг»). Мініяцюрная прылада запісвае ўсё, што бачыць яго гаспадар для далейшага прайгравання. Сам Спенс не ў стане «бачыць» праз гэтую камеру, усе звесткі з яе перадаюцца на партатыўны камп'ютар, які служыць прыладай запісу. Рэжысёр разглядае сваё новае набыццё як выдатную магчымасць вывесці на высокі ўзровень дакументальныя і мастацкія відэаздымкі.

## ОСКАР ПІСТОРЫУС



Многія чулі гісторыю Оскара Пісторыуса, паўднёваафрыканца, бегуна на кароткія дыстанцыі, якому ампутавалі абедзве нагі ніжэй за калені яшчэ ў маленстве. Тым не менш ён вучыўся ў звычайнай школе і, больш за тое, актыўна займаўся такімі відамі спорту, як бег, рэгбі, тэніс, воднае пола і барацьба. На сваіх пратэзах ён стаў шасціразовым чэмпіёнам летніх Паралімпійскіх гульняў і сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету ў Тэгу ў эстафеце 4×400 метраў, таксама ўдзельнічаў у Алімпійскіх гульнях у Лондане. Неўзабаве пасля заканчэння спаборніцтваў яго асудзілі за забойства сваёй дзяўчыны. Прычым Оскар застрэліў яе памылкова, прыняўшы за рабаўніка. Але гэта не выратавала яго ад пакарання. Пісторыус выкарыстоўвае створаныя з вугляроднага валакна пратэзы, выкананыя ў форме англійскай літары «J». Яны дазваляюць яму нармальна рухацца, нягледзячы на інваліднасць. Хоць Оскар і не можа служыць прыкладам для пераймання ва ўсім, але збольшага дзякуючы яго заслугам падобны від пратэзавання становіцца ўсё больш папулярным.



## НІЛ ХАРБІСАН

Ніл Харбісан можа «чуць» колер. Нарадзіўся ён з прыроджанай ахраматапсіяй — захворваннем, праз якое мог адрозніваць толькі адценні шэрага колеру. Навукоўцы імплантавалі ў яго мозг антэну, якая цяпер тырчыць з макушкі галавы. Гэты прыёмнік дазваляе Харбісану ўспрымаць адценні дзякуючы транспанаванню дыяпазону спектра з каляровых частот у гукавыя. Ён з'яўляецца першым чалавекам у свеце, які прайшоў праз падобную аперацыю. Па сцвярджэннях некаторых людзей, пасля з'яўлення яго фатаграфіі з антэнай у пашпарце ён таксама можа лічыцца першым афіцыйна прызнаным кібаргам у свеце. У 2010 годзе Харбісан заснаваў Cyborg Foundation — міжнародную арганізацыю, мэта якой — дапамагчы ўсім ахвотным людзям стаць кібаргамі. А яшчэ яго антэна здольна прымаць сігналы Bluetooth.



## КАМЕРОН КЛЭП

Камерон страціў абедзве нагі і руку пры аварыі цягніка ў 2001 годзе, калі яму было 14 гадоў. Але, карыстаючыся пратэзамі, якія замянілі ўсе тры адсутныя канечнасці, ён змог стаць спартсменам, выдатным гульцом у гольф і нават кінаакцёрам. Пратэзы ног былі скансруяваны з дапамогай сістэмы Hanger Comfortflex Socket, асаблівасць якой у тым, што яна фактычна стымулюе рост мышачнай тканкі. Ён таксама першы пацыент, якому былі выраблены пратэзы з біянічнай сістэмай каленных модуляў Ottobock X3. У іх прысутнічаюць датчыкі, якія размяркоўваюць вагу раўнамерна і дапамагаюць рэгуляваць гідраўліку. У хлопца ёсць некалькі камплектаў пратэзаў: асобны для хады, для бегу і нават для плавання.

## АМАЛЬ ГРАФСТРА



40-гадовы праграміст і, як ён сам сябе называе, «тэхналагічны авантурыст» Амаль Графстра яшчэ ў 2005 годзе ўжывіў сабе ў кісці рук (паміж вялікім і ўказальным пальцамі) па адным радыёідэнтыфікацыйным RFID-чыпе. Ва ўваходныя дзверы свайго дома і ў працоўны ноўтбук Амаль уманціраваў RFID-сканеры. Зараз яму не патрэбны ключы ад дзвярэй або пароль доступу — дастаткова аднаго ўзмаху рукі. Графстра называе такіх, як ён, «зрабі-сам хакерамі», якія не жадаюць чакаць, пакуль урад і карпарацыі ўсталююць кантроль над кібернетыкай і будуць дыктаваць свае ўмовы. Аднак ён ведае, што ўнутры гігантаў, накшталт Samsung і Apple, працуюць людзі, якія не спяць у шапку і хочуць зрабіць такія тэхналогіі недаступнымі простым людзям. Амаль Графстра валодае кампаніяй «Небяспечныя рэчы», якая займаецца продажам набораў для самастойнай ін'екцыі ў цела электронных чыпаў.



## КЕВІН УОРВІК

Брытанскі навуковец-кібернетык Кевін Уорвік у 1998 годзе перанёс аперацыю па ўжыўленні мікрачыпа ў руку. Цуд мікраэлектронікі быў злучан непасрэдна з сярэднім нервам. Яго часта называюць «Капітанам кібаргаў». Уорвік, як і згаданы вышэй Амаль Графстра, мае некалькі RFID-чыпаў, імплантаваных у цела. Ва Уорвіка таксама ёсць электродныя імплантаты, падключаныя да яго нервовай сістэмы, а другі набор электродаў злучаны з яго жонкай. Кожны з гэтых імплантатаў запісвае сігналы, якія ідуць з яе нервовай сістэмы. Іншымі словамі, рукі Кевіна Уорвіка могуць адчуваць усё тое ж, што і рукі яго жонкі.



## НАЙДЖЭЛ ЭКЛАНД



Найджэл больш за дзесяць гадоў працаваў плавільшчыкам каштоўных металаў на вялікім заводзе. Але з прычыны няшчаснага выпадку на вытворчасці медыкам давялося ампутаваць яму палову рукі. Сёння ён — адзін з 250 чалавек, якія карыстаюцца пратэзамі верхніх канечнасцяў Bebionic (гэтыя прылады яшчэ часта называюць «рукой Тэрмінатара»). А фанаты фантастычнай сагі «Зорныя войны» могуць сказаць, што яна з'явілася наўпрост з фільма, дзе галоўнаму герою зрабілі практычна такую ж. Экланд можа варушыць сваім пратэзам за кошт скарачэння мышцаў у непашкоджанай частцы яго рукі. Тэхналогія Bebionic настолькі дасканалая, што Найджэл можа тасаваць калоду карт або нават самастойна завязваць шнуркі. З дапамогай Bebionic3 ёсць магчымасць таксама выконваць і выключна дакладныя і акуратныя рухі. Гэта адзіны пратэз кісці і перадплечча, які дазваляе пісаць, працаваць з клавіятурай і кіраваць мышшу. Дарэчы, стартавы кошт пратэза — $25 000, але ён узрастае ў залежнасці ад складанасці праграміравання.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**




■ Нататнік Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА,**
**галоўны рэдактар**
**часопіса «Маладосць»**



# ПРА ЧАПЛЮ НА ДОЎГІХ НАГАХ

Артыкул «Kilka slow o kobietach» любімай пісьменніцы Элізы Ажэшкі — маё чытанне на сёння і найбліжэйшыя дні. Размова ў ім ідзе пра з'яву, названую словам, якое я ніколі не любіла. Так я думала. І што? І лёс-такі прывёў мяне да чытання, у якім гэтае слова сустракаецца не менш як тры разы на старонку. Эмансіпацыя.

«Ідэя эмансіпацыі, — піша пані Эліза, — нагадвае байку пра чаплю на доўгіх нагах. Чапля ходзіць і ходзіць, у арліцу не ператвараецца, узлятаць не збіраецца, і адзіная мэта яе хаджэння па хісткай дошцы — усыпіць аднастайнымі рухамі тых, хто спадзяецца на яе палёт.

Відаць, ідэя эмансіпацыі — сапраўды птушка, і птушка настолькі высокага палёту, што ёй... нават страшна на той палёт адважыцца. Чапля «ходзіць і ходзіць», бо «трохі крывая, трохі сляпая». А ўсё ад таго, як піша пані Эліза, што ідэя эмансіпацыі ўзнікла на пустым месцы. То бок ад недарэчных уяўленняў — пра ярмо, быццам бы на жанчыну накінутае, і кайданы на нагах. Што гэта за ярмо? Якія кайданы? Калі маецца на ўвазе мужчынскі дэспатызм, пра які і сёння шмат гаворыцца і пішацца, дык у прыродзе ўсё так лагічна ўраўнаважана, што на кожны дзясятак хрэстаматыйных дэспатаў знойдзецца тузін дэспатычак жаночага полу, узброеных пантофлямі на жалезных абцасах. Калі «ярмом» з'яўляюцца абавязкі, якімі няўхільна суправаджаецца сямейнае жыццё з яго бясконцымі «я змагу» і «я паспею», дык яны якраз шчасце і ёсць! А калі нехта ў гэта яшчэ не паверыў, дык толькі таму, што паверыць у сваё шчасце чалавеку заўсёды складана...

Пані Эліза ў сваім трактаце «o kobietach» назвала жанчыну капрызным, распешчаным дзіцем. Распешчана яно таму, што з ім ад нараджэння насіліся як з яйкам, а насіліся так, бо нарадзілася бездапаможным і кволым. І таму не ад мужчынскага дэспатызму трэба ратаваць жанчын, і не ад бясконцых абавязкаў сямейнага жыцця, а... ад слабасці, простай фізічнай слабасці, якая больш ёй штучна навязана, чым прыродай дадзена. «Ад нявымаўленай клятвы вечна нагадваць дзіця і анёлка, ад замкнёных шляхоў да сур'ёзнай працы мусяць і павінны сябе эмансіпіраваць кабеты».

Эпансіпацыя і сёння чамусьці разглядаецца як скіраванасць у бок адмаўлення ад «пасады» маці сямейства дзеля якой-небудзь іншай пасады. І ў бок адмаўлення ад статусу жонкі, калі ён патрабуе хоць якіх-небудзь ахвяр. А між тым, артыкул свой пані Эліза пісала амаль паўтара стагоддзя таму. Ну, нельга сказаць, што нічога за гэты час не дасягнута... Днямі назірала, як Юлія Высоцкая выразае курапаткам хрыбетнікі — так лёгка, так нязмушана. І ад гэтага ніяк не страчвае жаноцкасці, і ніводная рысачка на яе твары не робіцца менш мілай. Вось яна, эмансіпацыя па-ажэшкаўску. «Кананічны», так бы мовіць, варыянт.

...Хрыбетнікі і я ўмею выразаць. І яйка магу разбіць адной рукой, якраз як Юлія Высоцкая. Але не магу не ўпадаць у смутак, ведаеце ад чаго? Ад таго, што мужчынам дадзены больш працяглыя суткі, чым нам

■

■ Паміж намі

# ТЫ — МАЁ «МАЁ»,

## АБО ЧУЖЫМ УВАХОД ЗАБАРОНЕНЫ!

Апошнім часам усё часцей прыходжу да высновы, што большая частка шлюбаў у нас пабудавана менавіта на дыктатуры. Прычым дыктатуры жаночай. Няважна, як яна праяўляецца: у выглядзе канкрэтных, яўных забарон і жыцця «па секундамеры» — з істэрычнымі допытамі, абнюхваннем кашуль і рэвізіяй кішэняў ці як вытанчаная гульня на нервах — з выдатна зрэжысіраванымі «сардэчнымі прыступамі» і «страчваннем прытомнасці»... Мэта адна — поўнае і канчатковае падпарадкаванне «свайго мужчыны». Крок улева, крок управа — расстрэл, падскок на месцы расцэньваецца як спроба адляцець... Часам, каб вывесці мужа на «чыстую ваду» і абвінаваціць ва ўсіх існуючых і неіснуючых грахах, жанчына так хітра расстаўляе сеткі, што ён, бедны, пападаецца на раз-два, не паспеўшы нават «нашкодзіць». Вось пасля гэтага і пачынаецца сапраўднае пекла.



Як гэта ні дзіўна, мужчыны ў большасці сваёй істоты наіўныя і даверлівыя і шчыра адгукаюцца на каварныя прапановы сваіх жанчын «паплакацца ў камізэльку» і «выкласці ўсё начыстую» — маўляў, «тады табе за гэта нічога не будзе». Мой асабісты жыццёвы вопыт падказвае, што ўсё адбываецца з дакладнасцю наадварот. Ні адзін дыктатар не даруе здрады: ён за гэта помсціць, прычым бязлітасна.

Зразумейце мяне правільна, я — не за мужчын, а супраць уласніцтва і замаху на асабістую прастору ўвогуле. У рэшце рэшт, муж — таксама чалавек і мае права на маленькі пакойчык з надпісам «іншым уваход забаронены». Людзі ўвогуле нараджаюцца свабоднымі і жывуць свабоднымі. Да шлюбу. Потым на іх надзяваюць нябачныя, але вельмі адчувальныя ланцугі, прыплятаючы сюды ні ў чым не вінаватага Гіменея. Я, безумоўна, за адказнасць. Але і за давер. Ну, нельга сілком прымусіць мужчыну сядзець каля вашых каструль і патэльняў ці назіраць, як вы накручваеце валасы на бігудзі... Лепш ён у гэты час «сходзіць» у інтэрнэт і перадасць прывітанне сябру. Ці аднакласніцы. Так-так, той загарэлай бландзінцы са здымка, які вы бачылі краем вока... Безумоўна, яму прыемна яе ўвага. Яна ж не бачыць ні яго лысіны, ні піўнога жывоціка, ні старых «трэнікаў». Яна арыентуецца толькі на фота (дзесяцігадовай даўнасці) на экране. І для яе ён ранейшы Пецяа—Коля—Дзіма, гумарыст і завадатар, які выдатна гуляў у валейбол, выдумляў прыкольныя пародыі на аднакласнікаў і адным сваім позіркам прымушаў дзявочыя сэрцы біцца часцей... Дарэчы, вельмі верагодна, што і сама бландзінка важыць зусім не 53 кілаграмы, таму наўрад ці пажадае расчароўваць вашу каштоўную «палавіну» асабістай сустрэчай, а значыць, далей за бяскрыўдную перапіску справа не пойдзе. А калі нават яго аднакласніца і сапраўды ўся такая супермадэль... Што перашкаджае і вам заняцца сабой? Ну хоць бы перастаць паглынаць булачкі, седзячы перад тэлевізарам, і пачаць выконваць просценькія фізічныя практыкаванні?

Магчыма, наступная сентэнцыя вас не супакоіць, але людзі па натуры сваёй — істоты палігамныя. Прычым, і мужчыны, і жанчыны. Безумоўна, многім хацелася б, захоўваючы ўласную палігамнасць, бачыць у якасці спадарожніка жыцця толькі манагамны варыянт (інакш кажучы, аднажэнца, ды яшчэ і без «шкодных» думак). Але так не бывае. І калі аб усім гэтым пастаянна перажываць, можна проста звар'яцець.

Адна жанчына-псіхолаг некалі сказала: чым мацней нацягваць «ланцуг», на якім «навязаны» твой мужчына, тым далей ён адбяжыць, калі аднойчы вырвецца. Ад дыктату рана ці позна можна стаміцца. Прыкладаў, калі ўзорны бацька сямейства раптам з'язджае з катушак і пускаецца ва ўсе цяжкія, колькі заўгодна... Прывяду толькі адзін, але вельмі паказальны. Мая знаёмая па імені Тамара ў вольны час любіла пагартаць запісную кніжку мужа, спадзеючыся знайсці там кампрамат — у выглядзе незнаёмых жаночых імёнаў і нумароў тэлефонаў. Рабіла яна гэта віртуозна, звычайна падчас наведвання мужам прыбіральні ці ваннага пакоя, паколькі іншай магчымасці не было — кніжка заўсёды ляжала ў яго партфелі... І, як той казаў, «за што баролася, на тое і напаролася»: аднойчы, разгарнуўшы нататнік, убачыла незнаёмыя ініцыялы — С.Б., якія адразу ж падаліся падазронымі, а побач з імі нумар тэлефона. Ледзь дачакаўшыся, пакуль муж зноў скрыецца ў запаветнай кабінцы, Тамара кінулася да тэлефона, але па адзначаным нумары ніхто не адказаў. Упэўненая, што тэлефануе палюбоўніцы мужа, яна націскала і націскала на кнопкі, а ў адказ чула доўгія гудкі. Бліжэй да поўначы, даведзеная да адчаю сваімі ж хваравітымі фантазіямі і да глыбіні душы абураная тым, што нехта асмеліўся пакваліцца на яе «ўласнасць», Тамара вырашыла пайсці ў наступленне. Прыцісну́ўшы мужа да сценкі (у прамым і пераносным сэнсе), яна хіба што не абцугамі спрабавала выцягнуць з яго прызнанне. Муж не здаваўся, бажыўся, што не ўяўляе каму належаць гэтыя праклятыя «С.Б.». Праз некалькі гадзін допытаў ён не вытрымаў — выбег на балкон і скокнуў адтуль, дзякуй Богу, гэта быў першы паверх... Толькі раніцай, гадзін у дзевяць, Тамары, нарэшце, «пашанцавала» — на тым канцы проваду знялі трубку. Бадзёры жаночы голас паведаміў, што яна патэлефанавала ў службу быту (відавочна, гэта і азначала С.Б.). Інцыдэнт быў вычарпаны, а вось муж да Тамары вярнуўся не хутка...

**«Прыціснуўшы мужа да сценкі (у прамым і пераносным сэнсе), яна хіба што не абцугамі спрабавала выцягнуць з яго прызнанне. Муж не здаваўся».**

Дарэчы, усё тая ж разумная жанчына-псіхолаг ні разу не задала свайму спадарожніку жыцця пытання «дзе ты быў?» (калі той дзесьці затрымліваўся), кіруючыся простым правілам: калі не хочаш пачуць хлусню — ні аб чым не пытайся. Самае цікавае, што менавіта муж першым пачынаў нервавацца праз яе «абыякавасць» і спяшаўся расказаць пра тое, як прайшоў дзень... Магчыма, пры гэтым крыху хлусіў. «Але ж, — гаварыла яна, — рабіў ён гэта, каб зберагчы МОЙ спакой і НАШЫ адносіны. У рэшце рэшт, усё астатняе не так ужо і важна».

Мудрасці гэтай жанчыны можна толькі пазайздросціць...

**Ала БЫВАЛАВА**

■

■ Мужчынскі погляд

# Аб прыгожых і непрыгожых...

**— Я — непрыгожая! Якая ж я непрыгожая! Я самая непрыгожая з усіх маіх сяброўак!**

**Знаёмая сітуацыя, ці не праўда? Бо як жа часта дзяўчаты 15-17 гадоў шэпчуць такое, гледзячы на сябе ў люстэрка. Прытым і вельмі нават прывабныя (з пункту гледжання маладых людзей процілеглага полу), вось толькі занадта патрабавальныя да сябе...**

Але я не пра іх. Я пра тых, хто і сапраўды, на жаль, не можа пахваліцца гэтай прыгажосцю.

Ім што рабіць?

Калі шчыра, то крытэрыі «прыгожы» і «непрыгожы» даволі ўмоўныя і не адзін раз змяняліся на працягу чалавечай гісторыі. У часы Рэнесансу ў Еўропе найбольш цаніліся пышныя жаночыя формы (успомнім карціны Рубенса), а ў Кітаі таго ж часу ідэалам жаночай прыгажосці былі маленькія ступні (чым яны меншыя, тым прыгажэйшай лічылася дзяўчына). Таму дзяўчынкам, пачынаючы з самага ранняга дзяцінства, спецыяльным чынам бінтавалі ногі, каб яны амаль не раслі, наўмысна робячы няшчасных калекамі на ўсё астатняе жыццё. А што зробіш — прыгажосць, як кажуць, патрабуе ахвяр.

Вядома ж, існуюць і ў нас свае «крытэрыі» прыгажосці, і ёсць жанчыны і дзяўчаты вельмі прыгожыя (так ад прыроды склалася, і іх заслугі ў гэтым няма аніякай), але такіх няшмат. Куды больш проста сімпатычных, прывабных... І многія з іх, хоць у падлеткавым узросце былі, кажучы словамі Андэрсана, «брыдкімі лебедзямі», менавіта самі зрабілі сябе прывабнымі і сімпатычнымі. Якім чынам?

Хочаце ведаць, што канкрэтна робіць дзяўчыну прывабнай у вачах мужчын?

Абаяльнасць і выхаванасць. Здараецца, што прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва з дзвюх дзяўчат аддаюць перавагу не эгаістычнай высакамернай прыгажуні, а куды менш прыгожай, але вельмі мілай і абаяльнай дзяўчыне, якая заўсёды паводзіць сябе ветліва і добразычліва.

Разумовыя здольнасці. Прыгажосць прыгажосцю, але калі твая каханая ў размове і двух слоў звязаць не можа, ды і з інтэлектам у яе не вельмі... то такое каханне вельмі хутка праходзіць. Выключэнні, праўда, бываюць, але найчасцей тады, калі і ў мужчыны інтэлект не вышэйшы за плінтус.

Голас. Так, менавіта голас! Ёсць такі жарт: «Ён быў закаханы ў яе да таго часу, пакуль яна не загаварыла». І сапраўды, мілагучны, прыемны голас — палова вашага поспеху, мілыя дамы! А над голасам, у адрозненне ад знешнасці, не так ужо цяжка і працаваць. Над вымаўленнем, над інтанацыямі, нават над паўзамі. І над смехам таксама, бо гэта вельмі важна! Каб не адпалохваць сваім смехам хлопцаў, а наадварот, зачароўваць і заварожваць...

Позірк. Жаночы позірк — гэта скрышальная зброя, супраць якой мужчынам вельмі цяжка выстаяць. Вось толькі не ўсе жанчыны, на жаль, умеюць правільна карыстацца гэтай зброяй. А шкада!

Ледзь не забыўся пра паставу і паходку, Памятаеце, у фільме «Службовы раман» сакратарка вучыла сваю начальніцу, як павінна хадзіць сапраўдная жанчына? Тут таксама можна дабіцца такога ўзроўню, што ўсе мужчыны будуць не толькі азірацца, а яшчэ і доўга глядзець услед. А калі асляпляльная прыгажуня клыпае, нібыта качка, на высачэзных абцасах... хто тады на яе азірнецца? Хіба што бабулька якая, ды і тое з жалем і спагадай...

Дарэчы, егіпецкая царыца Клеапатра, якая спачатку вялікаму Цэзару галаву закружыла, а потым яшчэ і яго палкаводцу Антонію, зусім не была прыгажуняй. Калі паглядзець на яе выявы, дык нос у Клеапатры вялізны, а вочы залішне пукатыя. І ў жыцці, пэўна ж, яна гэтак выглядала, бо не асмеліліся б егіпцяне чаканіць на манетах карыкатурны вобраз.

Але ўсе летапісцы ўзгадваюць, што была царыца вельмі і вельмі абаяльнай. Такой абаяльнай, што ўсе мужчыны без выключэння галовы гублялі пасля знаёмства з ёй...

А гэта нашмат важнейшае за нейкую там банальную прыгажосць. Паверце мужчыну...

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

■

■ Партрэт у інтэр'еры

# МУЖЧЫНА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ, або «Золатка» пасталела



**Ён кажа: «Падумаеш, трохі пасядзелі з сябрамі ў бары... Падумаеш, пакінуў там палову зарплаты! Будзь прасцейшай!» або «Алё, мілая, тут у нас з трубы вада льецца! Патэлефанаваць у ЖЭС? А можа, ты прыйдзеш дахаты і сама патэлефануеш?.. Ды і ўвогуле, там усяго толькі пара кропель...» ці «Зноўку ты на працы затрымліваешся! Я што, павінен сядзець галодны?!» Калі ваш мужчына кажа нешта падобнае — спачуваем: вы сутыкнуліся з інфантылам. Ён жа — «вечны юнак». Ён жа — уладальнік «сіндрому Пітэра Пэна». Як ні называй, сутнасць адна: «хлопчыку» ўжо даўно не 17, а паводзіць ён сябе як нясталае дзіця.**

Распазнаць інфантыльнага мужчыну можа быць не проста. Яны ўмеюць прыкідвацца, да таго ж часцяком бываюць нястрымнымі рамантыкамі — а гэта так падабаецца жанчынам! Асноўныя рысы, уласцівыя інфантыльным мужчынам, — эгаізм, самаўлюбёнасць, нежаданне несці адказнасць і прымаць рашэнні, сыход ад праблем, павышаная крыўдлівасць, забыўлівасць, лянота, моцная прывязанасць да бацькоў і г.д. Калі ў жыцці такога мужчыны накопліваецца шмат праблем, ён ад іх ратуецца пры дапамозе алкаголю або іншых залежнасцей, ці збягае ў кампанію сяброў. Такі чалавек усё жыццё гуляе ў цацкі — і яго чарговай цацкай можа стаць сям'я. Калі яна яму надакучыць, ён без шкадавання кіне яе і знойдзе сабе іншую забаўку. Інфантыльны мужчына падобны на немаўля: ён патрабуе да сябе ўвагі, любові, клопату, а ўсё астатняе яго не хвалюе.

Інфантыл нецярплівы, не здольны чакаць, бо жыве ў пастаянным «цяпер». Але гэта не тое «тут і цяпер», якое абапіраецца на адэкватнае ўспрыманне рэчаіснасці. Гэта «цяпер» дзіцяці, якое ўвогуле не думае пра будучыню. За яго думаюць іншыя. Інфантылы марнуюць час, як быццам яны бессмяротныя. Клапаціцца пра здароўе? Пра дабрабыт? А навошта? Наступствы ж будуць потым.

Жанчыны, будзьце пільныя! Інфантыльныя мужчыны могуць вельмі прыгожа разважаць пра высокія матэрыі, пра сімвалізм у паэзіі Блока і праблему забруджвання ракі Місісіпі, але ў адказ на спробу прыцягнуць да карыснай працы (прыбіць што-небудзь ці прыбраць) уцякаюць «ратаваць чалавецтва». Рэальнасць занадта брудная для непрызнанага генія. Так-так, генія! ПАТЭНЦЫЙНАГА. Хай ён і не Эйнштэйн, але ж МОГ бы ім быць. А паспрабуйце папрасіць такога мужчыну зрабіць што-небудзь — і пачуеце: «Ты занадта прыземленая!» Інфантыл жа «вышэйшы за штодзённасць» (на самай справе — проста баіцца рэальнасці з яе праблемамі і абмежаваннямі).

Чаму ён такі? Па-першае, нясталасць у паводзінах — вынік распешчанасці ў мінулым, калі дзіця расце «ў цяплічных умовах» і моцна прывязана да бацькоў, якія не хочуць, каб іх «золатка» сталела. Мама і тата настолькі песцяць яго, што малое пачынае лічыць гэта натуральным. У выніку ўжо дарослы чалавек жадае, каб яго шчаслівае дзяцінства доўжылася ўсё астатняе жыццё. Свой асаблівы ўклад у тое, каб хлопчык «закансерваваўся», можа ўнесці мама — энергічная жанчына, моцная асоба, якая нарадзіла дзіця «для сябе» і кантралюе яго ва ўсім. Ствараецца ўражанне, што інфантыл як быццам «жанаты» з маці. Ён залежыць ад яе настрою, выконвае яе капрызы, ставіць яе на нейкі п'едэстал... Ну і не забываем: які час, такія і героі. Культ імкнення да вечнай маладосці, а таксама культ спажывання — забаў, цацак, гаджэтаў і г.д. у нашым грамадстве ўвогуле правакуюць спыненне ў сталенні, захаванне дзіцячых рыс у паводзінах дарослага чалавека.

Ці можа інфантыльны мужчына стаць добрым мужам, бацькам, сябрам? Некаторыя псіхолагі даюць лаканічны адказ: НЕ. На першым месцы ў яго «Я любімы» і больш ніхто. Таму, калі вы сутыкнуліся з такім мужчынам, разварочвайцеся на 180 градусаў і бяжыце, не азіраючыся.

**«Чаму ён такі? Па-першае, нясталасць у паводзінах — вынік распешчанасці ў мінулым, калі дзіця расце «ў цяплічных умовах» і моцна прывязана да бацькоў, якія не хочуць, каб іх «золатка» сталела».**

Вырашылі застацца? Мужная жанчына! Выбірайце, які варыянт далейшых паводзін вам больш падабаецца:

**1. Цярпець.** Пазбаўцеся ад сябровак, якія спрабуюць раскрыць вам вочы на тое, што вас папросту выкарыстоўваюць са сваімі мэтамі. Надзяляйце інфантыльнага мужчыну неіснуючымі здольнасцямі. Купляйце сабе падарункі ад яго імя.

**2. Сілком перакласці цяжар адказнасці на мужчынскія плечы.** Для гэтага давядзецца захварэць, страціць працу, уліпнуць у непрыемнасці. Але калі гэты жорсткі і негуманны спосаб і спрацуе, то ненадоўга. Інфантыл будзе клапаціцца пра вас месяц, другі, трэці, пакуль не зразумее, што яму больш выгадна... памяняць жанчыну.

**3. Сур'ёзна пагаварыць.** Агучванне і абмеркаванне праблемы — пачатак шляху да яе вырашэння. Паспрабуйце дамовіцца і перавесці адносіны «маці-сын» у партнёрскія. Такія, калі абое клапоцяцца адно пра аднаго, калі яны разам пераадольваюць жыццёвыя цяжкасці.

***P. S.** На ўсялякі выпадак: калі ў вас ёсць сын, старайцеся не «прывязваць» яго да сябе, не песціць звыш меры. А інакш... можаце захаваць гэты артыкул для будучай нявесткі.*

**Міра КРАВЕЦ**

■

■ Люстэрка



# ЛЭДЗІ ДАСКАНАЛАСЦЬ

**Ідэальны дом, ідэальная праца, ідэальная знешнасць... Здавалася б, што дрэннага ў імкненні заўсёды быць на вышыні? Але наступствы перфекцыянізму, даведзенага да крайнасці, часам бываюць страшнымі: дэпрэсія, кар'ерны крах, схільнасць да суіцыду...**

**Раней гэта называлі «сіндром выдатніцы». Быць ва ўсім першай, ведаць усё лепш за астатніх — вось якасці, якія вызначаюць «выдатніц па жыцці» або, кажучы сучаснай мовай, перфекцыяністак.**

## ПРАЦА

Выдатныя адзнакі ў школе, інстытут з чырвоным дыпломам — прыклад для пераймання, ды і толькі. Цяпер бліскучая кар'ера — пытанне часу...

Перфекцыяністка не толькі ўзвальвае на сябе такі аб'ём работ, які і не сніўся простым смяротным, але і паспяхова спраўляецца з усімі пастаўленымі задачамі, чаго б гэта ні каштавала. Яна — ініцыятыўны і ва ўсіх адносінах надзейны работнік.

Праблема ў тым, што ў ахвяру прафесіі вельмі часта прыносіцца асабістае жыццё. У дадатак працоўны фанатызм — гэта палка з двума канцамі. Перфекцыяністы схільны «прывязваць» пачуццё ўласнай значнасці да службовай дзейнасці. Таму яны занадта шмат часу марнуюць на непатрэбныя дэталі, што замаруджвае тэмп працы і зніжае агульную прадукцыйнасць. А начальства ж не будзе разбірацца, чаму затрымліваецца выкананне даручэння — з прычыны непрафесіяналізму або гіперстараннасці. Акрамя таго, перфекцыяністы нярэдка ўтойваюць зробленыя імі памылкі, каб не сапсаваць уласны бездакорны імідж.

## ЗНЕШНАСЦЬ

Звычайны выпадак: дзяўчына з выдатнай фігурай унушыла сабе, што дзесьці ў яе на сантыметр таўсцей, чым трэба. Вердыкт — тэрмінова пазбавіцца ад лішняга. Дыета, галаданне, знясіленне — «сантыметра» ўжо і следу няма, а спыніцца яна не можа. Кожны праглынуты кавалачак успрымае як недаравальную слабасць, адступленне ад мэты, ёй трэба худзець яшчэ больш, наколькі вытрымае...

Ідэя самаўдасканалення становіцца дамінуючай, яна дае надзею, што калі моцна пастарацца, то заўтра станеш іншай, ідэальнай... Лякарства ад гэтай хваробы адно: перагледзець стаўленне да сябе і дазволіць сабе быць самой сабой.

## АСАБІСТАЕ ЖЫЦЦЁ

Калі мы цудоўныя, то і наш выбраннік павінен быць найлепшым. Здараецца, доўгае чаканне «ідэальнага чалавека» прыносіць добрыя вынікі. Але часцей заканчваецца расчараваннем і ярлыком «старой дзевы». Адзін кавалер мала зарабляе, другі крыху паўнаваты, трэці дурнаваты... Няўжо яны варты «самой Дасканаласці»?

## ДОМ

Ніхто не спрачаецца, што чысціня і парадак у доме — гэта цудоўна. Можна толькі захапляцца жанчынай, якая кожны дзень гатуе для сям'і абед з трох страў. Праўда, пры гэтым яна не дапускае мужа да стала, пакуль сурвэткі, сальніцы і сталовыя прыборы не раскладзены ідэальна. Калі ж абед не пахвалены — крыўда, душэўны разлад ад «уласнай недасканаласці», слёзы...

* * *

Перфекцыянізм недарэмна абвяшчаюць хваробай XXI стагоддзя. Безумоўна, пастаноўка высокіх мэт і здаровы максімалізм у іх дасягненні — пахвальныя. Але калі, нягледзячы на тытанічныя намаганні, вы катэгарычна незадаволены сабой, знерваваны праз тое, што «ўсё ідзе не так, як павінна», паталагічна залежыце ад чужой пахвалы — проста задумайцеся: ці шчаслівыя вы?

**Вера ФЕМІНА**

■

ЗАВЕРЕНО

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
_________________ С.А.Сушко
06.11.2015

БЕЛАРУСБАНК

УТВЕРЖДЕНО

Протокол заседания
Наблюдательного совета
Открытого акционерного
общества «Сберегательный банк
«Беларусбанк»
22.10.2015 №60

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ

## Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

## сто девяносто девятого – двести первого выпусков

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

Наименование эмитента на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);

наименование эмитента на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Банк);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес**

Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18;
телефон: (017) 309 04 33; телефон/факс: (017) 222 26 26;
e-mail: info@belarusbank.by.

**3. Покупатели облигаций на первичном рынке. Цена продажи облигаций**

Покупателями облигаций 199-го и/или 200-го и/или 201-го выпусков Банка (далее – Облигации) на первичном рынке могут быть физические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, приобретающие Облигации не в целях предпринимательской деятельности (далее – Физические лица).

Облигации продаются по номинальной стоимости облигации соответствующего выпуска, указанной в пункте 9 настоящего документа, за валюту номинала облигации.

**4. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

В оплату Облигаций Физические лица обязаны внести денежные средства в наличном или в безналичном порядке, которые будут поступать на соответствующие балансовые счета 4940, открытые в филиалах Банка, а также в центральном аппарате Банка.

**5. Наименование периодического печатного издания, определенного эмитентом для раскрытия информации**

Банк публикует в газете «Звязда» следующую информацию:

годовой отчет Банка – не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным. Годовой отчет Банка за 2014 год опубликован в газете «Звязда» 19.04.2015 № 74 (27932);

информацию о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка – в течение 2-х месяцев с момента принятия такого решения;

сведения, подлежащие опубликованию в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

о внесенных изменениях в Проспект эмиссии облигаций сто девяносто девятого – двести первого выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Проспект эмиссии) – в срок не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – Регистрирующий орган).

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием эмитента является депозитарий Банка (Банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь, номер государственной регистрации Банка – 56, код депозитария Банка – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, действующий на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089 сроком действия до 29.07.2022.

**7. Размер уставного фонда эмитента**

Размер уставного фонда Банка – 26 690 483 406 000 белорусских рублей.

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С копией зарегистрированного Проспекта эмиссии (с зарегистрированными изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно ознакомиться в местах продажи Облигаций, указанных в пункте 12 настоящего документа, ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и номинальная стоимость облигаций**

Банк выпускает процентные, неконвертируемые Облигации на предъявителя в документарной форме:

| № выпуска | Объем эмиссии | Количество Облигаций, штук | Серия, номера Облигаций | Номинальная стоимость Облигации |
|---|---|---|---|---|
| 199 | 40 000 000 (Сорок миллионов) долларов США | 40 000 | ЖЫ199, 000001 – 040000 | 1 000 (Одна тысяча) долларов США |
| 200 | 30 000 000 (Тридцать миллионов) долларов США | 10 000 | ЖЭ200, 000001 – 010000 | 3 000 (Три тысячи) долларов США |
| 201 | 30 000 000 (Тридцать миллионов) долларов США | 6 000 | ЖЮ201, 000001 – 006000 | 5 000 (Пять тысяч) долларов США |

**10. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» в пределах 80 процентов нормативного капитала Банка по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь.

**11. Период проведения открытой продажи облигаций**

Банк проводит открытую продажу Облигаций с 01.12.2015 по 30.11.2016, если иной срок до окончания открытой продажи Облигаций не будет определен Правлением и Наблюдательным советом Банка. Период проведения открытой продажи Облигаций может быть сокращен также в случае полной реализации всего объема эмиссии Облигаций.

**12. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение Облигаций осуществляется Банком путем их открытой продажи на внебиржевом рынке в следующих местах продажи:

- в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, филиалов, центров банковских услуг (указаны на официальном интернет-сайте Банка (http://belarusbank.by));

- в ОПЕРУ центрального аппарата Банка (Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18).

Время продажи Облигаций – в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

**13. Срок обращения облигаций**

Срок обращения Облигаций – 547 календарных дней (с 01.12.2015 по 31.05.2017). День начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

**14. Дата начала погашения облигаций**

Дата начала погашения Облигаций – 31.05.2017.

**15. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты**

По Облигациям установлен постоянный процентный доход (далее – доход) в виде фиксированного процента к номинальной стоимости облигации соответствующего выпуска в размере 5,5 (Пяти целых пяти десятых) процента годовых.

Выплата дохода производится периодически в соответствии с графиком начисления и выплаты дохода, указанным в пункте 17 настоящего документа, при условии предъявления Физическим лицом Облигации в Банк.

Выплату дохода осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка (независимо от места продажи Облигации) в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

Доход выплачивается в валюте номинала Облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь либо наличными денежными средствами.

При выплате дохода наличными денежными средствами Банк покупает у владельца Облигации часть дохода в размере менее минимального номинала банкноты в долларах США по обменному курсу покупки доллара США, установленному в обменном пункте (кассе), осуществляющем(ей) покупку, на момент совершения операции выплаты дохода.

В случае предъявления Облигации к досрочному погашению на условиях, изложенных в пункте 18 настоящего документа, сумма неполученного дохода рассчитывается по дату досрочного погашения Облигации включительно.

**16. Период начисления дохода по облигации**

Начисление дохода по Облигации осуществляется за период со дня, следующего за днем продажи Банком Облигации, по дату начала погашения Облигации, указанную в пункте 14 настоящего документа, включительно (за исключением случая предъявления Облигации к досрочному погашению). Со дня, следующего за днем истечения срока обращения Облигации, доход не начисляется.

Первый доход по Облигации начисляется со дня, следующего за днем ее продажи Банком, по дату начала выплаты дохода, указанную в пункте 17 настоящего документа, за период начисления дохода (далее – период), в котором была продана Облигация, включительно.

Последующие доходы, включая последний, начисляются со дня, следующего за датой начала выплаты дохода за предшествующий период, по дату начала выплаты дохода за данный период (по дату начала погашения Облигации) включительно.

**17. Даты выплаты периодически выплачиваемого дохода**

| ПЕРИОДЫ НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА | | | |
|---|---|---|---|
| номер периода | начало периода | конец периода, дата начала выплаты дохода | продолжительность периода, календарных дней |
| 1 | 02.12.2015 | 31.05.2016 | 182 |
| 2 | 01.06.2016 | 30.11.2016 | 183 |
| 3 | 01.12.2016 | 31.05.2017 | 182 |
| ИТОГО | | | 547 |

**18. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Облигация 199-го и/или 200-го и/или 201-го выпусков может быть предъявлена к досрочному погашению, но не ранее рабочего дня, следующего за днем истечения двенадцати месяцев со дня ее фактической продажи Банком. При этом предъявителю облигации соответствующего выпуска выплачивается ее номинальная стоимость и неполученный доход по дату досрочного погашения облигации включительно (в валюте номинала облигации).

При досрочном погашении Облигации выплата части номинала Облигации и/или части дохода не производится.

**19. Порядок погашения облигаций**

Погашение Облигаций осуществляется Банком начиная с 31.05.2017 в отношении лиц, предъявивших эти Облигации к погашению, независимо от сроков обращения собственника или иного законного владельца Облигации.

Погашение Облигаций осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка (независимо от места продажи Банком Облигации).

При погашении Облигации предъявителю Облигации – Физическому лицу возмещается номинальная стоимость облигации соответствующего выпуска, а также уплачиваются все неполученные доходы в валюте номинала Облигации наличными денежными средствами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**20. Порядок обращения облигаций**

Обращение Облигаций осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

